№№41–42
(2769–2770)

20 сакавіка 2008 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная воля».
Кошт — свабодны.

Народная Воля

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...

Якуб КОЛАС

Да ўвагі!
Хто не зрабіў перадаплату і хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

Шаноўныя чытачы!
Па пытаннях распаўсюджвання газеты жыхары сталіцы могуць звяртацца па тэлефоне 328-63-93, усе астатнія — па тэлефоне 328-68-71.

ЗВАРОТ

Саюза беларускіх пісьменнікаў да грамадзян Беларусі

Шаноўныя суайчыннікі!

У духоўнай спадчыне чалавецтва адным з самых важных багацццяў з'яўляецца родная мова. Без яе немагчыма стварыць нацыянальную культуру. А існаванне народа без сваёй культуры пазбаўленае высокага сэнсу.

Вялікая ўвага мовам надаецца сёння ва ўсім свеце. Нездарма 2008 год абвешчаны Арганізацыяй Аб'яднаных Нацый годам моў, а на нядаўнім саміце кіраўнікоў краін, якія ўваходзяць у СНД, прынята рашэнне аб'явіць яго годам літаратуры і мастацкага перакладу.

Беларуская моўная сітуацыя — складаная, але яе можна і неабходна выправіць. Прыклад у падобным падаюць нашыя суседзі-ўкраінцы, якія вяртаюць родную мову ва ўсе сферы грамадскага жыцця: ад дзіцячых садкоў, школ, ВНУ і да найвышэйшых дзяржаўных кабінетаў.

Адраджэнне беларускай мовы — тонкая, далікатная праблема, якая яшчэ не ўсімі грамадзянамі ўспрымаецца належным чынам. Але яна тычыцца кожнага з нас. У цяперашнім беларускім грамадстве выяўляецца станоўчая тэндэнцыя цікавасці да роднай мовы. Дзякуючы патрыятычна настроенаму студэнцтву і некаторым службовым асобам яна гучыць падчас правядзення масавых мерапрыемстваў, у канцэртных праграмах, у грамадскім транспарце. Аднак дзеля паўнакроўнага існавання і развіцця мовы падобнага катастрафічна недастаткова.

Давайце разам мацаваць і пашыраць павагу і любоў да беларускай мовы як гаранта нашай дзяржаўнай незалежнасці і нацыянальнай самабытнасці!

Гэтай высакароднай справе дапаможа правядзенне 23 сакавіка 2008 года — напярэдадні святкавання 90-годдзя Беларускай Народнай Рэспублікі — Першай агульнанацыянальнай беларускай дыктоўкі. Заклікаем і сардэчна запрашаем вас, дарагія суайчыннікі, прыняць у ёй актыўны ўдзел.

Сакратарыят Грамадскага аб'яднання "Саюз беларускіх пісьменнікаў".

Дарэчы, сябры СПБ прапанавалі для дыктоўкі два тэксты — урывак з артыкула Янкі Купалы "Незалежнасць" альбо з "Патрыятычнага малітвенніка" Вацлава Ластоўскага.

Янка КУПАЛА,
з артыкула «Незалежнасць» (1919 г.):

"Беларусь, як і кожная іншая дзяржава, мае права стаць вольнай дзяржавай паміж сваімі суседзямі. Толькі поўная дзяржаўная незалежнасць можа даць і праўдзівую свабоду, і багатае існаванне, і добрую славу нашаму народу.

Край наш сам па сабе багаты, толькі чужыя гаспадары яго знішчылі. Зямлі маем шмат, лесу яшчэ болей; маем вялікія рэкі, азёры, чыгункі, багатыя месцы, а ў іх фабрыкі, заводы, ды і шмат іншага дабра. Да таго ж, на лік мы народ вялікі.

Дык чаму ж нам, браты беларусы, не дамагацца сваёй дзяржаўнай незалежнасці?

Мы павінны яе дамагацца і мірна, і са зброяй у руках, бо жыццё не чакае і ворагі нашы не дрэмлюць".

Вацлаў ЛАСТОЎСКІ,
з «Патрыятычнага малітвенніка» (1926 г.):

"Напачатку была свабода, і свабода была ў руках народа, і народ быў свабодным. Свабода была напачатку ў руках народа. Праз народ усё сталася, і без яго нічога не сталася. Народ быў незалежны, а свабода і незалежнасць былі радасцю людзей. І памяць аб страчанай свабодзе свеціць у паняволенні нашым, і няволя не пагасіла ў нас жадання свабоды...

У імя беларускага народа, за яго славу, шчасце і свабоду. Станься.

Ойча наш, каторы ёсць у небе, вярні нам волю і валадарства на зямлі нашай, даўно і цяжка пазрэмленай. Хай не адымаюць чужынцы хлеб штодзённы ад вуснаў нашых дзяцей. Адпусці грахі нашым продкам, каторыя не ўмелі абараніць сваёй і свайго патомства свабоды. Не ўводзь нас у спакусу адлегласці тым, што паярэмілі нас, але збаў нас ад чужацкай апекі.

Святая зямелька, Маці наша! Табе ў ахвяру складаем мы ўсе сілы свае цяпер і ў момант смерці нашай.

Веру ў Бацькаўшчыну нашу Беларусь і ў Народ наш, сына яе адзінага, каторы на свет прыйшоў свабодным.

Слава Крывічанскаму народу ва ўсіх яго гістарычных імёнах — Крывіі, Літвы, Беларусі, — як была спрадвеку, так цяпер і на векі вечныя.

Святая свабода, выражаная дзяржаўнай самаістасцю, ты наша пацяшыцелька і надзея, адзіная мэта і праўда наша, прыйдзі, усяліся ў нас і ачысці нас ад усякага рабства і збаў нас ад няволі".

Кошт газу ўжо сёлета можа вырасці

Кіраўнік "Газпрома" Аляксей Мілер заявіў, што кошт на газ для Еўропы можа дасягнуць мяжы ў 400 долараў за 1 тысячу кубаметраў. Павышэнне кошту блакітнага паліва, відавочна, чакае і краіны СНД, канцэрн мае намер неадкладна пачаць з імі перамовы ў сувязі з павышэннем коштаў на азіяцкі газ з 2009 года.

Як вядома, Казахстан, Туркменістан і Узбекістан заявілі аб пераходзе на еўрапейскія кошты на газ. Іх рашэнне, падкрэсліў Мілер, змушае кампанію ўжо неўзабаве прыступіць да сур'ёзнага дыялогу з кліентамі з СНД.

Паводле ацэнкі некаторых расійскіх экспертаў, сярэдні кошт газу для спажыўцоў з СНД (Беларусь, Малдова, Арменія, Грузія) на 2008 год складзе 162 долары за 1 тыс. куб. м.

Міністр фінансаў у цяжкім стане

У інтэрнеце з'явілася інфармацыя, што 59-гадовы міністр фінансаў Мікалай Корбут шпіталізаваны з дыягназам "інсульт".

— Ніякіх каментараў на гэты конт, — такі адказ мы пачулі ад дарадцы Мікалая Корбута. — Адзінае, што магу пацвердзіць: Мікалай Пятровіч зараз на бальнічным. Уся астатняя інфармацыя можа быць толькі ад лечачага ўрача і родных.

Як нам стала вядома, Мікалай Корбут сапраўды перанёс інсульт і знаходзіцца ў цяжкім стане. Ён шпіталізаваны ў Рэспубліканскую бальніцу кіраўніцтва справамі прэзідэнта, у аддзяленне рэанімацыі. На момант здачы нумара ў друк было вядома, што стан здароўя міністра ацэньваўся як цяжкі.

Мікалай Корбут на дзяржаўнай службе ўжо болей за 30 гадоў. З ліпеня 1997 года ён ўзначальвае Міністэрства фінансаў. Для сучаснай Беларусі гэта рэкорд: ніхто яшчэ не ўтрымліваўся на міністэрскай пасадзе даўжэй за Корбута — больш за 10 год. Аднак апошнім часам чыноўнік не ўтойваў, што ў яго ёсць праблемы са здароўем.

Вольга ГРЫНЯВІЦКАЯ.

ОФИЦИОЗ

Петр МИКЛАШЕВИЧ:
«Мы сегодня не вправе быть созерцателями нарушений конституционной законности»

Новый председатель Конституционного суда Беларуси Петр Миклашевич, отвечая на вопросы "Народной воли", признался, что пока привыкает к новому коллективу.

— Петр Петрович, как вы относитесь к инициативе, чтобы граждане, если нарушены их конституционные права, обращались напрямую в Конституционный суд?

— Право на конституционную жалобу есть в большинстве европейских государств и стран СНГ. У нас это право на уровне Конституции не закреплено. Чтобы его закрепить, необходимо менять Конституцию. Но мы это не инициируем. Мы сегодня рассматриваем вопрос о компетенции в пределах норм Конституции. Сегодня белорусские граждане могут обращаться к нам опосредованно — через тех субъектов, которые правомочны обращаться в Конституционный суд.

— Вы признались, что назначение главой Конституционного суда для вас самого было несколько неожиданным. Нет ли у вас ностальгии по прежней работе? Может, есть какие-то дела, которые вы не успели закончить в генпрокуратуре?

— Переход на новую должность я воспринял нормально, поскольку у меня более 20 лет работы в должности судьи общих судов на различных должностях, судебная работа мне близка, как мы выражаемся, и по букве, и по духу. Перед Конституционным судом и мной как руководителем стоит задача обеспечить конституционную законность в стране. Это более высокий уровень законности, чем тот, который утверждает прокуратура своей деятельностью. Прокуратура наблюдает, чтобы точно и неукоснительно все соблюдали законы, а Конституционный суд смотрит, чтобы эти законы соответствовали Конституции.

Конечно, к каждому коллективу, к конкретным людям надо привыкать. И чисто по-человечески сейчас у меня идет переходный период адаптации к новому коллективу. Хотя большинство сотрудников я знаю по прежней работе, меня хорошо приняли, поэтому надеюсь, что наша работа будет эффективной.

СЛЫШАЛИ?

До 25 апреля Петр Миклашевич должен внести конкретные предложения по расширению полномочий Конституционного суда.

Не исключено, что в ближайшем будущем Конституционный суд будет ставить вопрос об отстранении от должности высокопоставленных чиновников и лишении полномочий депутатов.

— Да, некоторые предложения о расширении полномочий Конституционного суда совершенно новые, а новое всегда поначалу воспринимается неоднозначно, — *говорит Петр Миклашевич.* — Я проанализировал полномочия Конституционных судов Европы. Например, конституционные суды Франции, Германии, Австрии и некоторых других стран рассматривают дела об уголовном преследовании должностных лиц, судей, решают вопросы, связанные с лишением полномочий депутатов. Поэтому и мы ставим вопрос, чтобы в рамках Конституции повысить определенные властные полномочия Конституционного суда.

Сегодня стоит вопрос о выработке механизма реализации этих полномочий. Мы хотим, чтобы Конституционный суд не просто констатировал нарушение норм Конституции. Ведь согласно Основному закону должностные лица обязаны принимать меры по созданию надлежащих условий для реализации прав и свобод граждан и, соответственно, принимать меры по защите законных интересов, прав и свобод граждан. Действительно, если Конституционный суд при разрешении конкретных дел устанавливает, что определенные лица не выполняют требования Конституции, нужно ставить вопрос об отстранении их от должности. Потому что мы сегодня не вправе быть созерцателями нарушений конституционной законности...

КСТАТИ

Зарплата судей Конституционного суда — более трех миллионов рублей

Если в ближайшее время полномочия Конституционного суда будут значительно расширены, то повысится ли зарплата судей? И сколько сегодня зарабатывают судьи Конституционного суда?

На эти вопросы "Народная воля" попросила ответить заместителя председателя Конституционного суда **Александра МАРЫСКИНА**.

— Заработная плата у судей Конституционного суда на уровне министра, — *ответил Александр Владимирович.* — Поскольку Конституционный суд является одним из высших судебных органов, то наша заработная плата приравнивается к заработной плате министра. Если вас очень интересует, сколько мы конкретно получаем, то вместе с налогами немного больше трех миллионов рублей. И я не скажу, что это самая высокая зарплата в СНГ.

Что касается повышения заработной платы, то она повышается в общем порядке — когда повышается заработная плата работникам госаппарата, то, соответственно, и работникам Конституционного суда.

Марина КОКТЫШ.

У Польшчы сярэдні заробак дасягнуў 1350 долараў

У лютым сярэдні паляк зарабляў 3033 злотыя. Гэта на 11% больш, чым нават у снежні мінулага года.

Прыход да ўлады ў Польшчы ўрада Грамадзянскай платформы і Сялянскай партыі, складзенага з лібералаў і аграрнікаў, абярнуўся для палякаў ростам заробкаў.

Для параўнання: сярэдні заробак у Беларусі ў студзені склаў 340 долараў.

Получили Гран-при

ОАО "Белшина" получила Гран-при 11-й Международной специализированной выставки "Шины, резинотехнические изделия и каучуки-2008" в Москве.

Такой награды удостоились за выпуск широкого ассортимента высококачественных пневматических шин для стран СНГ. Продукция "Белшины" получила признание на Международном конкурсе "Лучшая автомобильная шина на дорогах России-2008", итоги которого были подведены во время выставки.

OSCE

Organization for Security and Co-operation in Europe
Office in Minsk

OSCE OFFICE IN MINSK ANNOUNCES A VACANCY FOR SENIOR PROGRAMME AND ADMINISTRATIVE ASSISTANT

The OSCE Office in Minsk is looking for a candidate to fill the position of the Programme and Administrative Assistant.

The suitable candidate for the post should have:

— completed secondary education with minimum of 6 years of office work experience, preferably with an international organisation with a multi-cultural environment;
— some additional training in administrative, secretarial and financial management principles;
— supervisory and office management experience;
— very good managerial and organizational skills;
— thorough knowledge of general administrative procedures and processes;
— excellent written and oral knowledge of English, Belarusian and Russian;
— excellent translation and interpretation skills;
— good drafting, reporting and communication skills;
— ability to organize work and information flows and to resolve matters of protocol and operational problems;
— knowledge of a wide range of computer applications, i.e. word processing, spreadsheets, PowerPoint; Oracle-based financial systems desirable;
— ability to work independently, exercise good judgment, set priorities and meet deadlines;
— ability to work as a team member, to establish and maintain effective working relationships with people of different national and cultural backgrounds, whilst remaining impartial and objective;
— knowledge of the political situation and the OSCE is desirable.

All applications should be submitted by fax 272-34-98 or e-mail office-by@osce.org and include a cover letter, full resume (maximum 2 pages) and 2 references with full name, address and telephone numbers. **Deadline for application is 24 March 2008.** Online applications at **http://www.osce.org/employment/13108.html** are strongly encouraged.

Please note that the vacancy is open for competition only amongst nationals of Belarus. The OSCE is committed to achieving a better balance of women and men within the Organization. Female candidates are particularly encouraged to apply. Please note that in the event of invitation for interview, the OSCE is unable to reimburse costs incurred. Only short-listed candidates will be contacted.

Больше погибает трезвых, чем пьяных?

По данным Департамента государственной инспекции труда за 2007 год (по состоянию на 09.01.2008 г.), в результате несчастных случаев на производстве погиб 231 работник , что на 41 человека (15,1 процента) меньше, чем за аналогичный период прошлого года. Число погибших в дорожно-транспортных происшествиях в 2007 году в сравнении с 2006 годом увеличилось на 3,7 процента.

Тяжело травмированы 755 работников, что на 25 человек (3,2 процента) меньше, чем за прошлый год.

Произошло 52 групповых несчастных случая, в результате которых пострадали 149 работников, из них -- 36 погибли и 46 тяжело травмированы.

Согласно материалам расследований, в состоянии алкогольного опьянения находились 32,1 процента потерпевших, получивших травмы со смертельным исходом, и 10,1 процента потерпевших, получивших травмы с тяжелым исходом.

Виктор ПИСАРИК, советник председателя Комитета госконтроля:
«Я воздерживаюсь от каких-либо комментариев»

Не так давно некоторые интернет-издания распространили новость о том, что правоохранительные органы якобы задержали и поместили под стражу советника председателя Комитета госконтроля Виктора Писарика.

По информации отдельных интернет-ресурсов, Писарик достаточно давно работает в системе Комитета госконтроля, ранее служил в Департаменте финансовых расследований.

Официальной информации о том, что в отношении Писарика возбудили уголовное дело, не было.

Однако интернет-газета "Ежедневник" в конце февраля написала: "Генеральной прокуратурой из-под стражи был освобожден советник председателя КГК Виктор Писарик, который тут же приступил к своей работе. Как удалось выяснить "Е", за него вступился сам президент. Главе государства доложили, что прокуратура расценила как превышение служебных полномочий тот факт, что советник слишком активно трудился на своем посту и занимался в том числе деятельностью, которая не подпадала под определенный ему круг должностных обязанностей".

Любопытно, что в генеральной прокуратуре вообще не подтверждают факт задержания Виктора Писарика!

"У нас такой информации нет", — сказали "Народной воле" в пресс-службе генпрокуратуры.

"Народная воля" задала вопрос о задержании Виктора Писарика начальнику управления по борьбе с коррупцией и организованной преступностью генпрокуратуры Александру Ракевичу.

"Не комментируется", — коротко ответил Александр Иванович.

Сейчас Виктор Писарик попрежнему работает в Комитете госконтроля. Однако он не желает ни подтверждать, ни опровергать вышеизложенную информацию.

"Я воздерживаюсь от каких-либо комментариев", — очень вежливо, но твердо сказал Виктор Викторович.

Марина КОКТЫШ.

Народная Воля http://www.nv-online.info
20 САКАВІКА 2008 г.

АДУСЮЛЬ

У Мінску пройдзе саміт СНД

Саміт Садружнасці Незалежных Дзяржаў пройдзе ў Мінску 21 сакавіка. На разгляд Савета кіраўнікоў урадаў краін СНД плануецца вынесці каля 20 пытанняў.

Галоўным з іх стане інфармацыя аб падрыхтоўцы праекта Стратэгіі эканамічнага развіцця Садружнасці, аб прапановах па ўзгадненні транспартнай палітыкі, аб комплексе захадаў па павышэнні ўзроўню харчовай бяспекі.

Акрамя таго, плануецца абмеркаваць праекты дакументаў, якія датычаць памежнага супрацоўніцтва, міграцыі, святкавання 9 траўня, узаемнага прызнання правоў на льготны праезд для інвалідаў і ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, сумеснай кінавытворчасці.

Праца над Кодэксам аб адукацыі «замарожана»

Прыпынена праца над праектам "Кодэкса аб адукацыі" Беларусі.

Паводле слоў Уладзіміра Здановіча, старшыні камісіі па адукацыі Палаты прадстаўнікоў, прычынай гэтага кроку стала рэкамендацыя Адміністрацыі прэзідэнта. Ён патлумачыў, што рашэнне аб "замарожванні" працы над Кодэксам прынята ў сувязі з тым, што "да гэтага часу не вызначана, якой мусіць быць у Беларусі сярэдняя школа — 12- альбо 11-гадовай".

Наркаатака на калонію "Віцьба-3"

Амфетамін, схаваны ў аднаразовых пакеціках з распушчальнай кавай, знайшлі кантралёры па спатканнях у бандэролі, якую перадалі сваякі аднаго са зняволеных у папраўчую калонію "Віцьба-3".

Па словах ахоўнікаў калоніі, гэта не самая арыгінальная схованка для наркотыкаў. Марыхуану, метадон, амфетамін ды іншыя наркотыкі ахоўнікі знаходзяць у сале, кетчупе, кансервах і нават мыйных сродках, што перадаюць з волі.

Нагадаем, што менавіта ў гэтай калоніі адбывае пакаранне Аляксандр Казулін.

Жыльцоў з вуліцы Карла Маркса высяляць не будуць

Пасля пратэстных акцый грамадскасці, шэрагу публікацый у незалежных сродках масавай інфармацыі, у тым ліку "Народнай волі", Мінгарвыканкам прыняў рашэнне не адсяляць жыльцоў дамоў па вуліцы Карла Маркса і захаваць функцыянальнае прызначэнне гэтых будынкаў.

НЕЗЛОБИВЫЕ ЗАМЕТКИ

Семен БУКЧИН

Лорд Белл как новый благодетель Беларуси

Нет ли у вас, читатель, желания улучшить собственный имидж?

Ну там... перед женой, друзьями, сослуживцами... В общем, начать как-то лучше выглядеть в их глазах.

Вы, конечно, подумаете, что в этом деле самое важное — критически осмыслить собственное поведение и начать както самосовершенствоваться.

Но ведь это самый простой и, поверьте, не очень надежный способ. И, главное, не современный. Тут нужно идти другим путем. Вам, конечно же, знакомо это слово — "имиджмейкер". Короче, приглашаете специалиста, и он за бабки — это уж как договоритесь — лепит из вас другого человека.

В общем, с преобразованием отдельной личности уже накоплен определенный опыт. А вот как быть со страной, с отдельно взятым государством? Оказывается, и здесь есть специалисты. Представляете: в некой стране все прекрасно, демократия цветет пышным цветом, благосостояние граждан замечательное, а за рубежом недруги бурчат про "последнего диктатора Европы", про "тоталитаризм", нарушения прав человека, отсутствие свободы слова, низкие доходы граждан и ужасное здравоохранение. Ну и что тут делать? Своя идеологическая обслуга с задачей не справляется, поскольку ей веры ни в стране, ни на Западе нет. Но есть, есть выход!

Имя ему — **лорд Тимоти Белл**. Да, да, да, член Палаты лордов Великобритании занимается тем, что нам нужно. Он возглавляет компанию "Чайм Коммюникейшн", которая занимается не просто имиджем отдельных государств, а, как говорит сам сэр Белл, улучшением их репутации. Кстати, у сэра Белла есть серьезный опыт. Он "улучшал" Маргарет Тэтчер, вплоть до рекомендаций по части нарядов. Его советами пользовались такие разнообразные корпорации, как "Уолт Дисней", "МакДональдс", "Ролекс", "Роллс Ройс". Говорят, Борис Абрамович Березовский, который и сам великий мастер по части всяческого камуфляжа, не пренебрег советами сэра Белла. Ну а что касается стран, то здесь можно отметить особый успех сэра Белла в деле создания нового имиджа Саудовской Аравии. Каких только ужасов не рассказывали про эту страну как якобы рассадник мирового терроризма! А вот сэр Белл сумел раскрутить дело так, что теперь о ней говорят как об оазисе демократии и гуманизма.

И вот такой замечательный человек побывал недавно у нас в Беларуси. По сообщениям прессы, долго разговаривал с нашим Главным Начальником, который с присущей ему откровенностью и прямотой сказал: *"Думаю, вам будет приятно работать в нашей стране, с той властью, которая так гонима. Мы должны вас убедить в том, что Беларусь является европейской страной... И мы готовы предоставить вам любую информацию, показать любое интересующее вас место"*.

Более того, Главный Начальник признал: *"Мир развивается таким образом, что без вашего ремесла невозможно представить в мире ту или иную страну"*. В общем, как ни крути, выходит, что имидж Беларуси надо поправлять, поскольку он неважнецкий. Ну а что же лорд Белл? Он серьезный человек. Оказывается, уже успел в интернете просмотреть информацию о Беларуси и нашел там *"много двуличных и лицемерных комментариев"*. Представляете, человек ни дня не был в Беларуси, а только заглянул в интернет и сразу ухватил суть проблемы. С которой, конечно же, нужно бороться, тем более что Беларусь, как выразился сэр Белл, *"играет своеобразную роль ворот в геополитическом и геостратегическом плане"*.

В общем, берется сэр Белл подремонтировать, освежить эти самые ворота. Тут, конечно, важны детали, особенности процесса. Английский лорд — человек деловой и не скрывает своей методологии. В интервью журналу "Профиль" он заявил: *"Я начинаю с обзора ситуации: где находимся, чего хотим достичь. Это сразу определяет, какую репутацию страна хочет заработать в другой стране или в регионе, в стране с демократическим правлением или с диктатурой..."*

Замечательная откровенность, не правда ли? Впрочем, чего удивляться? Рынок есть рынок. Если есть спрос на репутацию государства, следовательно, формируются и деловые предложения. Ну и цены, соответственно. Поскольку репутация страны — это тот же товар. О ценах, впрочем, пока ничего не известно. Но догадываться можно. Все-таки речь идет не о картошке на рынке, а о репутации целого государства. Это, безусловно, стоит. Да и вообще, прилично ли торговаться, когда речь идет о репутации твоего отечества? Тут, как поется, мы за ценой не постоим... Налогоплательщик должен это понимать, затягивать ремешок на штанах и настраиваться на патриотическую волну. Ведь ясно, что такие дела не за медный грош делаются.

Что же касается других деталей... К сожалению, в прессу они не проникли. А любопытно было бы послушать этот разговор Главного Начальника с великим марафетчиком. Судя по интервью журналу "Профиль", спектр предложений сэра Белла невероятно широк. Какую хотите репутацию? В какой стране? С демократией или с диктатурой? Пожалуйста! Все по желанию заказчика!

Мы-то, наивные люди, думали до сих пор, что имидж страны делается самой её жизнью, её гражданами. Оказывается, мы ошибались, ни жизнь страны, ни положение и мнение ее граждан об этой самой жизни здесь ни при чем. Все будет так, как захочет, как сделает великий маг и кудесник сэр Белл. Диктатуру он может превратить в демократию. А может и наоборот. Платите — и все будет о'кей!

Но раз так, то поторговаться, конечно, стоит. Нет, не из-за цены. Народ, безусловно, заплатит за хорошую репутацию своего государства. Но вот обговорить особенности приобретаемого продукта, а точнее, того, что конкретно все-таки нужно будет сделать для улучшения репутации страны, это дело первостепенное. Трудно судить, дошло ли до такой конкретики в состоявшейся встрече нашего Главного Начальника и лорда Белла. Поэтому совершенно не настаивая на том, что именно так оно и было, попробуем представить себе возможные нюансы этой беседы.

Лорд Белл: — Надеюсь, вы понимаете, сэр, что улучшение репутации вашей страны потребует определенных усилий с вашей стороны и конкретных шагов. Например, неплохо освободить из тюрьмы Козулина. Со свободой слова тоже можно кое-что пересмотреть. Почему бы "Народную волю" не разрешить печатать в одной из государственных типографий и вернуть ее в подписные каталоги и в киоски "Белсоюзпечати"?

Главный начальник: — Это, безусловно, можно сделать. Но



понимаете, господин Белл, в чем дело: это может быть кое-кем воспринято как проявление слабости нашего государства. А этого очень не хотелось бы.

Лорд Белл: — Тогда давайте уточним, какой собственно продукт вы хотите приобрести. Вам нужна репутация государства полной, в европейском смысле демократии? Или вы хотели бы приобрести репутацию государства со своеобразно, с учетом национальных и исторических традиций понимаемой демократии?

Главный начальник: — Вот-вот! С учетом... Что-то в этом роде!

Лорд Белл: — В нашем каталоге есть такая услуга. Она называется — "Ограниченная демократия, или Демократия с необходимыми элементами авторитаризма".

Главный начальник: — Пожалуй, это то, что нам нужно.

Лорд Белл: — Должен предупредить вас, сэр, это одна из наиболее сложных и — что самое печальное — самых дорогих наших услуг. Понимаете, Запад еще не созрел до понимания таких ценностей, как "ограниченная демократия", тем более "демократия с необходимыми элементами авторитаризма". Поэтому здесь потребуются особенно большие затраты.

Главный начальник: — Я прошу вас, господин Белл, быть совершенно спокойным на этот счет. Я ведь говорил вам уже, что наш народ пойдет на любые жертвы ради доброго имиджа своей родной страны.

Лорд Белл: — Да, белорусы — истинные патриоты своей страны! Это очень приятно.

Визит лорда Белла в Минск пришелся как раз в разгар более чем широко известной истории, когда пытавшиеся остановить пьяного водителя инспекторы ГАИ выстроили "живой щит" из частных автомашин. И хотя время сэра Белла было ограничено, все-таки нужно было упросить его прийти в МВД и дать нужный совет. Надо полагать, история с "живым щитом" приобрела бы в его трактовке образ героического подвига сотрудников МВД, о котором еще будут слагать народные песни и предания.

А пока народ возмущается, в интернете кипят страсти. Один шибко образованный гражданин даже соотечественника лорда Белла философа Джона Локка вспомнил: *"Если государь нарушает закон, то народ получает право на восстание"*. Вообще любопытно, что именно эта история так всколыхнула людей. Обыватель, который считал, что у него не может быть проблем во взаимоотношениях с государством, если он не ходит на митинги, не связан с оппозиционными партиями и негосударственными профсоюзами и вообще ведет себя смирно, вдруг понял, что, несмотря на "тихость и смирность", есть серьезнейшая проблема — его безопасность вовсе не гарантирована. Что в некий момент его, едущего со своей женой и ребенком на своем авто со своей дачи, государство просто может использовать как бревно, перегородив дорогу мчащемуся алкоголику или наркоману. Что его жизнь ничего не стоит в глазах государства. Обыватель в растерянности закричал, завопил. А ему бы самое время вспомнить, где был он, когда выгоняли с работы забастовавших машинистов метро, где был он, когда исключали из вузов имеющих свое мнение студентов, когда выгоняли из театра талантливого актера, где был он, когда власть закрывала независимые газеты или вынуждала их эмигрировать в Вильнюс, Смоленск?

Моя хата с краю... Вот и кушайте, господа соотечественники! Вы кричите сегодня о правах, о попранной законности. Чаще читайте Щедрина, у которого один держиморда разъясняет населению: *"Не право вам дано, а разрешение"*. Можно предположить, что если лорд Белл удачно справится с миссией по улучшению репутации Беларуси за рубежом, то ему можно будет доверить и работу внутри страны. И он сумеет, вслед за щедринским героем, убедить граждан Беларуси, что пользоваться разрешением куда выгоднее, нежели правом. И тогда *"живой щит"* действительно покажется благом...

ЧУЛІ?

Ірыну Казуліну намінавалі на прэмію Роберта Кенэдзі

Беларускія праваабаронцы выступілі з ініцыятывай намінаваць Ірыну Казуліну на прэмію Роберта Кенэдзі.

Гэтай прэміяй фонд імя Роберта Кенэдзі ўшаноўвае праваабаронцаў, якія зрабілі значны ўнёсак у барацьбу за правы чалавека.

Прэмія ўручаецца штогод. Летась ёю ўшанавалі актывіста з суданскай правінцыі Дарфур Махамада Ахмада Абдалаха. Раней прэмію атрымоўвалі грамадскія дзеячы з Гаіці, Бразіліі, ЗША, Польшчы і іншых краін.

"Ірына Казуліна ахвяравала сваім жыццём дзеля дэмакратыі і вартая гэтай адзнакі", — паведаміла Радыё Свабода праваабаронца Людміла Гразнова. Паводле яе слоў, ініцыятыву падтрымалі таксама праваабаронцы Раіса Міхайлоўская, Эніра Браніцкая, Алег Волчак, Юрый Чавусаў, Гары Паганяйла, Алена Танкачова, Ігар Рынкевіч.

ЭКСПЕРТЫЗА

Беларусь у «чорным спісе»

Дзярждэпартамент ЗША абнародаваў штогадовы даклад аб выкананні правоў чалавека ў розных краінах. Беларусь узгадваецца сярод дзесяці дзяржаў, дзе самым сур'ёзным чынам парушаюцца правы чалавека.

Эксперты амерыканскага знешнепалітычнага ведамства ўказваюць, што ў 2007 годзе беларускі ўрад працягваў ігнараваць рэкамендацыі асноўных міжнародных арганізацый палепшыць выбарчы працэс і выконваць правы чалавека.

У Беларусі абмяжоўвалася свабода прэсы, слова, сходаў, асацыяцый і рэлігіі. Затрыманні і арышты дэмакратычных актывістаў за ўдзел у дэманстрацыях або за крытыку ўладаў характарызуюцца амерыканскімі экспертамі як "палітычна матываваныя".

У дакладзе паведамляецца аб недастатковай незалежнасці судовай улады і "прадвызначанасці" рашэнняў суда ў Беларусі. Некаторыя працэсы праходзілі за зачыненымі дзвярыма, без прысутнасці незалежных назіральнікаў. Эксперты таксама ўказваюць на канфіскацыю друкаваных матэрыялаў у актывістаў грамадзянскай супольнасці; націск і штрафы незалежным СМІ і палітычным партыям.

Дзярждэпартамент ЗША ўказвае на затрыманне лідэраў рэлігійных груп і закрыццё цэркваў, этнічную, моўную і сексуальную дыскрымінацыю, націск на незалежныя прафсаюзы і іх членаў, а таксама пераслед і закрыццё НДА.

Разам з тым канстатуецца прагрэс Беларусі ў барацьбе з гандлем людзьмі.

У дакуменце нагадваецца, што Генеральная Асамблея ААН другі год запар прымае рэзалюцыю, дзе асуджае парушэнне правоў чалавека ў Беларусі і заклікае беларускія ўлады неадкладна і безумоўна вызваліць усіх палітзняволеных.

У дзесятцы краін, што ўзначальваюць "чорны спіс" Дзярждэпа ЗША апрача Беларусі — Зімбабве, Іран, КНДР, Куба, М'янма, Сірыя, Судан, Узбекістан і Эрытрэя. Расія ў дакуменце зазнае крытыку разам з Кітаем, Пакістанам і яшчэ некалькімі дзяржавамі. У Грузіі, як паведамляюць спецыялісты Дзярждэпартамента, "урон быў нанесены свабодзе слова, прэсы, сходаў, прымянялася сіла для разгону дэманстрацый".

Марына РАХЛЕЙ.

ПАЛІТЫКА

«Малады фронт» не разумее Калякіна

Сойм незарэгістраванай арганізацыі "Малады фронт" усё-ткі адбыўся. Старшынёй арганізацыі абраны былы палітвязень Зміцер Дашкевіч, ягонымі намеснікамі — Артур Фінькевіч, Іван Шыла і Наста Палажанка.

У сувязі з тым, што беларускія ўлады адмаўляюцца скасаваць артыкул Крымінальнага кодэкса, у якім прадугледжана адказнасць за дзеянні ад імя незарэгістраванай арганізацыі, маладафронтаўцы будуць зноў і зноў спрабаваць зарэгістравацца. У бліжэйшы час будуць накіраваны заяўкі на прадастаўленне памяшкання для рэгістрацыйнага з'езда ў Міністэрства юстыцыі і Мінскі гарвыканкам.

Таксама маладзёжныя актывісты выступілі з ініцыятывай стварэння правацэнтрысцкага блоку дэмакратычных арганізацый, мэтай якога будзе з'яўляцца яднанне на падмурку хрысціянскіх прынцыпаў, ідэалаў незалежнасці, дэмакратыі і еўрапейскай інтэграцыі. *"З'яўленне гэтай ініцыятывы выклікана прычынамі поўнай ідэйнай і структурнай раз'яднанасці суб'ектаў АДС, якія не маюць ані адзінай стратэгіі, ані адзінага лідэра,* — гаворыцца ў паведамленні прэс-службы. — *Апроч таго, суб'екты АДС усё болей падначальваюцца лідэру камуністаў, які адкрыта пазіцыяніруе сябе як кандыдат на будучыя прэзідэнцкія выбары. Таму "Малады фронт" заяўляе аб выхадзе з АДС і адклікае сваіх прадстаўнікоў з Палітычнага савета АДС"*.

Алег СНОЎ.

ШЧЫРА

Дзякуй, курапацкія рупліўцы!

Падымайся з нізін, сакаліна сям'я,
Над крыжамі бацькоў, над нягодамі.
Занімай, Беларусь, маладая мая
Свой пачэсны пасад між народамі!

Гэты заклік нашага песняра прарока Янкі Купалы вельмі не да спадобы тым, каму муляюць вочы крыжы Курапат, што ўвекавечваюць памяць нашых продкаў, якія толькі таго і хацелі, каб вольна жыць.

Даведаўся пра чарговы вандалізм у святой мясціне і абураны да самага донца душы. Крыжы над брацкімі магіламі з'яўляюцца напамінам аб злачынствах сталінскага рэжыму, які знішчаў лепшых людзей, каб разам з імі вынішчыць людскую мару аб незалежнасці і годнасці нашай Беларусі.

Як жа трэба ненавідзець наш народ, нашу гісторыю, нашу краіну, каб так здзекавацца з памяці аб нявінна расстраляных, не паважаць вякамі ўшанаваныя хрысціянскія сімвалы і агульначалавечыя каштоўнасці...

Такое маглі ўчыніць толькі нелюдзі.

Нашы ўлады трацяць вялікія грошы на так званую "лінію Сталіна". А ў Курапатах на арганізацыю хоць бы аднаго міліцэйскага паста сродкаў (хутчэй жадання) чамусьці не хапае... Але нельга знішчыць тое, што жыве ў народным сэрцы. Нізкі паклон і шчыры дзякуй самаахвярным рупліўцам Курапат — сябрам Кансерватыўна-Хрысціянскай партыі — БНФ і ўсім добрым людзям, што берагуць святыя магілы.

Мікалай КУКСО,
жыхар г.п.Івянец
Валожынскага раёна.

На былой сядзібе Караткевіча хочуць пабудаваць прыбіральню

Найлепшую ў горадзе і нават у вобласці прыбіральню вырашылі пабудаваць да аднаго з галоўных афіцыйных святаў краіны "Дажынкі" ўлады Оршы.

І гэта было б вельмі добра, бо якраз падобных збудаванняў бракуе ў кожным з гарадоў Беларусі, але пляцоўка, якая была абрана, выклікала ў жыхароў горада абурэнне.

Прыбіральню збіраюцца ўзвесці на месцы былой сядзібы сям'і Караткевічаў, у скверы побач з помнікам знакамітаму пісьменніку. Улічваючы памеры будыніны, вядомы помнік проста згубіцца на ейным фоне. Ды і наўпрост — ідэя спалучэння на невялікім пятачку твора мастацтва, прысвечанага аднаму з выбітнейшых беларусаў, ды прыбіральні нічога акрамя абурэння вызваць не можа.

БУДЗЬЦЕ ЗДАРОВЫ!

Ніл Гілевіч перанёс мікраінсульт

Урачы ацэньваюць стан яго здароўя як здавальняючы

Народны паэт Беларусі, паважаны аўтар "Народнай волі" Ніл Гілевіч лёг на планавае лячэнне ў Рэспубліканскую бальніцу кіраваўніцтва справамі прэзідэнта на пачатку сакавіка. Ніла Сымонавіча непакоіў боль у суставах. У нядзелю 13 сакавіка ён быў пераведзены ў аддзяленне нейрахірургіі мозга 5-й клінічнай бальніцы Мінска з падазрэннем на інсульт.

— Дзякуй Богу дыягназ "інсульт" не пацвердзіўся, — расказаў "Народнай волі" брат паэта Мікола Гіль. — Урачы сыходзяцца на тым, што гэта быў мікраінсульт, які Ніл Сымонавіч перанёс на нагах. Хвароба ніякім чынам не адбілася на ягонай гаворцы, Ніл Сымонавіч сам сябе абслугоўвае, самастойна рухаецца. Кожны дзень яму ставяць кропельніцы, і, што галоўнае — абышліся без аператыўнага ўмяшальніцтва. Адзінае, канешне, што да гэтага мікраінсульта Ніл Сымонавіч выглядаў больш бадзёра.

Па словах Міколы Гіля, у бліжэйшы час Народнага паэта Беларусі чакае грунтоўнае абследаванне, па выніках якога ўрачы вырашаць, выпісваць яго са стацыянара альбо яшчэ нейкі час утрымліваць у аддзяленні.

— Ён ляжыць у двухмесным палаце, — кажа Мікола Гіль. — Лечачы ўрач брата — вядомы ў краіне нейрахірург Арнольд Смеяновіч. Але ж калі Ніла Сымонавіча і выпішуць, то дадому ён адразу не паедзе, вернецца ў лечкамісію. Ад інсульта яго выратавалі, але лячэнне трэба працягваць. Да таго ж суставы за гэты час яшчэ больш разбалеліся. Калені ныюць, кісці рук апухлі. Так што ў бальніцы Нілу Сымонавічу прыйдзецца правесці нейкі час.

"Народная воля" жадае паважанаму Нілу Сымонавічу хуткага выздараўлення і віншуе са святам — 90-годдзем Беларускай Народнай Рэспублікі.

Вольга ГРЫНЯВІЦКАЯ.

Не хочаш быць заўтра ў турме — змагайся!

Ужо больш за тры месяцы ўлады пераследуюць прадпрымальнікаў за грахі, якіх яны не рабілі. Так лічаць удзельнікі акцыі пратэсту індывідуальных прадпрымальнікаў супраць прэзідэнцкага ўказа №760, якая адбылася 10 студзеня.

17 сакавіка ва ўправе Партыі БНФ Каардынацыйная рада прадпрымальнікаў правяла прэс-канферэнцыю, на якой 14 чалавек абвясцілі аб тым, што звяртаюцца з заявамі да генеральнага пракурора Беларусі Рыгора Васілевіча. Яны перакананы, што міліцыя беспадстаўна абвінавачвае іх у парушэнні грамадскага парадку. Больш за тое, на іх думку, у ходзе акцыі закон парушалі не яе ўдзельнікі, а супрацоўнікі праваахоўных структур. Старшыня Каардынацыйнай рады Міхась СТРАЛЬЦОЎ падкрэсліў: *"Наша справа груба сфальсіфікавана. Была мірная акцыя, не было масавых беспарадкаў. Мы дзейнічалі на падставе Канстытуцыі. Такім чынам, усе спробы зрабіць з мірнай, абсалютна негвалтоўнай акцыі пратэсту крымінальную справу з'яўляюцца прыцягнутымі за вушы"*.

Прадстаўнік створанага праваабарончага руху "Наша Беларусь" Ігар ЛЕДНІК перакананы, што гаворка павінна ісці менавіта пра грубае парушэнне ўладамі канстытуцыйных правоў грамадзян: *"Мы ведаем, што за судамі над моладдзю прадпрымальнікаў чакаюць новыя рэпрэсіі. Уладам развязваюцца рукі ў правядзенні ўсялякіх рэйдаў і штрафных санкцый супраць нас"*.

Сябра Каардынацыйнай рады прадпрымальнікаў Аляксандр МАКАЕЎ засяродзіў увагу на тым, што ўлады прыцягнулі да адказнасці ажно 14 чалавек. Прадпрымальнікаў яшчэ ніколі не пераследавалі ў такой вялікай колькасці. *"За кратамі Парсюкевіч і Кім. І невядома, хто апынецца заўтра ў турме. І я лічу, што сённяшняя сустрэча не павінна стаць апошняй. Я заклікаю асабіста Шумчанку, Гарбачова, іншых лідэраў прадпрымальніцкага руху дапамагаць вам. Такая каардынацыя павінна спрацаваць на абарону ўсіх нас"*.

Падчас прэс-канферэнцыі ў вочы кінулася адсутнасць шэрагу вядомых дзеячаў прадпрымальніцкага руху краіны, а таксама палітыкаў, якія звычайна пазіцыяніруюць сябе ў якасці самаахвярных змагароў за правы прадпрымальнікаў. Быццам справа тычылася толькі тых чатырнаццаці чалавек, якія зрабіліся ахвярамі пераследу з боку ўладаў.

Адзін з лідэраў беларускага прадпрымальніцтва Віктар Крываль тлумачыць гэта тым, што "свядомасць некаторых асоб, якія апынуліся на чале прадпрымальніцкага руху, нагадвае свядомасць вясельных генералаў". Там, дзе патрэбна браць ініцыятыву на сябе, можа, нават лезці на ражон, яны спрабуюць адмаўчацца, перачакаць...

Вячаслаў ОРГІШ.

Народная Воля http://www.nv-online.info
20 САКАВІКА 2008 г.

Гэта — найвялікшая падзея ў нашай гісторыі XX стагоддзя

90 год незалежнай Беларускай Народнай Рэспублікі

25 сакавіка 1918 года была абвешчана незалежнасць Беларускай Народнай Рэспублікі, новай дзяржавы ў Еўропе і свеце. Падзея гэтая істотна паўплывала на далейшы лёс беларускага народа, на стварэнне беларускай дзяржаўнасці. 25 сакавіка сталася нацыянальным святам беларусаў на Радзіме і ў замежжы.

Ідэя незалежнасці

Наш народ мае досвед сваёй дзяржаўнасці на працягу стагоддзяў. Гэта запісана ў прэамбуле дзеючай Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. Традыцыі нашай дзяржаўнасці сягаюць да даўніх часоў, існавання першых дзяржаўных утварэнняў на нашых землях — Полацкага, Смаленскага, Тураўскага княстваў. Уздым нашай культуры ў XVI ст. цесна звязаны з умацаваннем Вялікага княства Літоўскага, у якім дзяржаўнай мовай была, па-сучаснаму кажучы, беларуская Усе пласты насельніцтва ведалі яе, на большасці тэрыторый панавала беларуская культура, а беларуская мова ўжывалася нават у дыпламатыі, асабліва з усходнім суседам — Вялікім княствам Маскоўскім.

Традыцыі беларускай дзяржаўнасці захаваліся да канца XVIII стагоддзя — да ліквідацыі суседнімі манархіямі Расіяй, Прусіяй і Аўстрыяй Рэчы Паспалітай і яе самастойнай часткі Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага. Але, нягледзячы на падзелы Рэчы Паспалітай і далучэнне нашага краю да Расійскай імперыі, ідэя дзяржаўнасці захавалася, праявай чаго былі праграмы паўстанцаў 1794, 1831 і 1863 гадоў. У апошнім паўстанні Вікенці Канстанцін Каліноўскі ў "Мужыцкай праўдзе" прапанаваў ідэю аднаўлення самастойнай Беларускай дзяржавы.

У сувязі з уздымам агульнарасійскага дэмакратычнага і ліберальнага рухаў на пачатку XX ст. першая беларуская палітычная партыя — Беларуская Сацыялістычная Грамада паставіла пытанне палітычнай аўтаноміі для Беларусі ў складзе Расійскай дэмакратычнай рэспублікі. Але ўжо ў 1907 годзе адзін з дзеячаў нацыянальнага руху Вітольд Жукоўскі з Вільні выступіў з праграмай барацьбы за незалежную Беларусь у саюзе з Літвой і Каронай (Польшчай).

У "нашаніўскі" перыяд Адраджэння сярод беларускіх дзеячаў панавалі яшчэ аўтанамісцкія погляды на будучыню Беларусі. У гэты час Іван Луцкевіч прапагандаваў ідэю незалежнасці Беларуска-Украінскай федэрацыі (па ўзоры былога Вялікага княства Літоўскага). Такім чынам, і ў нашаніўскім асяроддзі ўзнавіліся незалежніцкія погляды.

У снежні 1915 года ў Вільні, акупаванай нямецкімі войскамі падчас Першай сусветнай вайны, была створана Канфедэрацыя Вялікага княства Літоўскага — палітычная арганізацыя, якая дамагалася ўтварэння незалежнай Беларуска-Літоўскай дзяржавы паводле федэратыўнага прынцыпу (для абедзвюх яе частак — беларускай і літоўскай). Ініцыятарамі яе былі браты Луцкевічы, браты Станкевічы, паэтэса Канстанцыя Буйло ды іншыя. Антон Луцкевіч прапанаваў ідэю Злучаных Штатаў ад Балтыйскага да Чорнага мора... Меркавалася, што ў гэтую канфедэрацыю ўвойдуць незалежныя Беларусь, Літва, Латвія і Украіна. Група "Сувязь Незалежнасці і Непадзельнасці Беларусі" ў Вільні на чале з Вацлавам Ластоўскім, у адрозненне ад Канфедэрацыі, выступала за поўную дзяржаўную незалежнасць і тэрытарыяльную цэласнасць Беларусі ў яе этнаграфічных межах. Адначасова прапаноўвалася ідэя "Беларуска-Украінскай федэратыўнай дзяржавы". Такім чынам, у Вільні, тагачасным беларускім палітычным асяродку, была ўзноўлена ідэя незалежнасці Беларусі.

Другім палітычным асяродкам тагачаснага беларускага нацыянальнага руху пасля Лютаўскай рэвалюцыі ў Расіі стаўся Менск, дзе кіруючую ролю спачатку адыгрываў Беларускі Нацыянальны Камітэт, выбраны на з'ездзе беларускіх арганізацый. На чале Камітэта стаяў Раман Скірмунт, былы дэпутат Дзяржаўнай думы Расіі і буйны землеўладальнік у Пінскім павеце. Менскія дзеячы ліберальнага накірунку мелі прарасійскую арыентацыю. У ліпені 1917 года ў Менску на II з'ездзе беларускіх арганізацый і партый замест БНК была абрана Цэнтральная Рада беларускіх арганізацый, якая прадстаўляла левыя сілы беларускага нацыянальнага руху, у тым ліку сацыялістычныя. У кастрычніку 1917 г. цэнтральная Рада была пашырана за кошт арганізацый беларусаў-вайскоўцаў, што служылі ў расійскім войску, арганізацый беларусаў-бежанцаў, культурна-асветніцкіх арганізацый. Цэнтральная Рада была пераўтворана ў адзін палітычны цэнтр пад назвай Вялікая беларуская рада. Менскія дзеячы ва ўмовах рэвалюцыі ў Расіі працягвалі заставацца на аўтанамісцкіх пазіцыях, выказваючыся за абвяшчэнне Беларускай Дэмакратычнай Рэспублікі са сваім войскам, але ў складзе Расійскай федэрацыі народаў.

Усебеларускі з'езд

Бальшавіцкі пераварот у Петраградзе і саветызацыя Беларусі не пакідалі ўжо надзеі і на аўтаномны варыянт. Пра гэта сведчаць адносіны бальшавіцкай улады да Усебеларускага з'езда, скліканага ў Менску ў снежні 1917 года.

З'езд быў скліканы Вялікай беларускай радай і Беларускім абласным камітэтам пры выканкаме Усерасійскага савета сялянскіх дэпутатаў, які знаходзіўся ў Петраградзе. Выбары на адзіны ў той час у Расіі нацыянальны з'езд былі праведзены дэмакратычным шляхам. Каля двух трацін дэлегатаў былі выбраны цывільнымі арганізацыямі, больш за адну траціну прадстаўлялі беларусы-вайскоўцы. Пераважная большасць дэлегатаў былі прыхільнікамі сацыялістычнай ідэі. З'езд абмеркаваў найважнейшыя праблемы жыцця беларускага грамадства і выказаўся за пэўныя сацыялістычныя зменненні. Вострая барацьба разгарнулася за вырашэнне дзяржаўнага пытання. Прыхільнікі Вялікай беларускай рады выступалі за абвяшчэнне Беларусі раўнапраўнай рэспублікай у складзе Расійскай федэрацыі народаў, а прыхільнікі Беларускага абласнога камітэта — супраць утварэння асобнай рэспублікі. Урэшце, быў прыняты кампрамісны варыянт: "з'езд стварае са свайго складу краёвы орган улады ў асобе Усебеларускага савета сялянскіх, салдацкіх і рабочых дэпутатаў, які часова становіцца на чале кіравання краем, уступаючы ў справавыя дачыненні з цэнтральнай уладай..." Такая пастанова пад авацыі залы была прынята ўсімі дэлегатамі.

Аднак кіраўнік бальшавіцкай адміністрацыі ў Беларусі Аляксандр Мяснікоў (Мяснікян) пільна сачыў за ходам з'езда. Мясцовае бальшавіцкае кіраўніцтва бачыла, што можа страціць сваю ўладу, і прыняло рашэнне з'езд разагнаць. У ноч з 17 на 18 (30 на 31 ст.ст.) снежня 1917 года, калі дэлегаты з'езда пачалі абмяркоўваць пытанне аб абвяшчэнні Беларускай рэспублікі, салдаты, падпарадкаваныя савету народных камісараў Заходняй вобласці, разагналі з'езд і арыштавалі яго прэзідыум. Да разгону дэлегаты паспелі прыняць рэзалюцыю аб увядзенні на беларускай зямлі рэспубліканскага ладу і выбраць са свайго асяроддзя легітымны орган краёвай улады — Усебеларускі савет (Раду) сялянскіх, салдацкіх і рабочых дэпутатаў для кіравання краем да выбараў Беларускага ўстаноўчага сходу. Была таксама прынята рэзалюцыя пратэсту супраць гвалтоўных дзеянняў кіраўніцтва Заходняй вобласці і аб непрызнанні яго ўлады. Але з'езд быў разагнаны, хаця большасць дэлегатаў яшчэ не парывала з Расіяй і не адвяргала савецкую ўладу.

На ўзброеную барацьбу нацыянальныя менскія дзеячы не пайшлі. І ўсё ж ідэя Беларускай Народнай Рэспублікі была імі дэкларавана. Рада з'езда на чале з Язэпам Лёсікам перайшла на нелегальнае становішча. Ужо 18 снежня ацалелыя ад арыштаў дэлегаты патаемна сабраліся ў чыгуначным дэпо пад аховай рабочай дружыны і пацвердзілі паўнамоцтвы Рады з'езда як выканаўчага органа разагнанага з'езда. 21 снежня 1917 года (3 студзеня 1918 г.) Рада са свайго складу вылучыла больш сціслы і аператыўны орган — выканаўчы (спаўняючы) камітэт Рады Усебеларускага з'езда ў складзе 17 чалавек на чале з Язэпам Варонкам. Камітэту было даручана заняцца беларусізацыяй саветаў, а ў адпаведны момант узяць уладу ў Беларусі ў свае рукі.

Падрыхтоўка да абвяшчэння БНР

Мірныя перамовы ў Берасці, якія вялі дэлегацыя савецкай Расіі з дэлегатамі Германіі і яе саюзнікаў, зайшлі ў тупік. Па-першае, па прапанове Леніна савецкая дэлегацыя зацягвала перамовы, бо бальшавіцкая ўлада была пераканана, што ў Германіі кожны момант можа выбухнуць пралетарская рэвалюцыя, як у Расіі. Трэба толькі яе дачакацца. Па-другое, бальшавікі, якія на фронце ўжо практычна не мелі дастатковых сіл, каб утрымліваць лінію фронту (з 2 мільёнаў расійскіх салдатаў на Заходнім фронце засталося толькі 70 тысяч, астатнія паўцякалі дадому, каб падзяліць нацыяналізаваныя памешчыцкія землі), рашуча патрабавалі ад нямецкага боку адвесці свае войскі *з расійскай тэрыторыі* (г.зн. з Латвіі, Літвы і Беларусі). Яны абвясцілі "мір без анексій і кантрыбуцый". Калі германскія генералы і дыпламаты зразумелі тактыку бальшавікоў, то абвясцілі, што перамовы і перамір'е спыняюць, а 18 лютага пачынаюць ваенныя дзеянні.

Як толькі стала вядома пра нямецкую заяву, астатнія салдаты пакінулі пазіцыі і ўцякалі, — хто ў цягніках, хто ў фурманках. І бальшавіцкае кіраўніцтва ў Менску таксама ўцякло ў Смаленск 19 лютага 1918 года. У Расіі, дарэчы, быў уведзены дэкрэтам саўнаркама новы стыль: пасля 31 студзеня 1918 г. наступіла... 14 лютага... Таму люты быў няпоўным месяцам. Камісары забралі з сабой усю грашовую наяўнасць у Дзяржаўным банку, абрабаваўшы і ўлады, і насельніцтва.

Выканаўчы камітэт Рады выйшаў з падполля, з турмы былі вызвалены кіраўнікі Цэнтральнай беларускай вайсковай рады. Да канца дня 19 лютага беларускія вайскоўцы кантралявалі ўладу ў горадзе. Камендантам Менска быў прызначаны Канстанцін Езавітаў. Выступілі і польскія вайскоўцы з падпольнай вайсковай арганізацыі. Да бою не дайшло. Тэрыторыя Менска была падзелена на дзве зоны. Цэнтр быў пад уладаю беларускай камендатуры.

21 ЛЮТАГА 1918 г. У МЕНСКУ — БЕЛАРУСКІМ БЫЛА АБВЕШЧАНА 1-я УСТАЎНАЯ ГРАМАТА да народаў Беларусі. У ёй гаварылася: *"Выканаўчы Камітэт Рады першага Усебеларускага з'езда, папоўнены прадстаўнікамі рэвалюцыйнай дэмакратыі нацыянальных меншасцяў, здзяйсняючы мэты з'езда, абвяшчае сябе часовай уладай на Беларусі для кіравання краем і склікання як можна хутчэй Усебеларускага Устаноўчага Сойму на аснове агульнага права для ўсялякага дарослага, не лічачыся з нацыянальнасцю, вызнаннем і родам.*

Часовую народную ўладу краю, якая ставіць сабе мэтай абарону і зацвярджанне заваяванняў рэвалюцыі, будзе здзяйсняць створаны намі Народны сакратарыят Беларусі, які ад гэтага дня пачаў выконваць свае абавязкі".

НАРОДНЫ САКРАТАРЫЯТ БЕЛАРУСІ — ГЭТА ПЕРШЫ БЕЛАРУСКІ ЎРАД, вылучаны са складу Выканаўчага камітэта Рады. На чале ўрада стаяў **Язэп ВАРОНКА**. Ён жа народны сакратар міжнародных спраў. У склад Народнага сакратарыята ўвайшлі **Леанард ЗАЯЦ** — дзяржаўны сакратар і скарбнік, **Аркадзь СМОЛІЧ** — народны сакратар народнай асветы, **Іван СЕРАДА** — народны сакратар народнай гаспадаркі, **Тамаш ГРЫБ** — народны сакратар земляробства, **Палута БАДУНОВА** — народны сакратар (сацыяльнай) апекі, **Пётр КРЭЧЭЎСКІ** — народны сакратар дзяржаўнага кантролю, таварыш (намеснік) старшыні Народнага Сакратарыята **Канстанцін ЕЗАВІТАЎ** ды іншыя.

Паводле ўмоў Берасцейскага мірнага дагавору ад 3 сакавіка 1918 года Германія, якая акупавала амаль усю тэрыторыю Беларусі, акрамя Віцебска, усходніх раёнаў Магілёўскай губерні і тэрыторыі Смаленскай губерні, лічыла гэтую тэрыторыю расійскай. Яе нямецкія войскі займалі часова да выплаты савецкай Расіі вялікай кантрыбуцыі ў 6 мільярдаў залатых марак. А паколькі гэта расійская тэрыторыя, то прызнаваць іншыя ўрады, акрамя расійскага, Германія не збіралася. Толькі тэрыторыя большай часткі Гродзенскай губерні (Горадня, Ваўкавыск, Ліда), ад якой Расія адмовілася, гэтай умове не падлягала.

21 лютага 1918 г. у Менск прыбыла першая нямецкая воінская адзінка, 25 лютага Менск быў заняты нямецкімі войскамі. Усталяваўшы сваю ўладу ў Менску, нямецкія вайскоўцы сарвалі з будынка Народнага Сакратарыята бел-чырвона-белы беларускі сцяг, забралі касу і адабралі будынак. Беларускія вайсковыя часткі па загадзе нямецкай улады былі раззброены.

Тым не менш немцы не надта ўмешваліся ва ўнутраныя справы, асабліва ў галіне сацыяльнай дапамогі, эканомікі, асветы, культуры, фактычна пакінуўшы гэта беларускаму ўраду.

Выканкам Рады і Народны Сакратарыят працягвалі сваю дзейнасць. **9 САКАВІКА 1918 ГОДА ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ РАДЫ ВЫДАЎ ДРУГУЮ УСТАЎНУЮ ГРАМАТУ ДА НАРОДАЎ БЕЛАРУСІ, У ЯКОЙ АБВЯШЧАЎ УТВАРЭННЕ БЕЛАРУСКАЙ НАРОДНАЙ РЭСПУБЛІКІ (БНР) У МЕЖАХ ЭТНАГРАФІЧНАЙ БЕЛАРУСІ. ГЭТАЯ ГРАМАТА АБВЯШЧАЛА ДЭМАКРАТЫЧНЫ ЛАД У НАШАЙ КРАІНЕ.** У Другой Устаўнай грамаце было заяўлена:

"Асноўныя законы Беларускай Народнай Рэспублікі зацвердзіць Устаноўчы Сойм Беларусі, скліканы на асновах агульнага, роўнага, патаемнага і прапарцыянальнага выбарчага права, не зважаючы на род, народнасць і рэлігію.

Да часу, пакуль збярэцца Устаноўчы Сойм Беларусі, заканадаўчая ўлада ў Беларускай Народнай Рэспубліцы належыць Радзе Усебеларускага з'езда, дапоўненай прадстаўнікамі нацыянальных меншасцяў Беларусі".

Выканаўчая ўлада перадавалася Народнаму Сакратарыяту Беларусі. Грамадзянам Беларускай Народнай Рэспублікі гарантаваліся дэмакратычныя правы: вольнасць слова, друку, сходаў, забастовак, хаўрусаў, вольнасць сумлення, незачэпнасць асобы і памяшкання. Пацвярджалася права народаў на Беларусі на нацыянальна-персанальную аўтаномію і роўнае права ўсіх моваў народаў Беларусі. Абвяшчаўся 8-гадзінны рабочы дзень.

Разам з тым дэклараваўся і сацыялістычны прынцып: "У рубяжах Беларускай Народнай Рэспублікі права прыватнай уласнасці на зямлю касуецца. **ЗЯМЛЯ ПЕРАДАЕЦЦА БЕЗ ВЫКУПУ ТЫМ, ШТО САМІ НА ЁЙ ПРАЦУЮЦЬ**".

Але аб самастойнасці Беларусі ў Другой Устаўной грамаце не згадана. Беларускія менскія дзеячы ў большасці па-ранейшаму стаялі на аўтанамісцкіх пазіцыях.

Абвяшчэнне незалежнасці

У гэты ж час беларускія палітычныя дзеячы ў Вільні дзейнічалі ў незалежніцкім накірунку. У студзені 1918 г. яны правялі канферэнцыю, якая абрала Віленскую Беларускую Раду. З абвяшчэннем 16 лютага 1918 г. незалежнасці Летувы Віленская Беларуская Рада (ВБР) заняла цалкам незалежніцкія пазіцыі. 18 лютага яна прыняла пастанову, паводле якой сувязь паміж Расіяй і Беларуссю абвяшчалася парваной, а 19 лютага была абвешчана незалежнасць Беларусі.

Далей беларускія палітычныя сілы Вільні і Менска аб'ядналіся. Шэсць сяброў Віленскай беларускай рады былі кааптаваны ў Раду БНР, у тым ліку **браты А. і І.ЛУЦКЕВІЧЫ, В.ЛАСТОЎСКІ** і іншыя запрошаны ў Менск. Гэта ўзмацніла незалежніцкую групоўку ў складзе Рады.

23 сакавіка 1918 г. гэтая дэлегацыя сяброў Рады БНР прыехала з Вільні ў Менск. Адразу ж Антон Луцкевіч прапанаваў Народнаму сакратарыяту абвясціць незалежнасць Беларусі. Прапанова была разгледжана на пасяджэнні фракцыі Беларускай Сацыялістычнай Грамады ў Радзе БНР і пасля спрэчак прынятая.

24 сакавіка а 8-й гадзіне вечара пачалося пленарнае пасяджэнне Рады БНР. Пасля доўгіх і бурных спрэчак, якія цягнуліся ўсю ноч, а **8-Й ГАДЗІНЕ РАНІЦЫ 25 САКАВІКА 1918 ГОДА БОЛЬШАСЦЮ ГАЛАСОЎ СЯБРОЎ РАДЫ БНР БЫЛА ПРЫНЯТА ТРЭЦЯЯ УСТАЎНАЯ ГРАМАТА РАДЫ БЕЛАРУСКАЙ НАРОДНАЙ РЭСПУБЛІКІ**. Ужо днём, пасля рэдагавання гэтага акта, быў паартыкульна прыняты канчатковы, цяпер ужо гістарычны тэкст Граматы. Каля трэцяй гадзіны дня Трэцяя Устаўная Грамата была прынята.

За прыняцце дакумента прагаласавалі прадстаўнікі беларускіх партый. Супраць прыняцця Граматы (а значыць, і незалежнасці Беларусі) —прадстаўнікі земстваў і гарадскіх думаў (з рускамоўнай інтэлігенцыі) і яўрэйскай сацыялістычнай партыі "Бунд". Пасля прыняцця Трэцяй Устаўнай Граматы яны выйшлі са складу Рады БНР. Сябры Аб'яднанай яўрэйскай сацыялістычнай партыі і расійскія эсэры ад галасавання ўхіліліся. **ТРЭЦЯЯ УСТАЎНАЯ ГРАМАТА ЎРАЧЫСТА АБВЯШЧАЛА**:

"Цяпер мы, Рада Беларускай Народнай Рэспублікі, скідаем з роднага краю апошняе ярмо дзяржаўнай залежнасці, якое гвалтам накінулі расійскія цары на наш вольны і незалежны край.

Ад гэтага часу Беларуская Народная Рэспубліка абвяшчаецца Незалежнай і Вольнай дзяржавай. Самі народы Беларусі, у асобе свайго Устаноўчага Сойму, пастановяць аб будучых дзяржаўных звязах Беларусі. На моцы гэтага трацяць сілу ўсе старыя дзяржаўныя звязы, якія далі магчымасць чужому ўраду падпісаць і за Беларусь трактат у Берасці, што забівае насмерць беларускі народ, дзелячы зямлю яго на часткі".

У Грамаце была акрэслена і тэрыторыя БНР (што шмат у чым паўтарылі і бальшавікі пры стварэнні БССР 1 студзеня 1919 года): *"Беларуская Народная Рэспубліка павінна абняць усе землі, дзе жыве і мае лічебную перавагу беларускі народ, а ласьне: Магілёўшчыну, беларускія часці Меншчыны, Гродзеншчыны (з Гроднай, Беластокам і інш.), Віленшчыны, Віцебшчыны, Смаленшчыны, Чарнігаўшчыны і сумежныя часці суседніх губерняў, заселеных беларусамі".*

Значэнне акта 25 сакавіка

Акт 25 сакавіка 1918 г. меў вельмі вялікае значэнне. Ён перакрэсліў праекты ўтварэння федэрацыі Беларусі з Расіяй альбо з Літвой ці Польшчай. Пачалася барацьба за ажыццяўленне абвешчанай незалежнасці. Умовы былі для Беларусі неспрыяльнымі. Большая частка яе была акупавана Германіяй, а ўсходнія тэрыторыі былі ў складзе Расійскай Савецкай Рэспублікі. Урады Германіі, Аўстра-Венгрыі і Расіі не прызналі незалежнасць БНР.

Аднак ураду БНР удалося дамагчыся прызнання незалежнай БНР адзінаццаццю дзяржавамі. Нават у Маскве было адчынена генеральнае консульства БНР, у Берліне — консульства. У лістападзе 1918 года СТАРШЫНЯ РАДЫ НАРОДНЫХ МІНІСТРАЎ БНР А.ЛУЦКЕВІЧ вёў перамовы ў Маскве з савецкім урадам (па запрашэнні), але перамовы не ўдаліся.

Урад БНР дзейнічаў у галіне дзяржаўнага будаўніцтва, у сацыяльнай і эканамічнай сферах і культурна-асветнай галіне. **НА БЕЛАРУСІ ЗА НЕКАЛЬКІ МЕСЯЦАЎ БЫЛІ ЎТВОРАНЫ СОТНІ БЕЛАРУСКІХ ШКОЛ, У БУЙНЫХ ГАРАДАХ ДЗЕЙНІЧАЛІ БЕЛАРУСКІЯ ГІМНАЗІІ, ЧАГО РАНЕЙ НЕ БЫЛО І БЛІЗКА. ВЫХОДЗІЛІ ДЗЕСЯТКІ БЕЛАРУСКІХ ГАЗЕТ І ЧАСОПІСАЎ, ПАЧАЛІ ДЗЕЙНІЧАЦЬ КУЛЬТУРНА-АСВЕТНЫЯ ГУРТКІ І ТАВАРЫСТВЫ, ТЭАТРЫ. РЫХТАВАЛАСЯ АДКРЫЦЦЁ НАЦЫЯНАЛЬНАГА УНІВЕРСІТЭТА.**

У канцы 1918 года, карыстаючыся паразай Германіі ў Першай сусветнай вайне, урад Беларускай Народнай Рэспублікі пачаў стараць вайсковыя адзінкі, аднак да прыходу ў Беларусь Чырвонай Арміі ў снежні 1918 года не паспеў іх разгарнуць у армію.

ЧЫРВОНАЯ АРМІЯ ЗАНЯЛА ТЭРЫТОРЫЮ БЕЛАРУСІ, І НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ БЕЛАРУСІ БЫЛА ЛІКВІДАВАНА БАЛЬШАВІКАМІ. Аднак абвяшчэнне незалежнасці Беларусі 25 сакавіка 1918 года мела і свае наступствы. ЦК Расійскай кампартыі (бальшавікоў) на чале з Леніным быў вымушаны ўлічыць поспехі беларускага нацыянальна-вызвольнага руху і, са свайго боку, **1 СТУДЗЕНЯ 1919 ГОДА АБВЯСЦІЦЬ БЕЛАРУСКУЮ САВЕЦКУЮ РЭСПУБЛІКУ, ЦАЛКАМ ЗАЛЕЖНУЮ АД МАСКВЫ, НЕСАМАСТОЙНУЮ, АЛЕ ЎСЁ Ж ФАРМАЛЬНА НАЦЫЯНАЛЬНУЮ.**

Рэха акта 25 сакавіка 1918 года аб абвяшчэнні незалежнасці Беларусі сягае і нашых дзён. Менавіта гэты акт стаўся ўзорам пры абвяшчэнні незалежнасці Беларусі ў канцы XX стагоддзя. У перыяд развалу савецкай імперыі **ВЯРХОЎНЫ САВЕТ БЕЛАРУСІ ПАД НАЦІСКАМ АПАЗІЦЫІ БНФ 27 ЛІПЕНЯ 1990 ГОДА ПРЫНЯЎ ДЭКЛАРАЦЫЮ АБ ДЗЯРЖАЎНЫМ СУВЕРЭНІТЭЦЕ БССР. 25 ЖНІЎНЯ 1991 ГОДА ВЯРХОЎНЫ САВЕТ БССР ПРЫНЯЎ ЗАКОН "АБ НАДАННІ СТАТУСУ КАНСТЫТУЦЫЙНАГА ЗАКОНА ДЭКЛАРАЦЫІ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БЕЛАРУСКАЙ ССР АБ ДЗЯРЖАЎНЫМ СУВЕРЭНІТЭЦЕ БЕЛАРУСКАЙ САВЕЦКАЙ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ РЭСПУБЛІКІ", А 19 ВЕРАСНЯ 1991 ГОДА — АБ НОВАЙ НАЗВЕ ДЗЯРЖАВЫ: РЭСПУБЛІКА БЕЛАРУСЬ.**

29 ліпеня 2000 года ў Мінску адбыўся Усебеларускі з'езд за незалежнасць, дэлегаты на які былі выбраны на сходах грамадзян ва ўсіх гарадах і раёнах Беларусі. **З'ЕЗД ПРЫНЯЎ АКТ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ БЕЛАРУСІ, У ЯКІМ АБВЯСЦІЎ:**

"Мы, дэлегаты Усебеларускага з'езда, ***сведчым*** *Богам і гісторыяй дадзенае нашаму народу права мець сваю незалежную дзяржаву з яе адвечнымі сімваламі — бел-чырвона-белым сцягам і гербам Пагоня;*

абвяшчаем *незалежнасць і дзяржаўны суверэнітэт неад'емнай каштоўнасцю беларускага народа;*

прызнаём *не маючымі законнай сілы любыя пагадненні і рашэнні, скіраваныя на скасаванні альбо абмежаванні суверэнітэту Беларусі;*

заклікаем *усіх грамадзян Беларусі і ўсіх суайчыннікаў за мяжой згуртавацца вакол ідэй Акта незалежнасці Беларусі, бараніць незалежнасць Айчыны".*

Акт 25 сакавіка 1918 года застаецца і сёння сімвалам барацьбы за незалежнасць і суверэнітэт нашай дзяржавы, за вяртанне сапраўднага статусу беларускай мовы як адзінай дзяржаўнай, за сапраўдную дзяржаўную палітыку ў дачыненні да беларускай нацыянальнай культуры, за ўзнаўленне нашых адвечных дзяржаўных сімвалаў — бел-чырвона-белага дзяржаўнага сцяга і герба "Пагоня" сімваламі барацьбы за дэмакратычную дзяржаву, за правы асобы ў нашай краіне.

Аргкамітэт па святкаванні 90-й гадавіны незалежнай Беларускай Народнай Рэспублікі звярнуўся да беларускага грамадства, органаў улады краіны з прапановай абвясціць 2008 год Годам беларускай дзяржаўнасці, а 25 сакавіка — дзяржаўным святам.

ДЗЕНЬ 25 САКАВІКА ЁСЦЬ НАЦЫЯНАЛЬНАЕ СВЯТА БЕЛАРУСАЎ — на Бацькаўшчыне і ў замежжы. Ад усіх нас залежыць, каб грамадскасць, усе беларусы абаранілі незалежнасць і суверэнітэт Беларусі, каб нашы дзеці, унукі і нашчадкі былі сынамі вольнай і незалежнай Беларусі.

Анатоль ГРЫЦКЕВІЧ,
доктар гістарычных навук, прафесар,
сябра Агульнанацыянальнага грамадскага арганізацыйнага камітэта па святкаванні 90-й гадавіны Беларускай Народнай Рэспублікі.

Язэп ВАРОНКА (1891—1952) — адзін з ініцыятараў абвяшчэння і кіраўнікоў БНР.
Фота з Календара, прысвечанага 90-годдзю Беларускай Народнай Рэспублікі (2008 г.)

Узнагарода — па заслугах!

Яе атрымалі падчас адкрыцця помніка ў гонар 90-годдзя БНР на сядзібе Анатоля Белага ў Старых Дарогах знаныя і заслужаныя перад Беларуссю людзі, хто сваёй самаадданасцю і талентам у грамадскай і творчай дзейнасці заслужыў глыбокую павагу і пашану.

Не, не ад імя дзяржавы, а ад імя грамадскага Камітэта ўшанавання на чале са старшынёй культурна-асветніцкага клуба "Спадчына" Анатолем Белым.

Адмыслова выраблены лепшымі беларускімі мастакамі ўзнагародамі ўганараваны, да прыкладу, **Аляксандр Казулін** і **Зміцер Дашкевіч** (за мужнасць у барацьбе за вольную Беларусь — *медаль імя К.Каліноўскага*), народны мастак **Леанід Шчамялёў** (за ўклад у развіццё беларускага мастацтва — *срэбны пярсцёнак з выявай герба "Пагоня"*), **Вольга Казуліна** (за актыўны ўдзел у праваабарончым руху — *медаль імя Цёткі "Кветка Беларусі"*), пісьменнікі **Алесь Пашкевіч** і **Алесь Рыбак** (за праўдзівае адлюстраванне сучаснасці — *медаль імя Васіля Быкава*), **Анатоль Валахановіч, Ігар Кузняцоў, Алена Кобец-Філімонава, Вячаслаў Сіўчык, Леанід Маракоў, Вацлаў Нямковіч, Зінаіда Тарасевіч, граф Аляксандр Прушынскі і іншыя** (за ўвекавечанне памяці ахвяр сталінскіх рэпрэсій — *медаль "Абаронцу пакутнікаў Беларусі"*).

Надзея САРМАНТ,
сябра клуба "Спадчына".

Не паставіш прыбор уліку вады — будзеш плаціць па 750 рублёў за кубаметр

Як прымусіць грамадзян устанавіць індывідуальныя прыборы ўліку вады? Падобна, што гэтае пытанне не дае спакою работнікам Мінжылкамгаса.

Як заявіў намеснік міністра жыллёва-камунальнай гаспадаркі Беларусі **Сяргей СУШКО**, сёння сабекошт падачы вады складае 750 рублёў за кубаметр, а насельніцтва пакрывае затраты толькі на 43%. "У адзін момант мы можам людзей, якія не разумеюць гэтых задач, паставіць у такія ўмовы, што калі не хочаш кантраляваць і трымаць справаздачу за фактычна спажытую ваду — тады плаці па сабекошце", — заявіў ён.

Вячаслаў Харанека ідзе на новы рэкорд!

Падпалкоўнік запасу, беларускі асілак Вячаслаў ХАРАНЕКА рыхтуецца ўсталяваць свой 127-ы афіцыйны рэкорд.

"Планую 24 красавіка — у дзень 85-годдзя "Дынама" — за дзве з паловай гадзіны ўзняць саракакілаграмовы кег з мёдам 850 разоў, — распавёў "Народнай волі" Вячаслаў Васільевіч. — Мінулае дасягненне ў падобнай дысцыпліне — 800 разоў".

Чакаецца, што свой рэкорд Харанека будзе ўсталёўваць у прамым эфіры аднаго з беларускіх тэлеканалаў. "Гэта ўскладнае працу, бо ў студыі даволі спякотна ад сафітаў. Для таго, каб лягчэй перанесці гэтую нязручнасць, я скідаю вагу. За тыдзень схуднеў на тры кілаграмы. Зараз мая вага восемдзесят кіло", — прызнаецца Харанека.

Віталь ГАРБУЗАЎ.

Народная Воля http://www.nv-online.info
20 САКАВІКА 2008 г.

ВАНДАЛІЗМ

Ніхто не спляжыць гэту памяць

Па Курапатах зноў прайшліся вандалы. Ды як! Ажно 35 крыжоў было вывернута, паламана на тэрыторыі Народнага мемарыяла ў ноч на 13 сакавіка.

Новы акт дзікунскага злачынства — толькі працяг у ланцугу бясконцага сатанінскага глумлення над памяццю пакутнікаў Беларусі — бязвінных ахвяр сталіншчыны. Тым, хто пераняў яе нялюдскую мараль і практыку, і сёння няймецца: іх папярэднікі расстрэльвалі ні ў чым не вінаватых суайчыннікаў — гэтыя топчуцца па іх касцях без пробліску сораму і сумлення, апаганьваюць святыя магілы. Чаго толькі ні вычвараюць тут, куды трэба прыходзіць з кветкамі, свечкамі і малітвай! Пагром крыжоў, мемарыяльнага знака "Беларускаму народу ад народа Злучаных Штатаў Амерыкі дзеля памяці", метадычнае, несупыннае засмечванне ўрочышча горамі друзу з самазвалаў... Нарэшце, на курапацкім пагорку, побач з каменем, на якім была калісьці шыльда аб урадавым рашэнні яшчэ ад 1989 года годна ўвекавечыць памяць закатаваных продкаў, з'явілася ўстаноўленая Міністэрствам культуры пазнака: "Гісторыка-культурная каштоўнасць. Месца згубы ахвяр палітычных рэпрэсій у 30—40-я гады XX ст. Прычыненне шкоды караецца па закону".

Але ні разу "прычыненне" так і не каралася: ну ніяк не можа наша доблесная міліцыя расшукаць злачынцаў — ёй жа трэба хапаць тых, хто піша "Жыве Беларусь!". Ці не таму мярзотнікі, якім не даюць па руках, распярэзваюцца ўсё больш і больш. Прытым, па ўсім відаць, гэта далёка не выпадковыя, "звычайныя" хуліганы. "Вывучаюць" нашу гісторыю! Праўда, па-свойму.

Увосень, калі звалілі грунтоўна ўмацаваны вялікі Крыж пакуты ці калі трушчылі гранітную "Лаву Клінтана", відавочна, што арудавалі з выкарыстаннем няслабай спецтэхнікі. А цяпер, падобна, лютавалі немалой бандай, кімсьці арганізаванай і добра падагрэтай...

— Характэрная рэч: асабліва жорсткія налёты на Курапаты звычайна "прымеркаваны" да нашых нацыянальных свят: Дзядоў, Дня Волі, — гаворыць намеснік старшыні Кансерватыўна-Хрысціянскай партыі - БНФ Валеры Буйвал. *— А яшчэ шалеюць расійскія фашысты — РНЕшнікі ў дзень народзінаў свайго куміра — Гітлера. І вось зноў кашчунства, напярэдадні 90-годдзя Беларускай Народнай Рэспублікі... Надзея на прыцягненне да адказу вінаватых у вандалізме па законе, на жаль, слабая. Хіба дзяржава, дзе міліцыя замест аховы правоў і жыццяў грамадзян робіць з іх жывы шчыт на дарозе, стане клапаціцца пра памяць аб мёртвых? Спадзеўка толькі на нашу грамадскасць, на сумленне і салідарнасць неабыякавых людзей. Разам з імі, як было заўжды, мы зберажом балючую памяць нашай зямлі. І ніхто яе не спляжыць: крыжы будуць паўставаць зноў і зноў.*

Сведчаннем таму стала шматлюдная суботняя талака ў Курапатах, якую ачольвалі кіраўнікі КХП—БНФ Валеры Буйвал і Алесь Чахольскі. Дзесяткі валанцёраў розных узростаў і прафесій з адпаведным рыштункам — рыдлёўкамі, піламі, сякерамі — прыйшлі 15 сакавіка ў святое ўрочышча, каб знішчыць сляды д'ябальскага шабашу, навесці парадак перад вялікім святам. Сыпаў дождж са снегам, а яны не заўважалі непагадзі, упарта робячы сваю справу. Рамантавалі і нанава ўкопвалі крыжы, высякалі хмызняк, прыбіралі смецце. Амаль да вечара, калі, нарэшце, выбліснула сонца, ішла цяжкая мужчынская работа. Знаходзілі занятак і жанчыны. Было шмат моладзі — знаёмых і новых, упершыню далучаных да талакоўскай традыцыі хлопцаў і дзяўчат. Яны таксама вельмі і вельмі стараліся.

І толькі міліцыянты, што важна, туды-сюды шнуравалі папарна па тэрыторыі ўрочышча з незразумелай простаму смяротнаму мэтай, былі старонніми назіральнікамі шчыравання дружнай грамады.

— Я ў іх запыталася, чаму не аберагаюць святую мясціну, а яны — маўляў, каманды не было, — з горыччу распавядае пенсіянерка Надзея Якаўлеўна Малаковіч. *— Дык чаму няма тае каманды, калі гэта афіцыйна прызнаная дзяржавай гістарычная каштоўнасць?*

Мая Тодараўна Кляшторная — дачка расстралянага паэта Тодара Кляшторнага, што з трохгадовага ўзросту расла за калючым дротам, разважае так:

— Курапаты ад самага пачатку сталіся полем змагання дабра і зла, светлых і змрочных сіл. Я веру, ведаю: час усё паставіць на свае месцы, і кожны — абсалютна кожны — атрымае, што заслужыў.

Сказанаму мудрай, мужнай ахоўніцай і руплівіцай Курапат з пакутніцкім лёсам і прамяністымі, поўнымі дабрыні вачыма нельга не верыць.

Святлана КЛІМЕНЦЕНКА.
Фота photo.bymedia.net

МНЕНИЕ

Иностранный инвестор не дурак...

Действительно, о каких по-настоящему крупных иностранных инвестициях можно вести разговор, если весь мир только и говорит о политзаключенных в Беларуси. Скажите, кто станет вкладывать деньги в страну, где массово нарушаются права человека, где нет свободы слова.

Хотите, чтобы в глазах мирового цивилизованного сообщества Беларусь имела положительный имидж -- освободите Козулина, не бросайте за решетку молодофронтовцев, ребят, за которыми будущее. А разве не стыдно, что газеты, которые пишут правду, не подпускаются к белорусским типографиям и им приходится печататься в Смоленске?

Нет, друзья, иностранный инвестор не дурак. Большие деньги он вложит в ту страну, где соблюдаются права человека, где свободно печатаются газеты с разными взглядами на жизнь.

Анатолий КРАСОВСКИЙ, инженер.

И В ШУТКУ, И ВСЕРЬЁЗ...

Рецепт дешевой еды

Уважаемая редакция!

Мне пришла в голову мысль — а почему бы не завести на страницах газеты рубрику для нищих (а это значительная часть населения РБ). В материалах, публикуемых под ней, давать рецепты дешевой еды (голь на выдумку хитра).

Даю первый рецепт.

2 литра пахты и 0,5 литра кефира смешать и закислить, затем простоквашу из этой смеси закипятить (не дать подгореть), укутать на 2—3 часа.

После этого перелить в полотняный мешочек, подвесить на 5—6 часов, чтобы сошла жидкость. Получается примерно 600 граммов свежего творога, то есть 3 пакета магазинного (около 3 тысяч рублей). В 2—2,5 раза дешевле и вкуснее намного.

С уважением —

Владимир Николаевич БАШКИРОВ, житель Могилева.

ПАЗІЦЫЯ

Адно яйка двойчы не выседжваюць

Хоць і з вялікім спазненнем, але, нарэшце, прачытаў у "Народнай волі" водгук на абразлівы выпад супраць нас, беларусаў, вядомага расійскага палітыка-хама У.В.Жырыноўскага, які з экрана тэлевізара абвінавачвае нас у здрадзе і супрацоўніцтве з акупантамі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Я маю на ўвазе надрукаваны ў "НВ" ад 4.12.07 г. артыкул пад загалоўкам "Як выкладчык з Гродна паставіў на месца Уладзіміра Жырыноўскага". Я шчыра паважаю за гэта свайго земляка Міхаіла Жураўкова. Як казаў Казьма Пруткоў: "Балбатун і маятнік падобныя: і адзін, і другі патрэбна спыніць".

І адначасова вельмі ім не задаволены: калі бярэшся за справу, пастарайся давесці яе да лагічнага канца.

Я таксама пасля абразлівага выпаду Жырыноўскага на адрас беларускага народа ў сваім віскліва-крыклівым выступленні на тэлевізійным ток-шоу У.А.Салаўёва "К барьеру!" напісаў на імя апошняга ліст. Ніякага адказу, натуральна, я не атрымаў. Гэтага і трэба было чакаць. У сваім лісце я з абурэннем паказаў невуцтва гэтага, з дазволу сказаць, расійскага палітыка і дзяржаўнага дзеяча — дэпутата Дзярждумы і намесніка спікера палаты.

А Міхаілам Жураўковым я не задаволены ў тым сэнсе, што ён, сказаўшы "а", не сказаў "б". Ён, на жаль, атаясаміў сваю асобу з шматмільённым народам Беларусі. Абраза, якую "выдаў" Жырыноўскі з экрана тэлевізара на адрас беларусаў, прагучала на ўвесь свет, а не для аднаго Жураўкова. Аднак ён палічыў дастатковым прыняць "прабачэнне" толькі для сябе. А чаму б не сказаць: "Ты абразіў не аднаго мяне, але ўвесь наш народ. Зараз тым жа шляхам папрасі і ў яго прабачэння".

А гэтаму скандалісту і невуку (інакш яго пасля такога выступу назваць нельга) хачу выкласці невялічкі ўрок гісторыі, што датычыцца Вялікай Айчыннай вайны. Я, дзякуючы непераможнай Чырвонай Арміі, пражыў пад акупацыяй 1075 дзён і начэй. І памятаю часы вайны ва ўсіх яе падрабязнасцях. Дык вось, паслухай, пан палітычны клоун...

У Беларусі было не больш здраднікаў, чым іх было ў самой Расіі. Не было ў Гітлера беларускай арміі накшталт РОА ці РОНА. А калі і былі паліцаі — у сям'і не без вырадкаў, то іх таксама было не больш, чым у Расіі. І тыя, узброіўшыся, хутка паўцякалі да партызан. Так што гэты ваш "абвінаваўчы аргумент" адпадае сам па сабе.

Адначасова хачу спытаць: ці не ведаеш ты, пан балбатун і дэмагог, колькі акружэнцаў, рызыкуючы сваім жыццём, выратаваў беларускі селянін ад гітлераўскага палону і галоднай смерці? А затым у "падзяку" аказаўся ў канцлагеры на вялікіх будоўлях камунізму.

Ці ведаеш ты, спадар крыкун, колькі тваіх братоў-яўрэяў выратаваў беларус ад непазбежнай смерці дзе-небудзь у Асвенцыме ці Майданеку ў час акупацыі? І ты яму так аддзякаваў!

Ці ведаеш ты, прэтэндэнт на прэзідэнцкі трон Расіі (?!), колькі разоў за многія стагоддзі Беларусь станавілася непераадольным абарончым рубяжом ад тых, хто ішоў заваёўваць расійскія прасторы? А што ты ўвогуле ведаеш, акрамя распаўсюджвання вялікадзяржаўнага шавіністычнага смуроду?

А вось ці магчыма была б Перамога СССР над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне без Беларусі? Уявіце сабе толькі на імгненне такую акалічнасць. Ваенныя дзеянні вермахт пачаў не за Брэстам і Гродна, а на мяжы Дубровенскага раёна Беларусі і Рудзенскага раёна, што на Смаленшчыне — РСФСР. Ці паспелі б нашы "старэйшыя браты расіяне" стварыць абарончыя збудаванні для абароны Масквы? Адлегласць ад Смаленска да Масквы — рукой падаць. Нездарма Смаленск часта называюць "варотамі Масквы". Гэты шлях немцы ў той час маглі прайсці не больш, як за два дні. Такая магчымасць у іх была. За лета і сухі перыяд восені яны б аказаліся на Урале. Толькі не крычыце "Не!".

Гісторыя не прызнае ўмоўнага ладу, таму здарылася тое, што здарылася. Дык дайце нам толькі наша належнае і не плюйце, як вярблюды, на наш адрас!

А калі б на тэрыторыі Беларусі ад Брэста да Оршы, ад Віцебска да Гомеля не дзейнічала амаль паўмільённая армія партызан ды падпольшчыкаў? Беларусы сваімі целамі выслалі шлях да Перамогі. Такіх ахвяр не зведала ні адна краіна ў свеце. Тым часам рознага роду дэмагогі, балбатуны без сораму і сумлення дазваляюць сабе кідаць нам папрок у нейкай здрадзе, адначасова патрабуючы ўдзячнасці за "вызваленне".

У адрозненне ад спадара М.Жураўкова, я выклікаю У.Жырыноўскага "К барьеру!" Толькі не для таго, каб весці з ім нейкую дуэль на інтэлектуальным узроўні. Як я заўважыў па шматлікіх ягоных выступленнях ды дэбатах на тэлебачанні (туды чамусьці вароты для яго заўсёды адчынены ў адрозненне ад іншых, больш разумных і выхаваных палітыкаў), зрабіць гэта можа толькі такі ж дэмагог, як ён. Я смуроду ад паносу яго слоў пры запоры думкі знесці не змагу. Таму прапаную іншыя спосаб, сродак і месца дуэлі — Мемарыял вёскі Хатынь. І не для таго, каб весці тут з ім нейкую сварку ці лаянку (ён нічога іншага не ўмее). Хай прыедзе туды, пройдзецца паміж сімвалічнымі магіламі спаленых фашыстамі беларускіх вёсак, прачытае, што там напісана, які запавет нашчадкам. А затым прыйдзе да помніка жыхару Хатыні старому Камінскаму з забітым унукам на руках, стане на калені і хай просіць прабачэння. А расійскае ды беларускае тэлебачанне хай пакажуць на ўвесь свет. Мы тым часам падумаем. А думаць ёсць над чым.

Каму-небудзь можа паказацца, што пішу я рэзка, грубавата. Што гэта не мой стыль. Згодзен. Але ж з "господином" Жырыноўскім інакш нельга размаўляць. У беларусаў ёсць такая мудрая прымаўка: "Як гукаюць, так і адгукваецца".

Ні ў якім разе не хачу кінуць папрок ці якую-небудзь абразу на адрас расіян — рускіх і іншых народнасцяў Расіі. Не яны сёння будуюць і вядуць унутраную і знешнюю палітыку краіны. Не "калужскія ды кастрамскія хлопцы", не "Сережка с Малой Бронной и Витька с Моховой". Ёю запраўляюць іншыя з дэвізам "Расія для рускіх!" А хто яны такія, відаць няўзброеным вокам.

Варта толькі было адчуць подых ветру, свабоды над Украінай, як яны тут як тут. Ды толькі разумныя ўкраінцы паспелі своечасова зачыніць свае вароты перад самым іх носам.

Заварушыліся сепаратысты ў Грузіі, пачалі, бы тыя вярблюды, пляваць у бок грузінскіх дзяржаўных улад. Нягледзячы на папярэджанні грузінскага ўрада аб недапушчальнасці ўмяшальніцтва іншых краін у іх унутраныя справы, Жырыноўскі на яхце, выставіўшы голае пуза наперад, памчаўся да сваіх аднадумцаў-сепаратыстаў у Абхазію.

Захацелі эстонцы як цывілізаваныя сучасныя людзі пазбавіцца ад паганскага (язычніцкага) "капішча" ў цэнтры сваёй сталіцы накшталт Краснай плошчы, з Масквы грымнулі на ўсе грудзі: "Не сметь свое суждение иметь!"

Неяк пачуў, што ў Мінску адбылося пасяджэнне — нарада замежных ведамстваў "саюзнай дзяржавы" — Расіі і Беларусі. І яшчэ больш балюча адгукнулася ў душы абраза Жырыноўскага. Каб гэта зрабіў які-небудзь забулдыга, п'яніца ці звычайны тракціршчык, не варта было б звяртаць увагу. Але ж абразу нанёс дэпутат, намеснік спікера Дзярждумы, кандыдат у прэзідэнты, той, хто будзе вырашаць наш лёс у "саюзнай дзяржаве". Уявіце сабе, што такі чалавек умастаколіцца і апануе прэзідэнцкі трон Расіі. Якія могуць быць пасля гэтага наступствы? Не кажыце: НЕ. Калі паглядзець аб'ектыўна на падзеі ў Расіі сёння, які вектар развіцця ў палітыцы пераважае, то выключаць падобнае наўрад ці будзе слушным. Да таго ж варта ўспомніць словы вялікага амерыканскага пісьменніка Марка Твена: "На свеце няма нічога такога, што не магло б здарыцца".

Падсумоўваючы сказанае, хачу спытаць у сваіх суайчыннікаў: вы насамрэч хочаце такога "саюза"?

Калі ён сапраўды будзе калі-небудзь створаны, ці не паплывуць зноў сюды "ўпаўнаважаныя ўмацоўваць нашу дзяржаўнасць", як гэта бывала раней? І як у 1939 годзе навешвалі на нас ярлык "западник", а зараз "бээнэфавец". Ці ў пасляваенныя гады абразлівае "быў у час вайны пад акупацыяй". І ў кожнай анкеце прымушалі абавязкова аб гэтым пісаць. А калі не напішаш, замучаюць допытамі ў адпаведных органах. Могуць не прыняць на работу, у навучальную ўстанову.

Ці не знойдзецца паміж імі які-небудзь (я такое не выключаю) генерал, падобны да пераемніка Мураўёва-вешальніка фон Кампфа, які, выступаючы перад грамадскасцю Гродна ў кастрычніку 1865 года, сказаў: "Вы павінны стаць рускімі з ног да галавы і ганарыцца званнем "рускі". Такая воля Яго Вялікасці (Жырыноўскага. — Аўт.). Нельга вагацца: ніякая іншая нацыя жыць тут не мае права, адзіная — руская. Хто думае інакш, таму няма месца ў гэтым краі". Скажаце, глупства, часы не тыя. Ой, ці яно так?

Я асабіста такога "саюза" не хачу, а іншага, мяркую, быць не можа. Не хачу, каб сапраўдных беларусаў залічвалі ў здраднікі, "іванаў без роднасці", у "бээнэфаўцаў-нацыяналістаў" і проста ў "бульбашоў". Каб не пагражалі ім "калашнікавым" (а такое я ўжо аднойчы пачуў), адзіным "вартым вынаходствам" весці "прыязныя" перамовы.

Мы ў такім "саюзе" ўжо былі: адно яйка двойчы не выседжваюць. Некалі беларускі пісьменнік Змітрок Бядуля (Самуйлёнак) у сваёй аповесці "Салавей" напісаў такія словы: "Не хачу быць панскім салаўём". (Каб есці мух замест катлет.)

Часцяком мае сябры пры сустрэчы пытаюцца: ці не баішся ты так пісаць ды яшчэ ў недзяржаўнай газеце? А дзе хто такое надрукуе ў іншых выданнях? Я ім адказваю: абсалютна бяссграшных людзей на свеце няма. Гэта блеф, бравада. Але калі цябе балюча закранулі за душу, страх адыходзіць на задні план. Ягонае месца займае іншае пачуццё — жаданне супраціўлення, барацьбы, жаданне адстаяць свае гонар і годнасць. Тым больш калі крыўда нанесена не толькі асабіста табе, але і тваім суайчыннікам. Мо наш знакаміты Янка не да канца ўсведамляў, калі пісаў неўміручыя словы ў сваім "Кургане":

Сілен, княжа, караць,
Сілен голаву зняць,
Не скуеш толькі дум ланцугамі.

Анатоль Фёдаравіч КУЛЕШ, жыхар г.Ліды.

ЖЫЦЦЁ ЯК ЯНО ЁСЦЬ

Аддам ордэн за ордэр

Словы, вынесеныя ў загаловак, зляцелі з вуснаў жыхаркі Віцебска Людмілы Фадзеевай, якая нарадзіла і гадуе пяцярых дзяцей — ад 5 да 16 год. Летась, у год, што ў Беларусі быў аб'яўлены Годам Маці, Людміла ў ліку 300 шматдзетных жанчын краіны была ўзнагароджана ордэнам Маці. Але ганаровая адзнака не ўзрадавала Фадзееву, а толькі дадала ёй крыўды, бо годныя ўмовы побыту застаюцца для гэтай сям'і недасягальнай марай.

"Хоць сёння аддам ордэн у абмен на добраўпарадкаваную кватэру", — заяўляе Людміла.

Працуе яна дворнікам, а прафесія мужа Андрэя — электразваршчык. Агульны сямейны бюджэт з улікам абедзвюх зарплат і дапамог на непаўналетніх дзяцей складае каля 1,4 мільёна рублёў. Словам, багацеямі Фадзеевых не назавеш, асабліва памятуючы пра непазбежныя выдаткі. Тым не менш сям'я не бядуе. Дапамагае Фадзеевым працавітасць мужа і жонкі, іх ашчаднасць і развага. А найперш тое, што Людміла ў свае 36 год не саступае гаспадарлівасцю любой спрактыкаванай жанчыне сталага веку. Кухарыць не горш за прафесійнага кулінара, прадукты набывае не самыя танныя, а высакаякасныя, што ўрэшце дае выгаду. Вопратку дзецям яна спраўляе таксама найлепшую — модную і трывалую. Карацей, кіруецца старадаўнім англійскім мудраслоўем: "Мы не такія багатыя, каб купляць танныя рэчы" і беларускім аналагам: "Недапляціш — неданосіш". Менавіта таму не пашкадавалі Фадзеевы грошай на сучасны халадзільнік з маразільнікам і на другі тэлевізар: "Каб дзеці не спрачаліся, каму якую праграму глядзець..." Ёсць у сям'і і свая аўтамашына — "Волга" (ГАЗ-24).

Карацей кажучы, жывуць Людміла, Андрэй і дзеці не ў нішчымніцы, а дружна і шчасна. Вось толькі засмучае традыцыйна балючае для беларуса "кватэрнае пытанне". Сям'я з сямі чалавек месціцца ў доме Андрэевага бацькі, пабудаваным яшчэ ў 1945 годзе. Гэтае, з дазволу сказаць, жытло ўяўляе сабой адзін вялікі пакой з перагароддкай, напалову разбуранай печкай і прыбудаванай верандай. Ні цэнтральнага ацяплення, ні водаправода, ні каналізацыі тут няма.

Другі год Фадзеевы стаяць у чарзе льготнікаў на атрыманне добраўпарадкаванага жылля, якое, у прынцыпе, гарантавана ім законам аб дапамозе шматдзетным сем'ям. Але мясцовыя чыноўнікі не спяшаюцца выконваць закон, ствараючы штучныя перашкоды на шляху Фадзеевых да нармальнага побыту.

— Нас жа і на чаргу не хацелі ставіць, пакуль Андрэй не напісаў скаргу ў Мінск, — распавядае Людміла. — Толькі пасля гэтага тут, у Віцебску, звярнулі на нас увагу, паставілі на льготную чаргу. Праўда, з таго часу здзекуюцца з нас, амаль штодня патрабуюць усё новыя даведкі з розных арганізацый і ўстаноў. Не разумею я гэтага! Здаецца, вось жа яны, галоўныя нашы даведкі — усе пяцёра перад вачыма, і дакументы на іх ёсць, і закон прадугледжвае забяспечваць такіх, як мы, добраўпарадкаванымі кватэрамі, а мы ўсё яшчэ тулімся ў халупе без вады і цяпла.

Людміла Фадзеева пакуль яшчэ ніводнага разу не надзела свой ордэн, бо ўсё яшчэ разважае, ці не вярнуць яго ўладзе, якая грэбуе сваімі ж законамі.

Сяргей БУТКЕВІЧ.

ЗАДУМАЕМСЯ...

Калі мы беларусы, то чаму цураемся сваёй, беларускай, мовы?

Яшчэ два-тры гады таму Лукашэнка і яго памагатыя калі і гаварылі аб незалежнасці, то мімаходзь. У апошнія ж месяцы афіцыйная прапаганда разгарнула цэлую кампанію. Па рэгіёнах ладзяцца шматлікія канцэрты з лагатыпам "Мы — беларусы!"/ З іх спецыяльнай праграмай, кажуць, пазнаёмяцца нават за мяжой — у Польшчы, краінах Балтыі, Маскве...

Здавалася б, радавацца трэба, усяляк падтрымліваць арганізатараў такіх праектаў. Але, скажу шчыра, баюся, што ўсё гэта як нечакана пачалося, так нечакана можа і скончыцца. Паслухайце па радыё, тэлебачанні ўдзельнікаў разрэкламаваных канцэртаў — ніхто, акрамя Міхаіла Фінберга, на беларускай мове ні слова. Дык якія ж вы беларусы, калі цураецеся сваёй роднай мовы?! Тая ж Алеся вывучыла, прабачце, пяць-сем беларускіх песень — і яна агітуе за Беларусь? А Смолава? А Ціхановіч? А Афанасьева? А Скаражонак? А Паплаўская? А Калдун? А Алехно? Інтэрв'ю даюць направа і налева. А на якой мове? На рускай.

Не, спадарства, калі мы сапраўды беларусы, то давайце не на чужой мове размаўляць, а на сваёй, роднай. Мова — гэта душа народа, і каму, як не вам, майстрам сцэны, інтэлігенцыі, наканавана роля захавальнікаў усяго таго, што звязана з беларушчынай!

Мікалай КРАЎЧАНКА, навуковец.

ЕСТЬ ВОПРОС

По месту прописки

Подскажите, пожалуйста, медицинская справка для поступления в вуз должна быть с места прописки или с места учебы?

Юлия Саенко, г.Минск.

Как нам сообщили в Министерстве здравоохранения Беларуси, медицинская справка для поступления в вуз выдается абитуриенту лечебным учреждением по месту прописки.

МІЛАСЭРНАСЦЬ

Няўжо не абаронім Арцёмку?

Што можа быць больш подлым і цынічным, чым адабраць грошы, пасланыя для выратавання ад смерці безабароннай істоты — маленькага хлопчыка?

Як я даведаўся з артыкула Сяргея Буткевіча, апублікаванага ў "Народнай волі" 7 сакавіка 2008 года ("Падатак на жыццё"), такую подласць зрабіла чынавенства ў Сянно, куды я паслаў частку сваёй пенсіі, каб дапамагчы адвесці смерць ад незнаёмага мне маленькага Арцёмкі Бакаткіна. Яшчэ ў мінулым годзе даведаўся, што яму патрэбна тэрміновая аперацыя па перасадцы печані. Такія аперацыі, паведамлялася, робяць у Маскве, каштуюць яны многія тысячы долараў. Родныя прасілі дапамагчы, хто колькі можа...

Гэта мяне настолькі ўсхвалявала, што як толькі атрымаў пенсію, пайшоў на пошту і 6 лютага 2007 года адправіў 50 тысяч рублёў. Грошы невялікія, хаця для мяне, простага беларускага пенсіянера, яны не былі лішнія. Толькі гэта мяне не стрымала. Не дай Божа, падумаў я, каб нешта падобнае здарылася з дзіцем ці ўнукам любога! Тут аддасі апошняе.

На пошце мы доўга абмяркоўвалі, на які з рахункаў, указаных у газеце, адпраўляць грошы: на агульны дабрачынны ці канкрэтна — на рахунак Арцёмкі. Прыйшлі да меркавання, што, напэўна, больш надзейны будзе другі рахунак. Грошы павінны ў гэтым выпадку абавязкова трапіць па прызначэнні, разважалі мы. А выходзіць...

...Я быў вельмі шчаслівы, калі даведаўся, што аперацыя ў Маскве прайшла паспяхова. Але трэба было яшчэ нямала грошай на пасляаперацыйную рэабілітацыю. На шчасце, у Беларусі знайшлося нямала людзей, якія, як і я, адгукнуліся на чужую бяду.

Што ж далей? А далей здарылася тое, у што цяжка паверыць. Аказалася, што частку грошай, высланых рознымі людзьмі для лячэння дзіцяці, умудрыліся адабраць хітрамудрыя чыноўнікі з Сянно. Падумайце толькі, людзі: яны наклалі падатак на маці (якая аддала частку ўласнай печані дзіцяці) у 45 мільёнаў рублёў! Ці можна прыдумаць нешта больш гнюснае і цынічнае, чым падатак на гуманітарную дапамогу! Ды яшчэ ад людзей з жабрачай пенсіяй. Нават у царскай Расіі не дадумваліся да такога. Наадварот, купцам і іншым людзям, якія займаліся дабрачыннасцю, аказвалі ўсялякую падтрымку. Такім чынам дзяржава здымала з сябе частку клопатаў аб бедных.

Узнікае пытанне: ці сенненскія чыноўнікі самачынна парушылі нашы "самыя гуманныя" законы ў свеце, ці парламенцкія дэпутаты стварылі гэтыя законы такімі "гнуткімі", што іх можна трактаваць і так і гэтак, дазваляючы "законна" рабаваць трапіўшых у бяду людзей? На каго цяпер падаваць у суд — і ў які суд — за тое, што яны адабралі мае кроўныя пенсіённыя грашы, прызначаныя хвораму дзіцяці Арцёмку Бакаткіну?

Уладзімір ШУЛЯКОЎСКІ, пенсіянер.

Мінск.

АД РЭДАКЦЫі

Шаноўны Уладзімір Віктаравіч!

Дзякуй Вам за добрае сэрца і высакародны ўчынак! Толькі дзякуючы такім, як Вы, міласэрным, неабыякавым людзям мы ўратуем і маленькага Арцёмку, і дарагую нам Бацькаўшчыну ад згубы.

Народная Воля http://www.nv-online.info
20 САКАВІКА 2008 г.

События в мире: европейский взгляд

УРОКИ ИСТОРИИ

Ночь молчания

Австрия отметила 70-ю годовщину "аншлюса"

80 тысяч свечей всю ночь горели на главной площади Вены Хельден-плац в память о событии 70-летней давности. Его обозначают в учебниках истории немецким словом "аншлюс".

В марте 1938 года немецкие солдаты перешли австрийскую границу, не встретив никакого сопротивления. Напротив, местное население горячо их приветствовало. Австрия открыла новую страницу в своей истории —страницу коллаборационизма и уничтожения собственной элиты.

Уже через несколько дней родившемуся в Австрии Адольфу Гитлеру на венской площади Хельден-плац рукоплескали сотни тысяч австрийцев. Австрия перестала быть независимым государством и была объявлена частью Третьего рейха. Месяц спустя, в ходе организованного нацистами голосования, почти сто процентов австрийцев высказались в поддержку "аншлюса". Именно под таким названием вошло в историю присоединение Австрии к Германии, напоминает Euronews.

Затем начались террор и гонения. Первыми бесчеловечность нацистского режима, установленного в альпийской республике, ощутили на себе евреи. За несколько дней было арестовано 76 тысяч человек, 65 тысяч евреев были убиты, еще около 130 тысяч выдворены за пределы Третьего рейха.

В конце Второй мировой войны Австрия была оккупирована союзниками по антигитлеровской коалиции. Французские, американские, британские и советские войска поделили контроль над страной, освобожденной от нацистов. Австрии предстояло ответить за совершенные в составе гитлеровской Германии преступления.

Главы государств и правительств 27 стран — членов ЕС договорились о создании Средиземноморского союза

Вопрос о новой организации, инициатором которого выступил президент Франции Николя Саркози, стал одним из главных в повестке дня саммита Евросоюза, проходящего в бельгийской столице.

Этот союз призван стать новым этапом так называемого Барселонского процесса, который направлен на расширение сотрудничества между Евросоюзом и соседними странами Средиземноморского бассейна. Премьер-министр председательствующей в Евросоюзе Словении Янес Янша: "Мы признаем, что нам необходимо пересмотреть Барселонский процесс. Как это осуществить на практике? На этом саммите решения принято не было. Когда стартовал Барселонский процесс, время было другим. Сейчас настал момент внести корректировки".

В основу заложена идея равноправного сотрудничества всех стран ЕС с государствами Ближнего Востока и Северной Африки, имеющими выход к Средиземному морю. Перед организацией уже поставлены конкретные задачи. Первым на повестке дня должен стать проект по очищению вод Средиземного моря, который планируется реализовать к 2020 году.

Однако ряд стран, в частности, Словения, Австрия, Люксембург и Великобритания, выразили опасения, что новая организация может привести к возникновению в Европе параллельных структур. Кроме того, Польша поставила свое согласие на создание Средиземноморского союза в зависимость от предоставления Украине перспектив на вступление в ЕС.

Европарламент отметил полувековой юбилей

За это время он прошел немалый путь: на заре европейского строительства этот орган обладал исключительно консультативными полномочиями. Сегодня Европарламент оказывает все большее влияние на жизнь Единой Европы.

На первое заседание Ассамблея — именно так раньше назывался Европейский парламент — собралась 19 марта 1958 года. Сто сорок два депутата представляли национальные законодательные органы шести стран — основательниц Европейского сообщества. Сегодня в дебатах в амфитеатре Европарламента участвуют 785 представителей 27 стран — членов Евросоюза. Почти 30 лет евродепутатов выбирают прямым голосованием жители Европы.

Новое базовое соглашение ЕС — Лиссабонский договор — отводит европарламенту более значительную роль в процессе выработки общеевропейских законов и в утверждении бюджета Евросоюза.

ФОТОВЗГЛЯД

В Китае прошел 30-й по счету Национальный день озеленения; за последние 27 лет в КНР было высажено более 51 млрд деревьев.

В Дели (Индия) состоялась неделя моды 2008 года.

В США без визы

Латвия, Эстония, Литва, Венгрия и Словакия подписали соглашение с США, по которому к концу года граждане этих стран смогут ездить в Америку на короткое время без виз. Аналогичное соглашение в прошлом месяце подписала Чехия, которая жаловалась, что переговоры на уровне ЕС затянулись.

Соглашения распространяют на граждан новых стран — членов ЕС программу visa waiver, которой граждане западноевропейских стран пользуются уже давно. Они могут въезжать в США на срок не более трех месяцев без права на работу и по сути освобождены от необходимости получать туристическую визу.

О Конотопской битве

Президент Украины Виктор Ющенко поручил правительству разработать план мероприятий по празднованию 350-летия Конотопской битвы, в которой казацкий гетман Иван Выговский в союзе с татарами и поляками нанес поражение русским войскам, сообщает Lenta.ru.

Указ о подготовке к празднику размещен на президентском сайте. В честь этой годовщины предлагается, в частности, провести научные конференции и всеукраинский фестиваль "Казаческий родослав", а также снять документальный фильм о Конотопской битве, выпустить юбилейную монету и почтовую марку по этой тематике.

Кроме того, президент поручил правительству и администрации Сумской области решить вопрос о строительстве мемориального комплекса в память о победе войска Выговского. Победу планируется отметить также переименованием улиц и площадей в населенных пунктах Украины.

Целью всех этих мероприятий, как отмечается в указе, является "восстановление исторической правды и национальной памяти, а также распространение полной и объективной информации о событиях середины XVII века в Украине".

Битва под Конотопом произошла 29 июня 1659 года в ходе русско-польской войны. Украиной тогда управлял гетман Выговский, который намеревался присоединить ее к Речи Посполитой. В битве с русскими войсками на его стороне было крымское войско под командованием хана Мехмеда IV Гирея, а также польский отряд Андрея Потоцкого.

Потери русских, в соответствии с летописным источником, составили от 20 до 30 тысяч человек. Однако Выговскому эта победа не принесла успеха. Его планы по союзу с поляками вызвали в Украине недовольство: в том же 1659 году гетман был отстранен от власти.

Кубинцам разрешат электроприборы

Новый руководитель Кубы Рауль Кастро может в скором времени разрешить в стране многие из ранее запрещенных бытовых электроприборов, в том числе компьютеры и DVD-плееры.

Документ о планируемых мерах просочился в агентство Рейтер.

Высокопоставленный источник в кубинском руководстве подтвердил информацию корреспонденту Би-Би-Си.

Как уточняет корреспондент Би-Би-Си в Гаване Майкл Фосс, большинство бытовых электроприборов были запрещены в начале 1990-х годов, когда поставки энергоносителей прекратились, что привело к постоянным отключениям электроэнергии. В 2006 году энергетический кризис в основном разрешился за счет импорта большого числа электрогенераторов, работающих на топливе, которым Кубу щедро снабжает антиамерикански настроенный президент богатой нефтью Венесуэлы Уго Чавес.

В ближайшее время планируется снять запрет на компьютеры, DVD-плееры, электрические скороварки и рисоварки, автосигнализацию, телевизоры с диагональю в 19 и 24 дюйма.

Запрет на кондиционеры, которые трудно считать роскошью в условиях тропического климата Кубы, и на тостеры предполагается оставить в силе до 2009 года, поскольку, по оценке властей, с нагрузкой этих приборов электросети не справляются.

Пока нет никаких признаков легализации средств связи, таких как мобильные телефоны, или снятия ограничений на доступ к интернету.

РЕДКИЙ СЛУЧАЙ

Не шпион?

Почти за месяц до назначенного на 8 апреля старта космического корабля "Союз ТМА-12", на котором должен был стартовать первый космонавт Кореи Ко Сан, принято решение о его замене.

Причина — нарушение Кодекса поведения космонавта. Впервые в мировой космонавтике такое решение принимается не по медицинским или техническим, а по дисциплинарным соображениям. И многие СМИ гадают, что же случилось?

Место в экипаже займет 29-летняя аспирантка Ли Со Ён, которая числилась в дублерах. "Известия" выяснили коллизии первого в мировой космонавтике сюжета.

— Решение о замене космонавта принято корейской стороной, но мы об этом просили, - сказал руководитель Роскосмоса Анатолий Перминов. — Ко Сан неоднократно нарушал инструкции по работе с документами, выносил их за пределы учебной зоны. На предупреждения не реагировал. И мы решили проявить жесткость.

— Говоря без обиняков, это называется промышленный шпионаж?

— Не думаю, что он шпион. Шпион действовал бы профессионально, а этот просто заработать хотел. Корейская сторона поступила мудро. У нас много совместных проектов и обострять отношения невыгодно.

Хотя профессия космонавта окружена ореолом романтики, грешными земными делами космонавты не брезгуют. С 1990-х годов, когда астронавты начали регулярно посещать российский "Мир", до сей поры, когда ведутся работы в национальных сегментах МКС, нередко случается так, что иностранцы проявляют излишний интерес к российским системам жизнеобеспечения полета, которые считаются непревзойденными в космонавтике. Командир многих экипажей Геннадий Стрекалов рассказывал автору этих строк, как хватал за руку иностранцев, которые засовывали за пазуху детали оборудования, например, кислородные шашки. Иногда с невинными глазами говорят, что хотели просто сфотографировать какую-то деталь в своем сегменте, где освещение будто бы лучше...

Что касается 31-летнего Ко Сана, специалиста по робототехнике и компьютерным системам, который вышел победителем в общекорейском конкурсе из 36 тысяч кандидатов и отличился самыми высокими профессиональными оценками, то его в Звездном городке уже давно в шутку называли "шпионом". По роду деятельности Ко Сан тесно связан с "Самсунгом". По информации "Известий", в своем рвении Ко Сан пытался познакомиться с материалами, не имевшими отношения к программе его подготовки, и даже посылал домой посылки, где вместе с личными вещами находилась служебная документация. Корея, правда, возвращала эти посылки обратно в Россию. Чашу терпения переполнило то, что кореец раздобыл инструкцию по управлению кораблем "Союз", к чему не имел служебного доступа. "Ко Сан — не любопытный юноша, он знал, что можно и чего нельзя, и давал на этот счет подписку", — сказал "Известиям" один из руководителей Центра подготовки космонавтов.

Сергей ЛЕСКОВ.

ДЕМОКРАТИЯ ПО-БЕЛОРУССКИ

Если министр захочет, он расскажет о своей зарплате

На прошлой неделе пресс-конференцию для журналистов проводил министр статистики и анализа Владимир Зиновский. Он рассказал о том, какая в стране официальная средняя зарплата, что минчане имеют более высокие доходы, чем жители остальных регионов страны, особенно Гомельской и Брестской областей, и назвал много других официальных статистических цифр. Однако на вопрос "Народной воли", какие зарплаты имеют белорусские министры, Владимир Зиновский не ответил, сославшись на законодательство. Хотя признался, что Министерство статистики и анализа владеет такой информацией. Вот только знать ее всем белорусам не положено.

— В Беларуси, как и в других странах, а также в целом по нормам статистического отдела ООН, — заявил Владимир Зиновский, — *персональные данные, касаются они предприятия, организации или гражданина, не разглашаются. Если гражданин не возражает, он может назвать свою зарплату. Но государственная статистика любой страны, будь то западная, будь восточная, работает только на сводные данные. Если любой гражданин не будет уверен, что его данные о зарплате будут кому-то переданы, он просто откажется отвечать во время переписи, например.*

Конечно, мы знаем, кто больше получает, кто меньше. Есть министерства первой категории (более значимые) и министерства второй категории. И если, например, Министерство промышленности, в принципе, формирует ВВП страны, то, конечно, министр промышленности будет получать больше министра статистики. Но хочу отметить, что зарплаты министров практически одинаковые. И зарабатывают министры по труду. Может быть, и не такую большую зарплату, как хотелось бы.

Владимир Зиновский признался, что лично он получает 2,5 миллиона. Это "грязными", а "чистыми" на руки выходит и того меньше. По словам чиновника, зарплата министра — это не только должностной оклад, существует множество различных надбавок: за выслугу лет, классность, опыт работы и т.д.

КОММЕНТАРИЙ

Общество должно знать зарплату нанятого им на работу чиновника

По мнению юриста-правозащитника Елены Тонкачевой, в демократических странах представители власти открыты и подотчетны перед народом, там никто не делает тайны из зарплаты чиновников.

— Государственные служащие, тем более госслужащие высокого ранга, к которым, безусловно, относятся министры, — это публичные персоны, — говорит Елена Тонкачева. — Исходя из подхода, заложенного в том числе и в Конституции Республики Беларуси, государственная власть призвана обеспечивать выполнение ряда публичных функций, в частности, по управлению государством. Во всем мире публичные люди, и в первую очередь представители государственной власти, — открыты и подотчетны. Это значит, что вопрос о заработной плате высокопоставленных чиновников не может являться предметом закрытой информации для граждан, так как граждане, осознанно уплачивая налоги, содержат государственную власть.

Вопрос о заработной плате министров — это нормальный вопрос, и он должен быть открытым. Во всех демократических странах именно так и происходит, это один из принципов демократического устройства государства. Обнародовать зарплату высокопоставленного чиновника — не есть стыд, и в этом не должно быть никакой секретности. Высокопрофессиональный служащий, а на министерской должности должны находиться именно высококвалифицированные специалисты, должны получать высокую зарплату.

— Чем, на ваш взгляд, можно объяснить такую секретность в нашей стране?

— Непониманием фундаментальных основ демократического устройства общества. Общество должно знать, сколько получает нанятый им на работу чиновник.

Ольга ГРИНЕВИЦКАЯ.

СКАНДАЛЫ

Пользовался услугами «девушек по вызову»

Губернатор штата Нью-Йорк Элиот Спитцер истратил более 15 тысяч долларов на оплату услуг проституток, сообщил телеканал CNN со ссылкой на источники, близкие к расследованию этого дела.



Начало скандальной истории было положено расследованием внутренней налоговой службы Нью-Йорка, которое проводилось по запросу ряда местных банков, обеспокоенных подозрительными переводами нескольких тысяч долларов со счетов высокопоставленных чиновников штата. Причем деньги уходили на счета компании, связанной с элитным публичным домом Emperors Club VIP, а одним из тех, кто делал такие переводы, был губернатор штата Нью-Йорк Элиот Спитцер.

Для сбора дополнительных улик федеральная прокуратура, к которой подключилось ФББР, начала прослушивать телефонные разговоры губернатора. В ходе прослушки следователи, в частности, узнали, что в середине февраля господин Спитцер, собиравшийся в командировку в Вашингтон, заказал в Emperors Club VIP одну из жриц любви, которая прилетала к нему в столицу из Нью-Йорка. При этом, как ехидно подметила пресса, услуги девушки по имени Кристин обошлись "клиенту номер 9" (под таким обозначением губернатор штата фигурирует в материалах дела) не так уж дорого. С учетом того, что почасовая такса в элитном борделе доходила до 5,5 тыс. дол., Кристин стоила губернатору "скромные" 1 тыс. дол. за час.

СМИ сообщают, что после того, как информация о неблаговидном поведении губернатора Нью-Йорка стала достоянием гласности, господин Спитцер счел необходимым выступить с официальным заявлением. "В первую очередь и, что главнее всего, я приношу извинения своей семье. Я извиняюсь перед общественностью, которой я обещал большее", -- отметил он в присутствии Сильды Спитцер, своей супруги и матери трех его дочерей. Позже он подал в отставку.

Щекотливость ситуации в том, что в бытность генеральным прокурором штата в 1999--2006 годах Элиот Спитцер, снискавший себе прозвище "шериф Уолл-стрита" за успешную борьбу с финансовыми махинациями, возглавлял еще и группу по борьбе с проституцией и даже помог пресечь деятельность двух местных притонов. Неудивительно, что большинство рядовых жителей штата накинулись на губернатора не столько за сам факт измены, сколько за откровенное ханжество.

Скандальная история ставит крест на политической карьере 48-летнего губернатора, который до последнего времени считался восходящей звездой демократов и которого некоторые соратники даже прочили в президенты США.

СЛЫШАЛИ?

На Луне планируется устроить «ковчег»

В ковчеге будут храниться ДНК, эмбрионы и все необходимое для жизни и цивилизации; этими ресурсами воспользуются, если Землю опустошит столкновение с гигантским астероидом, резкая перемена климата или ядерная катастрофа.

По словам Бернарда Фоинга, исполнительного директора Международной рабочей группы исследований Луны, эта база данных поможет уцелевшим землянам возродить человечество, используя набор инструментов, управляемых на расстоянии. Базовая версия ковчега будет содержать жесткие диски с кодом ДНК, а также инструкциями по выплавке металла из руды и посеву сельскохозяйственных культур. Она будет спрятана в хранилище под лунной поверхностью, на небольшой глубине. Ковчег будет обслуживаться роботами.

В случае катастрофы специальные передатчики будут транслировать данные на Землю, на хорошо защищенные от внешнего воздействия приемники. Если ни один приемник не уцелеет, ковчег будет передавать информацию бесперебойно до той поры, пока на Земле не обзаведутся новыми приемниками.

Это сообщил доктор Фоинг, также являющийся научным руководителем лунной экспедиции Европейского космического агентства с использованием аппарата "Смарт-1".

Ученые предполагают разместить первую экспериментальную информационную базу на Луне не позднее, чем в 2020 году. Ковчег придется укрыть под слоем каменной породы, чтобы защитить от резких перепадов температуры, радиации и вакуума. Одним из источников энергии будут солнечные батареи.

Информация будет храниться на арабском, китайском, английском, французском, русском и испанском языках; передатчики свяжут ковчег с 4 тыс. "земных хранилищ", где будет предусмотрен кров, запасы продовольствия и воды для людей, уцелевших в катастрофе.

Народная Воля http://www.nv-online.info
20 САКАВІКА 2008 г.

Галіна Пазьняк

Беларусь у сэрцы

(Працяг. Пачатак у №№7–10, 13–14, 17–18, 21–22, 25–26, 29–30, 33–34, 37–38.)

* * *

Нягледзячы на тое, што з 1991 года Беларусь была незалежнай дзяржавай, шмат якія дзяржаўныя ўстановы працавалі ў рэжыме Савецкага Саюза. Вялікія чэргі прыйшлося адстойваць людзям, каб, напрыклад, аформіць замежны пашпарт, які даваў магчымасьць выехаць за мяжу. У Менску ўжо дзейнічаў Беларускі незалежны прафсаюз, і калі пэўнай асобе трэба было вырашаць некія пытаньні прафсаюзнага руху за мяжой, аформіць замежны пашпарт можна было праз прафсаюз і значна хутчэй, чым праз органы ўнутраных справаў.

Койданаўскай Радай Маскоўскага раёну Менска кіраваў нязьменны на той час Сяргей Міхноў. Чалавек энэргічны, дзелавы, ён умеў арганізаваць людзей і напачатку добра і шмат працаваў у Фронце. Але з цягам часу зь ягонай сьведамасьцю адбыліся моцныя перамены.

На той час Фронт шчыльна супрацоўнічаў з Незалежным прафсаюзам, і Сяргей Міхноў (як прадстаўнік Фронту) быў там сваім чалавекам. Ён ня быў сябрам Свабоднага прафсаюзу, тым больш — у яго кіраўніцтве. Але з боку Свабоднага прафсаюзу быў вялікі давер да Народнага Фронту, таму давяралі і Сяргею.

Нечакана высьветлілася, што Сяргей Міхноў (бяз ведама кіраўніцтва Свабоднага прафсаюза) узяў (а папросту скраў) пячатку арганізацыі і афармляў замежныя пашпарты грамадзянам ад імя Свабоднага прафсаюза за грошы, якія браў ва ўласную кішэнь. Па ягонай абвестцы да яго прыйшлі "аформіць пашпарт" і супрацоўнікі міліцыі, якія яго і "ўзялі". Справа ганебная і крымінальная, якая прадугледжвала меру пакараньня ў некалькі гадоў турмы. І гэта быў старшыня самай вялікай фронтаўскай Рады! Пад удар ставіўся аўтарытэт усёй арганізацыі Беларускага Народнага Фронту.

Цяпер я ведаю, што Міхноў найперш паляцеў да Пазьняка, усё расказаў, назваў сябе нягоднікам, які зганьбіў Фронт, і што за гэта яму няма дараваньня. Пазьняк растлумачыў яму, што мы ня "пачка" і не камуністы і абараняць "свайго" за крымінальнае злачынства ня будзем, параіў падаць заяву на выхад з Фронту, бо ўсё роўна выключым.

Мы тэрмінова склікалі Раду, дзе Сяргей Міхноў публічна прызнаўся, што скраў пячатку, падрабляў дакументы і браў за гэта грошы. Некаторых сяброў Рады гэтае прызнаньне кранула і падалося за "мужны ўчынак" (хоць гэтае "прызнаньне" было фактам міліцэйскага пратаколу). Пачуліся галасы: трэба дараваць. Сітуацыя падважылася з перавагай у бок дараваньня. (Што зробіш — "мэнтальнасьць", тэма антыбеларускіх анекдотаў.) Сяргей, апусьціўшы галаву, маўчаў.

Ён быў маім сябрам, мне асабліва цяжка было пачуць яго "споведзь". Але я разумела, што ён паставіў пад удар ня толькі сябе (за асабістыя ўчынкі кожны адказвае сам), а ўвесь Фронт, чысьціню яго сьветлай адраджэнскай ідэі. Ці сумяшчальныя з гэтым былі шкурніцкія інтарэсы Сяргея — пытаньне рытарычнае. Але Рада (пад уплывам асабістага жалю да Сяргея) маўчала. Стала злавесна ціха, і ў гэтай цішы, перамагаючы супярэчлівыя асабістыя пачуцьці, з цяжкім сэрцам я прапанавала Сяргею выйсьці з Фронту па ўласнаму жаданьню і вярнуць фронтаўскі білет.

Вярнуць білет Сяргей катэгарычна адмовіўся. Напруга ўзрастала, а паўза зацягвалася. Трэба было прымаць рашэньне. У гэтай жудаснай цішыні марудзіць было нельга. Тады я ўстала і дрыжачым голасам, але цьвёрда прапанавала выключыць Сяргея з Фронту.

Рашэньне было прынята. Але паколькі справа Сяргея Міхнова была крымінальнай, яна кідала вялікі цень на Фронт, і гэты прыватны выпадак пракамуністычныя ўлады выкарысталі б, каб абліць гразёй увесь рух. Таму мы пастанавілі даць абвестку ў "Вячэрнім Менску" аб выключэньні С.Міхнова з Фронту. Вырашыць пытаньне з абвесткай рашуча вызваўся намесьнік старшыні Рады Сяргей Альфер.

Ішлі дні, а аб'ява надрукаваная не была. Сяргей Альфер спасылаўся на цяжкасьці, але я бачыла, што ён проста хітрыць. І тады мне зноў прыйшлося браць на сябе пытаньне з аб'явай, і неўзабаве газэта "Добры вечар" надрукавала абвестку пра рашэньне Койданаўскай Рады БНФ аб выключэньні Сяргея Міхнова з арганізацыі.

Потым С.Міхнову дзіўным чынам неяк удалося пазьбегнуць пакараньня. Ніхто з фронтаўцаў гэтым выпадкам (пазьбяганьня пакараньня) не пацікавіўся. Нейкі час пра яго не было чуваць. Але пройдзе некалькі гадоў, і ён спрычыніцца да развалу Фронту ў 1999 годзе, а потым зноў стане актыўным удзельнікам той часткі падзеленага Фронту, якая пойдзе на супрацоўніцтва з Масквой, на падтрымку кандыдата ў прэзыдэнты У.Ганчарыка (зь ліку былой камуністычнай намэнклятуры, зь якой Фронт змагаўся ў пачатку 90-х).

Так мы перажылі першую здраду і страту ў Кайданаўскай Радзе Народнага Фронту. Гэта быў вельмі цяжкі ўдар. Аказалася, што ў нашых шэрагах, сярод усіх нашых ахвяраў на карысьць будучыні незалежнай Беларусі, узьнікла такая нізкая зьява — хцівасьць, зладзейства, мана.

Калі сказана "першая здрада", так хочацца верыць, што апошняя. Зьнешне выглядала менавіта так. Ды і каму б прыйшло ў галаву думаць пра нечую здраду. Але яна насьпявала. Відаць, мяняўся час — і зьмяняліся паводзіны людзей.

А пакуль самая моцная менская Койданаўская Рада засталася без кіраўніка. І толькі тут я адчула, што былога маналіту ў нашых шэрагах ужо няма: у Радзе "раптам" зьявілася шмат раскольнікаў, тых, хто пра ідэю Адраджэньня і Незалежнасьці пачаў мець нейкую "сваю думку".

На пасаду старшыні неяк рэзка стаў прэтэндаваць Сяргей Альфер. Да гэтага часу ўжо сталі відавочнымі яго стараньні, накіраваныя на раскол Рады. Ён паводзіў сябе так, што мы з сябрамі сталі задумвацца, ці не працуе С.Альфер на спэцслужбы па разбурэньні Койданаўскай Рады. Як намесьнік старшыні Рады, ён прысутнічаў на Соймах, а пасьля рабіў паведамленьні на пасяджэньнях Рады і заўсёды "забываўся" паведаміць пра галоўнае, часам перакручваў факты, гаварыў няпраўду, інтэрпрэтаваў Соймы так, каб настроіць Раду супраць кіраўніцтва Фронту і асабліва супраць Пазьняка. Я была сябрам Сойму, ведала парадак дня кожнага пасяджэньня, таму не давала магчымасьці Альферу "разгарнуцца", зьвяртала ўвагу сяброў на ўсе скажэньні ў паведамленьнях Альфера.

Што ён "чужы", было зразумела, але праца Альфера па развале Койданаўскай Рады была прадуманай, і яго ня так проста было "схапіць за грыву". Некаторыя сябры Рады былі ў разгубленасьці і лёгка "блыталіся", які бок "мае рацыю".

Мы з сябрамі разумелі: калі Альфер стане кіраўніком самай вялікай фронтаўскай арганізацыі Менска, ён яе хутка разваліць. Патрэбна была асоба, якая б ня блыталася ў сітуацыі і была б на цьвёрдых адраджэнскіх пазыцыях. Мы з сябрамі пагадзіліся, што такой асобай зьяўляецца Сяргей Антончык, шмат гаварылі зь ім, пераконвалі, і ён пагадзіўся ўзначаліць Раду. Але на перадвыбарчы сход ён спазьніўся. Зрабілі перапынак. Сяргей зьявіўся і, адклікаўшы ў бок некалькі чалавек, стаў аб нечым размаўляць. Перагаварыўшы з сябрамі, ён зьняў сваю кандыдатуру і нечакана для мяне прапанаваў маю.

Я была ашаломленая і не магла паверыць, што гэта сур'ёзна, бо на той час зьяўлялася і сябрам Сойму, і старшынёй Камітэту "Дзеці Чарнобыля БНФ", і дэпутатам. Кіраваць яшчэ і Радай было мне не па сілах, бо ўсім займацца проста не хапала часу. Але тады заставаўся толькі Сяргей Альфер. Другіх прапаноў не было. Ну і што тут рабіць?

Са сьлязьмі ў душы я пагадзілася. Год ці паўтара ішло цяжкае змаганьне ў Койданаўскай Радзе. Альфер не драмаў. Ён здолеў утварыць апазыцыйную групу кіраўніцтву Фронту, якая вельмі перашкаджала нам працаваць. Кожнае рашэньне Сойму аспрэчвалася, Альфер спрабаваў не згаджацца, падбухторваў даверлівых людзей і плёў інтрыгу прафэсійна. Я ведала цану расколу Рады і трымала ўдар.

У Радзе ў мяне была моцная падтрымка, але гэтыя мае добрыя сябры патрабавалі згуртаваньня вакол старшыні, і я ні па якой (хоць самай уважлівай прычыне) не магла прапускаць ніводнай серады і быць "на Радзе", каб утрымліваць сытуацыю. Гэта быў самы цяжкі мой час, бо вакол Альфера згрупавалася (як мы лічылі) агентура спэцслужбаў, якая актыўна працавала на зьнішчэньне нашай арганізацыі.

Апазыцыйная сытуацыя (утварэньне апазыцыйнай групы) у адраджэнскай Койданаўскай Радзе сталася магчымай, бо Фронт уяўляў сабой адкрытую грамадзкую арганізацыю, адкрыты грамадзкі рух (ён істотна адрозьніваўся ад партыі). Мы запрашалі на пасяджэньні Рады ўсіх: і сяброў Фронту, і прыхільнікаў. Мы нікому не забаранялі прысутнічаць на Радзе, адкрыта абмяркоўвалі палітычную сытуацыю і радаваліся, калі да нас прыходзілі новыя людзі. Гэта і дало магчымасьць ворагам Фронту адкрыта "дзейнічаць" унутры арганізацыі пад эгідай "прыхільнікаў".

Але з гэтай цяжкай барацьбы я вынесла цьвёрдае перакананьне: ніколі ворагі не дамогуцца свайго, калі стаяць моцна, быць вернымі сябрамі, любіць Беларусь, ведаць "сваіх" (тых, хто любіць Бога і Беларусь) і ніколі не спакушацца на падман "чужых".

Нашыя ворагі нічога не дамагліся (хоць і вельмі стараліся), праўда, немалой цаной для мяне асабіста. У гэтай барацьбе я была проста зьнясіленая. Але ахвяра была вартая таго, і сёньня я не шкадую тых страчаных сілаў, якія пайшлі на карысьць Бацькаўшчыны. А тады некалькі разоў я ледзь ня плакала перад старшынёй Фронту, што ня маю сілы і навыкаў на такую выпрабаваную барацьбу з "гэбэ" (я была ўпэўненая, што гэта менавіта "гэбэ"). Старшыня разумеў мае цяжкасьці, ён размаўляў з Валянцінам Голубевым (які жыў на Паўднёвым Захадзе, дзе мы зьбіраліся) і прасіў падтрымаць мяне, але Валянцін раз ці два паявіўся, як месячык з-за хмар, і зьнік, так і не знайшоў часу для Койданаўскай Рады. Ён быў каардынатарам Апазыцыі БНФ у Вярхоўным Савеце, і гэта вымагала ў яго поўнай аддачы.

Выйсьця не было, я заставалася старшынёй Рады і кожную сераду (калі мы зьбіраліся) праводзіла вельмі напружаныя паседжаньні Койданаўскай Рады, адбіваючы ўдары варожай групоўкі і не даючы ёй завалодаць сытуацыяй. Гэта мне ўдавалася, але антаганісты ад злосьці і нянавісьці скрыпелі зубамі, часам яны ўжо не кантралявалі лексіку: "Какая-то баба будет тут командовать!" — казаў за маёй сьпінай дэпутат Гарсавета М.Пугачоў. Ён ня быў сябрам Фронту, але раптам стаў рэгулярна наведваць нашыя пасяджэньні і спрабаваць разам з Альферам іх сарваць. Аднак ён быў заслабы і інтэлектуальна, і маральна, каб перамагчы крэпкую дружбу верных адраджэнцаў, якія былі са мной і разам трымалі пазыцыю. Толькі праз год-паўтара знайшлі кандыдата на старшыню Койданаўскай Рады, і мне палягчэла.

* * *

Людзям заўсёды хочацца ідэальнага. Часам мне казалі, што дык вось жа, маўляў, у вас у Фронце ёсьць такі чалавек "ікс". А ён жа проста вельмі дрэнны чалавек, такі-сякі. Дык калі ў вас у Фронце гэты "ікс", дык я да вас ніколі не пайду.

Чуць гэта было вельмі крыўдна. Мы змагаліся, не шкадуючы сілаў, асабістага часу, здароўя, адпачынкаў, уласных грошай і г.д. І ўсё — для Беларусі. І наша дзейнасьць (як і ўсялякай грамадзкай арганізацыі) павінна ацэньвацца па яе мэтах, задачах, дзеяньнях і выніках. А некаторыя простыя беларусы не разумелі, што імпэрскія спэцслужбы ўсяляк стараліся нашкодзіць Фронту, скампраметаваць яго, заслаць сваіх разбуральнікаў, падкупіць слабейшых. Аднак вырашалі лёс нашай арганізацыі ня здраднікі, а фронтаўцы-адраджэнцы. На рахунку Фронту (Апазыцыі БНФ у Вярхоўным Савеце) самыя галоўныя дасягненьні — аднаўленьне незалежнасьці Беларусі, праўда пра Чарнобыль, праўда пра генацыд (Курапаты), вяртаньне беларусаў-вайскоўцаў з расейскіх войнаў і канфліктаў ("гарачых кропак"), Бел-Чырвона-Белы Сьцяг і гэрб Пагоня, угрунтаваньне дэмакратычнага заканадаўства, адраджэньне беларускай гісторыі, мовы, школы, культуры, беларускіх традыцыяў.

Так, здраднікі і адступнікі, на жаль, не пераводзяцца. Але трэба змагацца, бо з кім жа тады застанецца нашая Беларусь, наш Купала, наш Скарына і наш Васіль Быкаў? Я цьвёрда ведаю, што ад кожнага з нас залежыць, каб здраднікаў, рэнегатаў, адступнікаў і абыякавых было меней.

ДЗІЎНЫЯ ПАВОДЗІНЫ

Рэфэрэндум 1992 года і новыя выбары былі жыцьцёва неабходныя. Стары Вярхоўны Савет, выбраны па савецкім законе, быў ня толькі недзеяздольным у новых умовах, але й тармазіў усялякае разьвіцьцё Беларусі наперад. Адным з тормазаў быў Закон аб выбарах, згодна з якім Вярхоўны Савет даабіраўся амаль пяць гадоў. Прызначаліся выбары, але юрыдычна "адбыцца" яны маглі толькі пры ўмове ўдзелу ў іх 50 адсоткаў выбаршчыкаў. Людзі стаміліся бясконца зноў і зноў праз некалькі месяцаў выбіраць дэпутатаў і на давыбары не хадзілі. Выбары, як правіла, "не адбываліся".

Пасьля трэцяга разу (трэціх нерэалізаваных давыбараў) нам ўсё стала зразумелым. Удзельнічаць у давыбарах ужо ня мела сэнсу. Можна было не марнаваць час. Пазьней нават Вярхоўны Савет прыпыніць бессэнсоўныя бясконцыя выбары, бо выхаду з заканадаўчага тупіка ня было. У Фронце толькі адзін спадар Юры Хадыка не пагадзіўся з тупіком. Ён усё "кандыдаваў" у дэпутаты, разоў дзевяць ці болей, у Вярхоўны, потым — у мясцовыя саветы. Спачатку мы вельмі змагаліся за кожнага фронтаўца, тым больш за намесьніка старшыні Фронту. Як толькі былі аб'яўлены першыя "давыбары", Сяргей Міхноў сабраў койданаўцаў і паставіў задачу дапамагчы Ю.Хадыку. Тады ніхто з нас не пытаўся, хочаш ці не. Мы цьвёрда верылі ў слова "трэба", таму кожны дзень прыязджалі са свайго Маскоўскага раёну ў Акадэмічную акругу (што вельмі далёка, асабліва з раёну "Паўднёвага Захаду") і групамі па два-тры чалавекі хадзілі па кватэрах агітаваць. У выніку Акадэмічную акругу я ведала, бадай, лепш, чым сваю, у якой абіралася сама.

Болей, чым мы зрабілі тады, зрабіць было немагчыма — кожны дзень цяжкой працы. І назіраньне за выбарамі мы наладзілі пільнае. Але спадар Хадыка ўсё ніяк не выбіраўся — раз, другі, трэці, восьмы, дзявяты... Пачуўшы прозьвішча "Хадыка", агітатараў ужо часта не пускалі ў дзьверы, ці сустракалі іранічна, ці моўчкі слухалі, а Юры Віктаравіч упарта зноў і зноў працягваў бясэнсавы выбарчы марафон. Гэта была нейкая паталогія, і потым я ўжо ў гэтай кампаніі ня ўдзельнічала.

На выбарах, здаецца, у 1995 годзе сп.Хадыка абіраўся ў Вярхоўны Савет па акрузе майго Маскоўскага раёну. Па ёй камуністы выставілі свайго прадстаўніка, і трэба было (як звычайна на тыя часы) калі не перамагчы, то хоць не прапусьціць у Вярхоўны Савет камуніста. У выніку галасаваньня (і падліку) той камуніст набраў большасьць галасоў. Разыходжаньне было невялікае, прытым былі парушэньні. Паўстала пытаньне аб пераліку галасоў, але спадар Хадыка сам зьвярнуўся да выбарчай камісіі з прапановай залічыць дэпутатам камуніста. Усе ў Фронце ацанілі гэта чамусьці як нейкі кур'ёз, і ніхто не засяроджваўся на такіх паводзінах, але мяне гэта абурала.

Як толькі Лукашэнку абралі прэзыдэнтам, у першы ж месяц ягонай улады Сойм БНФ абмяркоўваў шляхі далейшай сваёй дзейнасьці. І тут спадар Хадыка прапанаваў Фронту супрацоўнічаць з Лукашэнкам, даючы пры гэтым шматслоўнае абгрунтаваньне сваёй прапановы "на карысьць Бацькаўшчыне". Ужо пачаліся нават спрэчкі, але Пазьняк іх спыніў, прапанаваўшы не сьпяшацца і пачакаць, як прынята ў сьвеце, 100 дзён, паглядзець на першыя крокі Лукашэнкі, якія, дарэчы, потым выразна паказалі ўсім (каму яшчэ было не зразумела), што такое Лукашэнка і ягоная крамлёўская манія. Пра абсурдную прапанову Ю.Хадыкі потым неяк забылася. Але пройдзе час, і ўжо ў 2005 г. Ю.Хадыка зноў вернецца да ідэі супрацоўніцтва з Лукашэнкам: маўляў, мы ня будзем перашкаджаць яму "стаць прэзыдэнтам" (гэта значыць незаконна і ў трэці раз) за абяцаньне дэмакратычных рэформаў.

І гэта пасьля ўсяго перажытага! Якія патрэбны яшчэ доказы, каб зразумець, што абазначаюць такія заявы?! Цяпер, праўда зьявілася шмат "змагароў", што наперабой жадаюць супрацоўнічаць з Лукашэнкам. Але гэтыя людзі ніколі не былі ў Фронце і ва ўсе часы былі супраць БНФ.

Аднак самае шокавае ўражаньне на мяне зрабіла заява спадара Хадыкі пра канец Беларускай Нацыянальнай Ідэі, выказаная ім у 1999 годзе ў інтэрв'ю рускамоўнаму часопісу "Избиратель". Мы нават перадрукавалі гэтае кашчунства ў "Беларускіх Ведамасьцях". Працытую: "Нацыянальна-вызвольная ідэя, якая была стрыжнем у дзейнасьці БНФ з канца 80-х гадоў, у значнай ступені вычарпала сябе...

Аптымальна было б не падзяліць Фронт, а аб'яднаць яго з Аб'яднанай грамадзянскай партыяй і іншымі партыямі гэтага накірунку" (Бюлетэнь "Избиратель", №9, чэрвень, 1999 г. "Беларускія Ведамасьці",— 2001, №2(32), стар.13).

Гэта пісалася якраз перад расколам Фронту. Аказваецца, ужо існаваў нават плян ліквідацыі БНФ. Для мяне абсалютна відавочна: такія рэчы можна гаварыць толькі пры поўнай адсутнасьці трывогі за Бацькаўшчыну. Пытаньне ня ў тым, разумее чалавек, што адбываецца на Беларусі, ці не разумее, хай сабе нічога не разумее, Але, трывожачыся, любячы, так не гавораць.

Шчыра кажучы, мяне зьдзіўляла абыякавасьць Пазьняка да выхадак Хадыкі. Адносіны ў іх былі зьнешне дружалюбныя. Хіба ён ня бачыць — думала я тады. Пазьней, ужо за мяжой, ён мне патлумачыў, што ніякага рэальнага ўплыву на палітыку Фронту і ўвогуле на палітыку Хадыка ня меў і ня мог мець, бо палітыка не яго планіда, ён проста не туды ўскочыў і своечасова не выйшаў з-за эгацэнтрычнага характару. Таму надаваць шмат увагі і спрачацца зь яго схаластычнымі разважаньнямі — гэта значыць самому займацца схаластыкай і марнаваць час. (Тым больш што ў дыскусіях ён ніколі не мяняе сваіх меркаваньняў.)

— Як гэта не ўплываў на палітыку Фронту? - кажу. — Але ж Фронт развалілі.

— Развалілі б і без Хадыкі. Калі на раскол структурна адкрытай арганізацыі з двух бакоў выдаюць вялікія грошы, то ў нашых умовах яе рана ці позна расколюць, — кажа Пазьняк. - Але калі б магчыма было застацца на Беларусі, то раскол можна было б прадухіліць.

"Формай яднаньня ўсіх беларускіх змагарных сілаў супраць рэжыму і імпэрыялізму, — казаў далей Пазьняк, — павінен быў стаць Беларускі Вызвольны Рух, дзе Фронт быў бы галоўнай аб'яднаўчай сілай. У 1997 годзе, летам, ужо калі я быў за мяжой, гэта ўдалося аформіць на 5-м Зьезьдзе БНФ. Вось тут і пачалася масіраваная атака з двух бакоў — зьяўляецца Ганс Вік, Хартыя-97, потым "перамоўны працэс", выцягнулі Чыгіра, Ганчара, кідаюцца вялікія чужыя грошы на развал і зьнішчэньне нацыянальнай апазыцыі (БНФ) і г. д. Дарэчы, я наперад пісаў пра ўсе гэтыя задумы і контрпляны супраць нас, але перамагчы ўсё з-за мяжы было цяжка. Хаця шмат што ўсё ж удалося прадухіліць і шмат што захаваць".

АФІЦЫЙНЫ ВІЗІТ ПРЭЗЫДЭНТА ЗША БІЛА КЛІНТАНА Ў МЕНСК

У студзені 1994 года сталіцу незалежнай Рэспублікі Беларусь наведаў Прэзыдэнт Злучаных Штатаў Амэрыкі Біл (Уільям) Клінтан. Гэта была падзея ў гісторыі Беларусі, бо візіт засьведчыў і падкрэсьліў падтрымку вялікай дзяржавы ЗША для нашай незалежнасьці. З боку праімпэрскіх сілаў на Беларусі было прыкладзена шмат намаганьняў, каб гэты візіт не адбыўся. Кебічаўскі прамаскоўскі ўрад асабліва намагаўся, каб Біл Клінтан не наведаў Курапаты (што было афіцыйна запляванна). Прыдумалі нават вэрсію, што Курапаты замініраваныя, і спэцслужбы Амэрыкі вымушаны былі пільна абсьледваць увесь маршрут у Курапатах.

Амэрыканскі Прэзыдэнт Курапаты наведаў, і перашкодзіць гэтаму ўладам не ўдалося. Там, у Курапатах, сустрэліся Біл Клінтан і Зянон Пазьняк, і амэрыканскі Прэзыдэнт распытваў пра Курапаты.

Памятаю, як прыгожа і ўрачыста пад Бел-Чырвона-Белым сьцягам прайшлі беларускія ваенныя ў афіцыйным маршы перад высокім госьцем. Але афіцыйныя СМІ асьвячалі гэтую падзею надзвычай сьціпла і аднабакова: кароткі сюжэт у "Навінах", і ні слова пра Курапаты (праўда, увесь сьвет трансляваў гэты візіт).

Тым ня менш аматарская здымка зафіксавала гэтую падзею: як сьпявалі ў нашым сьвятым месцы беларускія школьнікі "Магутны Божа", як Біл Клінтан моўчкі падышоў да Крыжа пакутаў і прачытаў малітву, як падараваў мэмарыяльную "лавачку" — сымвал памяці і падтрымкі амэрыканскага народа, як аглядаў Прэзыдэнт вялікай дзяржавы месца пакутаў і этнацыду беларусаў, як уважліва і са скрухай слухаў Зянона Пазьняка.

Візіт прэзідэнта ЗША Уільяма Клінтана ў Курапаты 15.01.1994 г.

IV ЗЬЕЗД БНФ

1995 год. Летнім сонечным днём з такім жа сонечным настроем я ішла ў Дом літаратара на Зьезд. Раптам насустрач мне кідаецца (цяпер нябожчыца) Натальля Рослава, старшыня Чарнобыльскай арганізацыі Магілёва:

— Галя, што ў вас тут у Менску адбываецца, я нічога не разумею. Сустрэла Веру Чуйко, яна нейкая ўзбуджаная, усхваляваная. Кажа мне: "Дрэнныя справы, Пазьняк выйшаў з-пад кантролю!"

— Што? Пазьняк? З-пад якога "кантролю"? Чыйго? Чуйко? Што за абсурд? — пытаюся.

— Я таксама нічога не разумею, але ўсё гэта вельмі дрэнна, — адказвае Натальля і бяжыць некуды далей.

Аказваецца, на Зьезьдзе спадар Хадыка і яго "група" вырашылі "зьняць" Пазьняка з пасады старшыні Фронту. Было сказанае нэрвовае і несправядлівае слова ў адрас старшыні Фронту, гэтаксама нэрвова выступілі Вера Чуйко, чамусьці Сяргей Антончык, нешта незразумелае мямліў Вінцук Вячорка. "Што за авантура?" - думаю. Рыхтаваўся Валянцін Голубеў. Ён сядзеў у прэзыдыюме і сачыў за рэакцыяй залі. Адчуўшы, што заля не ўспрымае авантуру, ён у апошні момант выступаць адмовіўся. Пазьняк назіраў і ні на што не рэагаваў. Паставілі на галасаваньне кандыдатуру старшыні Фронту. Падлік галасоў паказаў, што абсалютная большасьць падтрымала Зянона Пазьняка. За сп.Ю.Хадыку прагаласавала вельмі невялікая група.

Пасьля абраньня З.Пазьняка старшынёй Фронту ён прапанаваў кандыдатуры сваіх намесьнікаў, сярод якіх назваў і Ю.Хадыку. Зянон Пазьняк сказаў, што трэба думаць пра Беларусь, а не пра асабістыя непаразуменьні, што ён спадзяецца на супольную працу дзеля будучыні Беларусі. Заля была ўзрушана такім рашэньнем старшыні. Некаторыя чакалі, што Хадыка адмовіцца. Але ён сядзеў і ціхенька маўчаў. Маральная перамога Пазьняка была абсалютная.

НА ЖАЛЬ

У Фронце працы заўсёды было шмат. Паседжаньні Управы і Ценевага кабінету зацягваліся да паўночы. Адчувалася агульнае перажываньне за лёс Беларусі. І толькі адзіны з намесьнікаў старшыні Фронту спадар Хадыка пазьней дзесяці гадзінаў вечара ніколі не затрымліваўся. Якое б цяжкое пытаньне ні абмяркоўвалася, у пэўны час ён пунктуальна ўставаў і сыходзіў дадому. Рэжым ёсьць рэжым.

Пасьля паседжаньня каго маглі мы развозілі па дамах на нашым "фольку". Стаянка была побач з маім домам, таму апошнімі вярталіся мы з Юзікам Такушэвічам.

Аднаго разу праяжджаем сядзібу БНФ і бачым, што ў вокнах, якія выходзяць на вуліцу Варвашэні, адбіваецца сьвятло з калідора сядзібы. Мы ўстрывожыліся: хто там можа быць у такі час? Мы ж усе разам зачынялі дзьверы пасьля паседжаньня? Падыходзім да дзьвярэй — дзьверы з вуліцы Варвашэні зачыненыя. Ідзем у двор (дзе другі ўваход) і ня верым сваім вачам: у сядзібе, якую мы гадзіны паўтары таму зачынілі і ўсе разам пайшлі дадому, — звычайная п'янка. Якія ідэі, якая Бацькаўшчына! На стале ў пакоі Чарнобыльскага камітэта віно, гарэлка, недаедзеныя агрызкі ежы. Памятаю перапалоханыя твары працаўнікоў сядзібы, нецьвярозыя апраўданьні, зьбянтэжанасьць. Але найбольш мяне зьдзівіў адзін з тых, каго я тут убачыла. Ён заўсёды ўдаваў сябе за чалавека, так бы мовіць, стэрыльна "чыстага", выхаванага і нейкага не такога, як астатнія "звычайныя" сябры Фронту. Пры нагодзе ў размове ён падкрэсьліваў, што "не аматар" ні віна, ні гарэлкі (і гэта праўда). А тут сядзеў за сталом сярод бутэлек, недаедзеных кавалкаў ежы (якія не перашкаджалі яго "стэрыльнасьці") і зь некім ажыўлена размаўляў. І гэта — ночу, тайком, у нашай дарагой сядзібе, якую мы так любоўна будавалі, якая "дыхала" барацьбой за Беларусь, за яе будучыню, якая аб'ядноўвала нас пад сваім дахам высокімі думкамі і змаганьнем...

Для мяне гэта быў проста шок, я страціла дар мовы. (У нашай сядзібе сьвяточныя імпрэзы мы праводзілі. І кожны раз гэта былі сапраўдныя сьвята, да якога мы ўсе разам рыхтаваліся заранёў. Заўсёды было шмат народу, колькі магло зьмясьціцца ў памяшканьні (гэта ж наш агульны дом!), было ўрачыста, утульна, цікава і вельмі прыемна. Было дзівоснае адчуваньне агульнай еднасьці. Гаварыліся цікавыя прамовы, мы жартавалі, марылі, сьпявалі. Памятаю, як мы разам адзначалі юбілеі Рыгора Барадуліна, Васіля Быкава і іншыя сьвяты. Разыходзіліся заўсёды з узьнятым настроем, з адчуваньнем дзівоснай чысьціні і радасьці, што мы ўсе разам, што ў нашых шэрагах — лепшыя, вялікія людзі нашай Бацькаўшчыны. Нейкіх патаемных п'янак пэўнай групы раней проста быць не магло. І вось жа, вось жа яно!)

Старшыні Фронту пра гэтае здарэньне я нічога не сказала. Было непрыена і брыдка. Але пра тое, што гэта была зборка "палацавага перавароту", — у галаву не прыйшло. Я пастаралася забыцца пра ўбачанае. Толькі потым, нашмат пазьней, я зразумела больш.

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ ПРЭЗЫДЭНТА БЕЛАРУСІ 1994 ГОДА. ПЕРШЫ ТУР

Напярэдадні выбараў прэзыдэнта Беларусі ў 1994 годзе я напісала заяву намесьніку старшыні Гарвыканкама А.Сасноўскаму аб адпачынку за свой кошт у сувязі з працай у камандзе кандыдата ў прэзыдэнты Беларусі З.Пазьняка. Мой начальнік Сасноўскі — кіраўнік групы падтрымкі кандыдата ў прэзыдэнты прэм'ера В.Кебіча — быў крыху зьдзіўлены, што я прашу адпачынак для палітычнай працы. Сам ён, як і ўвесь апарат Гарвыканкама (які быў задзейнічаны на выбарчую кампанію Кебіча), працаваў на свайго "боса" менавіта ў рабочы час, і ніякіх "адпачынкаў" (ні Сасноўскі, ні работнікі Гарвыканкама) ніхто ня браў. Гэтаксама магла зрабіць і я. Думаю, ніхто б мяне за гэта не караў, але ў Гарвыканкаме я адзіная адкрыта прадстаўляла Народны Фронт і не магла даць шанс працаўнікам для якіх-небудзь сумніўных размоў пра Фронт.

Мой начальнік падпісаў маю заяву. "Мы з вамі на супрацьлеглых баках барыкад, але я заўсёды працягну вам руку, каб паціснуць яе, — з павагай сказаў ён. Пра кандыдата Лукашэнку ён адазваўся вельмі дрэнна, засьведчыўшы сваю абсалютную непавагу. — З Лукашэнкам я б ніколі ня быў у адной камандзе". (А праз нядоўгі час пайшоў яму служыць.)

Мы, фронтаўцы, паўсюдна зьбіралі подпісы на вылучэньне нашага кандыдата. Аднаго разу каля Дома быту на вул.Маскоўскай я сустрэла Міхася Чарняўскага, калегу і сябра Зянона Пазьняка, які зьбіраў подпісы за С.Шушкевіча. Так і стаялі амаль побач: мы з сябрамі зьбіралі подпісы за Пазьняка, спадар Чарняўскі — за Шушкевіча. Я толькі падумала тады: як жа гэта магчыма разрываць галасы і так заблытваць выбаршчыкаў, калі выбраць павінны аднаго, а не дваіх? Тым больш што я памятала спадара М.Чарняўскага адным з першых фронтаўцаў... Пазьняк на гэта ніяк не рэагаваў, толькі жартаваў і пасьмейваўся ў стылі Дзямянцея: "Кто как хаціт, тот так і гаварыт..." і г. д. Але відаць было, што ён ведае больш, толькі не хацеў казаць, бо аднойчы змрочна пажартаваў, што беларуса не вучыць нішто: ні гісторыя, ні вопыт, ні сьмерць, ні камунізм, таму ён робіць заўсёды не як трэба, а як хочацца, і, відаць, няма такой сілы, якая б зьмяніла яго паняцьці.

Мы з сябрамі найчасьцей зьбіралі подпісы каля Галоўпаштамта. Народу шмат, наша каманда ледзь пасьпявала запаўняць бланкі, выпісваць нумары пашпартоў і адрасы падпісантаў. Побач з намі прымасьціліся двое зборшчыкаў подпісаў за Лукашэнку. Яны самы адчувалі сябе няўпэўнена, прыніжана ўсьміхаліся. Нам было проста сьмешна назіраць за імі. Зьбіраць подпісы за Лукашэнку, нам здавалася, могуць толькі недаразьвітыя людзі, якія ня ў стане зразумець, што падтрымліваюць прымітыўнага чалавека. І гэта нам здавалася так відавочна, што выклікала адну толькі іронію...

Аднаго разу я сустрэла на вуліцы (побач з Гарвыканкамам) намесьніка старшыні Гарвыканкама спадара Нікіценку. Чалавек навукі, кандыдат эканамічных навук, сярод пяці намесьнікаў ён быў, бадай, самых дэмакратычных поглядаў. Я адносілася да яго з павагай. Выглядала, што ён найбліжэй стаяў да пазыцыі незалежнай дзяржавы Беларусь, хоць і працаваў у апараце "былых". Гэта адчувала ня толькі я, хоць спадар Нікіценка ніякіх выразных крокаў насустрач нам не рабіў.

Прывітаўшыся, я з уздымам сказала: "Вось хутка пераможа Зянон Пазьняк, і тады будзем будаваць вольную Беларусь!"

Ён паглядзеў на мяне і сказаў са спачуваньнем і нават нейкім (як мне падалося) трагізмам: "Галіна Фёдараўна, паверце мне, гэтага не адбудзецца ні за што, — і паўтарыў шматзначна і катэгарычна, — паверце мне, гэта абсалютна немагчыма!"

Ён сказаў гэта настолькі сур'ёзна, як быццам ведаў нейкі страшны сакрэт... У гэтай недасказанасьці я адчула шчырасьць, якая мяне ўразіла. Але на разьвітаньне я сур'ёзна дадала: "Вось пройдуць выбары, мы пераможам, тады й пагаворым".

Ужо за мяжой Пазьняк мне расказаў, якія ўстаноўкі былі дадзеныя ўладнай намэнклятуры і што гаварылася на іхных зачыненых нарадах. Напалоханы Нікіценка выказаўся ў стылі, якім яго напалохалі.

Антыфронтаўская прапаганда была страшэнная. Але і яна бляднела перад тымі велізарнымі выслікамі хлусьні, падману, фальсіфікацыі, якія ўлада скіравала на асобу кандыдата ад Фронту Зянона Пазьняка. Сотні тысяч ілжывых і гнюсных ананімных лістовак, артыкулаў у СМІ і г.д. раськіваліся кожны дзень па ўсёй Беларусі і ў друку. Было відавочна, што такой масіраванай атакай на Пазьняка кіравалі моцныя варожыя сілы, бо праца вялася сістэмна, беспрапынна і бязьлітасна. Чаго толькі не пісалі... Ня ведаю кім, але быў нават прыдуманы такі дурнаваты анекдот "пра Пазьняка", які быццам бы выступае на сэсіі Вярхоўнага Савета і абурaецца "вынікамі" панаваньня саветаў: "Лясы павырубалі, балоты павысушвалі! Камуністаў — няма дзе ні павешаць, ні ўтапіць!"

(Працяг будзе.)

Пятая гадавіна БНФ. 1993 г. Зьлева направа: А.Радкевіч, С.Альфер, Г.Пазьняк, А.Бяляцкі.

Народная Воля http://www.nv-online.info
20 САКАВІКА 2008 г.

ВАС ИНТЕРЕСУЕТ...

Чтобы отмыть Национальную библиотеку, понадобились альпинисты

"Весна — пора генеральных уборок. Однако мне, пенсионерке, сложно самой мыть постоянно загрязняющиеся окна. Да и живу я на седьмом этаже. Слышала, что после ремонта Национальную библиотеку отмывали профессиональные уборщики. Подскажите, существуют ли фирмы, которые могут сделать уборку в обычной квартире — вымыть те же окна и балкон с наружной стороны?".

Татьяна Владимировна, Минская область.

Как удалось узнать "Народной воле", Национальную библиотеку от грязи очищала фирма "Чистый свет". Это одна из наиболее крупных компаний, представляющих услуги генеральной уборки на белорусском рынке. На ее счету "чистка" после строительства торгового центра "Столица", Центрального вокзала и Дворца водного спорта.

Минимальная стоимость услуг компании — от 3 условных единиц за один квадратный метр.

Сотрудники компании признаются, что если заказчику нужно прибраться за минимальную сумму, то обращаться к ним не стоит. Однако это одна из немногих фирм, гарантирующая клиентами (а это в основном крупные учреждения и организации) выполнение заказа в срок, аккуратность, а также возмещение возможного ущерба, для чего заключается соответствующий договор. В штате компании есть даже альпинисты, пригодившиеся как раз для очистки Национальной библиотеки.

Однако "Чистый свет" берется за мелкие заказы только в том случае, если нет предложений от клиентов с крупными объектами. Однако фирм, готовых помочь с уборкой квартиры или мойкой окон, тоже предостаточно. На конец прошлого года в Беларуси их было около 30.

Ольга ПРУДНИКОВА.

БРУСЕЛЬ-МІНСК

Звычайны фламандскі нацыяналіст

"Толькі не прыязджайце да мяне ў нядзелю, — усміхнуўся 58-гадовы Эрык Дэврызэ ў адказ на маю прапанову напісаць пра яго артыкул. — Па нядзелях я звычайна езджу на ровары, удзельнічаю ў "тохце", альбо масавым веласіпедным заездзе. У розных правінцыях на старт выходзяць некалькі тысяч аматараў гэтага віду спорту. Кожны выбірае сваю дыстанцыю — ад 10 да 70 кіламетраў — у залежнасці, натуральна, ад узросту і стану здароўя. Мой "памерчык" — 50—60 км. Відаць, за кожны год жыцця па кіламетры"...

«Цяжкі» суразмоўца

З гэтым абаяльным фламандцам, шчыра кажучы, крышачку цяжкавата размаўляць. Асабліва іншаземцу і на роднай мове Эрыка, нідэрландскай. Ён увесь час цябе папраўляе: аніводная памылка не праходзіць міма вуха вопытнага карэктара. Ні лексічная, ні граматычная, ні арфаэпічная. Свае папраўкі Эрык робіць, як запраўскі дырыжор сімфанічнага аркестра, — размахваючы рукамі і дабіваючыся, у рэшце рэшт, стопрацэнтна правільнага вымаўлення ад свайго "геспрэк-партнёра".

"Мова — гэта музыка для вас?" — пытаю.

— *Так,* — пацвярджае Эрык. — *Мова — гэта сапраўдная класічная музыка... Але толькі ў тым выпадку, калі яе выдатна ведаюць. Ад такой размовы я адчуваю сапраўдную асалоду, нібы знаходжуся на канцэрце сімфанічнай музыкі... Калі ж нейкі наш палітык з тэлеэкрана размаўляе "праз пень-калоду", у мяне аўтаматычна зачыняюцца вушы, я прашу жонку тэрмінова выключыць тэлевізар. Не магу цярпець невуцтва!*

Gazet van Antwerpen

Ці, па-беларуску, "Антверпенская газета". Менавіта ў ёй і працуе карэктарам сп.Дэврызэ. Газета гэтая па бельгійскіх мерках не вялікая і не маленькая. Яе наклад каля 120 тысяч экземпляраў, газета "абслугоўвае" правінцыю, па колькасці насельцтва прыблізна як на наш Брэст с вобласцю. Карацей кажучы, бельгійскі "Брэсцкі кур'ер".

Выходзіць Gazet van Antwerpen на 72 палосках, уключаючы ўкладышы з мясцовымі навінамі. Згодна са статыстыкай, газету рэгулярна альбо час ад часу чытае не менш за 85% жыхароў правінцыі.

Рэдакцыя месціцца на ўскрайку горада і разам з дадатковымі службамі займае асобны двухпавярховы будынак, які па памерах нагадвае стары мінскі чыгуначны вакзал.

Кожны дзень Эрык Дэврызэ прыязджае на працу на ўласным джыпе "Гранд-Чэрокі". Днямі спазніўся ажно на дзве гадзіны. "Пробкі!" — разводзіць рукамі карэктар.

Дарэчы, карэктарская праца — не адзінае прызванне майго таленавітага суразмоўцы. Час ад часу ён, па замове галоўнага рэдактара, піша рэцэнзіі на кнігі, у асноўным на навуковую фантастыку, якую, дарэчы, любіць чытаць запоем.

«Я адчуваю сябе вышэй за журналіста...»

Ніякай спецыяльнай адукацыі карэктара, кажа Эрык, у Бельгіі не існуе: *"Я, напрыклад, вывучаў германскую філалогію ў Антверпенскім універсітэце, хтосьці з маіх калег — спецыяліст па ўсходніх мовах. Усім, каб трапіць на працу,даводзіцца здаваць шматступеньчатыя тэсты, экзамены, вельмі цяжкія, дарэчы. Таксама пішам дыктоўку, а потым шукаем памылкі адразу ў пяці 72-палосніках".*

— Ці адчуваеце сябе рангам ніжэй за журналіста ў інфармацыйным працэсе? — цікаўлюся.

— *Ніжэй?* — здзіўлена глядзіць на мяне карэктар. — *Вышэй, нашмат вышэй. Журналіст звычайна — гэта не вельмі вялікі знаўца мовы, у яго іншыя задачы. Большасць журналістаў, на шчасце, гэта разумеюць, і я для іх — у нейкім сэнсе хросны бацька. Але ёсць і такія, якія ходзяць да мяне сварыцца за мае праўкі, і прыходзіцца спакойна і аргументавана тлумачыць, чаму так пісаць нельга.*

"Мова, як і жанчына, патрабуе вельмі далікатнага абыходжання, — дадае Эрык. — *Я даю нейкія патуранні, але толькі так званым калумністам, лідэрам думкі, вялікім эксперыментатарам мовы"...*

Зарабляе "хросны бацька" па бельгійскіх мерках няшмат, меней нават, чым звычайны рэпарцёр, — "усяго" 1600—1700 еўра ў месяц.

Хто вылечыць «перфекцыянізм»?

Ёсць адна праблема, нават прафесійнае захворванне ва ўсіх карэктараў, лічыць сп.Дэврызэ, — гэта так званы перфекцыянізм, альбо імкненне ў жыцці ўсё рабіць з найвышэйшай якасцю. *"Са мной цяжка мець справу, я не цярплю паўпрафесіяналізму ні ў чым, і таму не зайздрошчу ні сваёй жонцы, ні нашаму сямейнаму доктару, ні сваім бацькам",* — смяецца карэктар.

Дарэчы, бацькі Эрыка, якім ужо пераваліла за 80, жывуць у Іспаніі. Туды ж, у Іспанію, альбо ў Грэцыю сям'я Дэврызэ любіць ездзіць у свой трохтыднёвы адпачынак — да бацькоў у госці альбо, як у нас кажуць, "дзікуном" — у горы з намётам ды мапай мясцовасці. *"Не люблю арганізаваныя туры, калі цябе хіба толькі ў туалет не водзяць за ручку",* — прызнаецца Эрык.

У свой жа працоўны час, каб аднавіць сілы, Эрык любіць пагуляць у папулярны на Захадзе "сквош", для якога ў рэдакцыі адведзены спецыяльны пакой, альбо ў настольны футбол. Натуральна, і працуюць карэктары ў асобным, спецыяльным пакоі. На паліцах у гэтым пакоі стаяць шматлікія тоўстыя слоўнікі, якія, як кажа Эрык, карэктары выкарыстоўваюць вельмі часта: *"Праверыць свае веды ў слоўніку — гэта вельмі добрая ментальная зарадка".*

Кніжная сцяна

Было б дзіўна, калі б у сапраўднага знаўцы мовы не было дома вялікай бібліятэкі. У сп.Дэврызэ — гэта сапраўдная сцяна з кніг. У асноўным на паліцах — навуковая і навукова-папулярная літаратура на нідэрландскай альбо на англійскай мове.

Акрамя гэтых моў, Эрык цудоўна размаўляе па-французску: усё ж такі ў Бельгіі дзве дзяржаўныя мовы. Нядрэнна, як адзначае сам, па-нямецку і па-іспанску і нешта можа сказаць на грэчаскай мове.

Дарэчы, некаторыя бельгійскія карэктары ў сваім жыцці мянялі амплуа, станавіліся, напрыклад, журналістамі, прычым, як правіла, лідэрамі думкі. *"Мова — гэта вялікая зброя, і той, хто ёю валодае ў дасканаласці, можа стаць вялікім чалавекам",* — заўважае Эрык.

«Фландрыя павінна стаць незалежнай!»

"Я — звычайны фламандскі нацыяналіст, — не хавае сваіх палітычных поглядаў сп.Дэврызэ. — *Кожны год Валонія, паўднёвая частка Бельгіі, атрымлівае ад Фландрыі 7—8 мільярдаў еўра. Колькі мы яшчэ будзем аплачваць чыюсьці ляноту? У прэсе нават з'явіўся новы тэрмін — "інстытуалізацыя беспрацоўя", гэта калі ў сярэднестатыстычнай сям'і тры пакаленні — дзед, бацька і сын не працуюць, але жывуць на сацыяльную дапамогу. Гэта не нармальна!"*

За прыклад *"краіны нармальнага развіцця"* Эрык бярэ Данію, у якой у два разы менш, чым у Фландрыі, жыхароў і вельмі высокі ўзровень жыцця. *"Belgique — c'est une structure artificielle. ("Бельгія — гэта штучная структура"),* — раптам мой суразмоўца ўстаўляе фразу па-французску. — *Мы ва ўсіх сэнсах размаўляем на розных мовах. Фландрыя павінна аддзяліцца ад Валоніі, а Брусель мусіць атрымаць статус незалежнай акругі — нешта накшталт сталіцы ЗША Вашынгтона".*

— А як вы ставіцеся да іншаземцаў у Бельгіі, да мяне, напрыклад? — пытаюся з насцярогай у нацыяналіста.

"Нацыяналіст — гэта зусім не азначае расіст, — усміхаецца Эрык. — *Адчуйце, як кажуць, розніцу. У прынцыпе, мне ўсё роўна, хто перада мною сядзіць — кітаец, беларус, габрэй альбо мангол. Я паважаю сваю мову і сваю культуру і ні ў якім разе не хачу дыскрымінаваць іншыя культуры. Але я таксама не хачу заплюшчваць вочы і закрываць вушы, калі чую, што да нас прыязджаюць жыць людзі, якія не хочуць інтэгравацца ў наша грамадства, не хочуць вучыць мову, не дасылаюць сваіх дзяцей у фламандскую школу, не працуюць, а толькі імкнуцца "прафітаваць" ад нашай сацыяльнай сістэмы".*

Беларусь у майго суразмоўцы асацыіруецца выключна са словамі "Мінск" і "Лукашэнка". З рускіх класікаў ён чытаў Талстога, Дастаеўскага і Салжаніцына, але лічыць іх "даволі змрочнымі, суровымі, часам заблытанымі і шматслоўнымі"...

Кот Батон і дом з душою

Спецыяльную атмасферу амаль у кожным бельгійскім доме ствараюць хатнія жывёлы — нязменны атрыбут мясцовага стылю жыцця. Сям'я Дэврызэ — не выключэнне. Апошнія пятнаццаць гадоў у іх доме жылі сабака і кот. Днямі сабака ад старасці памёр. Застаўся вялікі рыжы кот, мянушка якога ў перакладзе з нідэрландскай мовы прыкладна гучыць як "батон". Калі кот спіць, ён вельмі, з пункту гледжання гаспадыні, нагадвае бохан хлеба.

Мясцовую прымаўку пра тое, што кожны бельгіец нарадзіўся з цаглінай у жываце Эрык падзяляе не толькі тэарэтычна. Сваю трохпавярховую вілу ў вёсачцы Лекерэн пад Антверпенам ён пабудаваў сам, сваімі ўласнымі рукамі: *"Дзякуючы таму, што праца карэктара ажыццяўляецца "ў шыфтах", ці, іншымі словамі, то раніцай, то ўвечары, у мяне быў час і на будоўлю..."*

Эрык упэўнены, што ў яго атрымаліся *"не звычайныя чатыры сцяны, як у многіх, а нешта арыгінальнае, з душою".*

Праўда, звонку дом Эрыка выглядае амаль звычайна, а ўнутры, сапраўды, — гэта футурыстычная канструкцыя з трыма спальнямі, кухняй, даволі вялікай залай і вінтавой лесвіцай, якую вянчае драўляны, у форме піраміды "пэнтхаўз", — кабінет Эрыка.

У сваім палацы ён жыве толькі з жонкай, іх трое дзяцей і чацвёра ўнукаў маюць сваё ўласнае жыллё, але рэгулярна наведваюць бацькоў.

"Мая душа там, дзе стаіць мой дом", — ну а пад гэтымі словамі Эрыка мусяць падпісацца, напэўна, усе фламандцы, нават не нацыяналісты...

Алесь СІЛІЧ, спецыяльна для "Народнай волі". Фота аўтара.

Бельгія.

Иск «Горремавтодора» к заявителям «Евромарша»,

или Сага о четырех рулонах туалетной бумаги

11 марта на подмостках суда Советского района столицы, на протяжении двух с половиной часов, шел, образно говоря, спектакль. В здании по Лагойскому тракту, 13 рассматривалось дело "Горремавтодор" против заявителей "Европейского Марша". Главные действующие лица: режиссер-постановщик - "Красный дом", сценарист — Верховный суд, исполнитель заглавной роли — судья Сергей Борозна, актер второго плана, секретарь суда — Якимович. Жанр — саркастическая комедия. А если серьезно, то это была вторая попытка судьи оценить объемы нравственных мучений столичных чиновников и размеры ущерба, нанесенного флоре столицы участниками "Европейского Марша". Первая репетиция "спектакля" состоялась 25 января. Действо, однако, тогда длилось недолго. Сергей Борозна приостановил рассмотрение дела по причине отсутствия нескольких заявителей акции.

И вот попытка №2. На первом этаже — спецназ, непременный спутник всех политических процессов. В небольшом зале — журналисты, представитель истца, ответчики и молчаливые люди в гражданском. Свои претензии "Горремавтодор", являющийся подразделением Мингорисполкома, вложил в уста начальника юридического отдела Светланы Навицкой. На чаше весов правосудия иск потянул на 2 миллиона 135 тысяч 974 белорусских рубля.

Но сначала о приятном. Благодаря "Горремавтодору" октябрьский "Европейский Марш" получил вторую жизнь и словил на новую информационную волну, которая вынесла его в Европарламент и другие международные организации. Но у дела есть и другая сторона, та, что за кулисами. Могу утверждать, что подобного процесса еще не было в богатой истории белорусского судопроизводства. У иска, завернутого в обертку материальных претензий, ярко выраженная политическая сердцевина. Вытянутый из прошлого, он, однако, целиком ориентирован в будущее. Нынешний процесс — это всего лишь первый, пробный камешек. На вершине власти готовы спровоцировать лавину материальных исков, устремленную в коридоры судов по всей стране.

Только ознакомление с материалами дела позволяет представить реальный масштаб событий, происходивших 14 октября в Минске. По версии "Горремавтодора", в этот день на белорусскую столицу обрушился настоящий мусорный ураган. По крайней мере такое впечатление складывается после ознакомления с калькуляцией *"о дополнительных затратах по уборке территории 14.10.2007 года",* представленной в суд заявителем иска. Оказывается, на ликвидацию последствий "Европейского Марша" были брошены крупные силы. Не только пехота в составе 12 уборщиков с месячным окладом каждого в 191.640 рублей, двух слесарей, десятка разнорабочих, но и целая автомеханизированная колонна. Четыре поливочные машины КДМ-130, два трактора-щетки МТЗ 80, две специализированные машины "Бродвей Сеньера", вакуумная машина для очистки туалетов КО 510. Как оказалось, "Горремавтодор" — это не некая абстрактная структура с неблагозвучной аббревиатурой. Там живут и работают люди с большим человеческим сердцем. Это они позаботились не только о четырех биотуалетах, но и о белоснежной туалетной бумаге. Целых четыре (!) рулона. Из расчета один моток на 1000 участников "Европейского Марша". А так как каждый стоит 350 рублей, то "Горремавтодор" и требует от Лебедько, Ивашкевича, Милинкевича и других заявителей акции расплатиться за бумагу, независимо от того, пользовались они услугами биотуалета 14 октября или нет.

То, что не смогло запечатлеть даже бдительное Белорусское телевидение, узрели в Мингорисполкоме и провели соответствующий инструктаж автодоровцев. Объемы работ, выполненных простыми тружениками "Горремавтодора", свидетельствуют об истинных намерениях участников акции. Люди вышли на улицу, чтобы сорить и гадить, и не более того. Вот табун молодых людей устремился на уже облысевшие газоны и безжалостно топчет ухоженную землю. Марочкин, Буравкин, Богданкевич, а за ними и другие интеллигентного вида демонстранты начинают опорожнять карманы от бумажного мусора. Демократически ориентированные старушки в отместку за отмененные льготы организуют бесплатную раздачу кульков с семечками. Обиженные индивидуальные предприниматели, являющиеся разновидностью обычных спекулянтов, набив желудки просроченным товаром, оккупируют четыре биотуалета. При этом спецназовцы были грубо оттеснены митингующими от спасительных кабинок и рассеяны по подъездам близлежащих домов. Уличная оргия никак не хочет вмещаться в маршрут движения, установленный городскими властями. За удаляющейся толпой тянется зловещий мусорный шлейф.

А еще в судебном заседании мы узнали, что труженики "Горремавтодора" с симпатией относятся к "Европейскому Маршу". Он самым непосредственным образом влияет на прибавку к их заработной плате. За него отдельным категориям даже премии положены. На премиальное поощрение было потрачено 30% средств, которые организация пытается истребовать с заявителей акции. Оплата *"профессионального мастерства"* составила 3 тысячи 122 белорусских рубля. А вот за вредность на счетчике набежало всего-то 24 рубля. Однако, копейка к копейке, рубль к рублю — и вот уже счет идет на миллионы.

Сюжет для "Камеди-клаба" да и только. Однако не смешно.

Уже в ходе первых судебных заседаний дело не просто развалилось, оно рассыпалось, как труха. Нет никаких документов, доказывающих обоснованность материальных претензий. Ни одного доказательства! Ни одного внятного ответа по существу из уст представителя "Горремавтодора".

То, что некий "Горремавтодор" по прошествии четырех месяцев вдруг вспомнил о сугробах мусора, якобы оставленного участниками "Европейского Марша" на вылизанных столичных улицах и площадях, не есть ни случайность, ни нелепость. Скажем открыто: так неуклюже власти начали подготовку к 25 марта, когда, отмечая 90-летие Белорусской Народной Республики, в общественной акции могут принять участие десятки тысяч людей. Это их первая реакция на поданную в Мингорисполком заявку на проведение уличного шествия в этот день. Подтекст очевиден. Будем бить не только перчатками с металлическими пластинами, но и душить экономической удавкой. Главное — создать прецедент, и завтра пойдут иски от пожарников, налоговиков, коммунхозов, автобусно-троллейбусных парков, банно-прачечных комбинатов... В стране абсурда абсурд таковым не является. Покладистый белорус только первый раз, сев на острие гвоздя, гримасничает и мужественно сжимает фигу в кармане. На третий раз он свыкается с мыслью, что, возможно, так и надо. Его всегда согревает бетонное утверждение, зато у нас нет войны. А просматривая белорусскую телепанораму, он даже начинает сочувствовать неграм Гарлема и аборигенам Австралии.

Занавес. Торопливо удаляющаяся спина судьи. Он взял очередной тайм-аут...

Анатолий ЛЕБЕДЬКО.

P.S.

Еще семь организаций предъявили судебные иски заявителям "Европейского Марша". Теперь ясно, почему Сергей Борозна дважды приостанавливал рассмотрение дела. Нужно было время, чтобы организовать подготовку и подачу новых исков. Видимо, сумма материальных претензий показалась неубедительной. Дело толстеет и тяжелеет на глазах.

В качестве компенсации..

На днях активисты молодежного крыла Объединенной гражданской партии передали для руководства УП "Горремавтодор" четыре рулона туалетной бумаги. Церемония вручения проходила по адресу: Минск, ул.К.Цеткин, 49, где располагается офис организации, предъявившей судебный иск заявителям "Европейского Марша".

Таким вот образом молодые демократы решили частично компенсировать "Горремавтодору" затраты.

В ходе передачи туалетной бумаги выяснилось, что самого генерального директора Ивана Васильевича Гуриновича на рабочем месте нет.

"Директор не докладывает нам о своем местонахождении", — сообщили в приемной.

Правда, офис-менеджер, или попросту секретарша, Гуриновича любезно согласилась принять посылку для своего шефа. Когда она увидела, что в коробке четыре рулона добротной бумаги, она сначала растерянно изрекла: "Вы издеваетесь", а потом громко рассмеялась. А вместе с ней и охранники.

Для руководства "Горремавтодора" в качестве компенсации приобретена бумага более высокого качества: *"Стоимость одного рулона более 800 рублей вместо 325-ти, которые тов.Гуринович просит в своем иске. Думается, это должно компенсировать его моральные и нравственные муки".*

СЛЫШАЛИ?

Василия Дементея еще не перевели на новую работу

Уже больше девяти месяцев бывший первый заместитель председателя Комитета государственной безопасности генерал-майор Василий Дементей находится в распоряжении КГБ.

Хотя в президентском указе от 17 июля 2007 года написано, что Дементей освобожден от занимаемой должности "в связи с переводом на другую работу".

Судя по всему, "другую работу", подходящую для Дементея, пока не нашли.

Правда, как удалось узнать в КГБ, все это время Василий Иванович исправно получает зарплату.

"Как и все военнослужащие, он может находиться в распоряжении не более полугода, — сообщили "Народной воле" в КГБ. — Отпуск и больничный в этот оплачиваемый "срок" не входят..."

«Спасибо за беспокойство»

— Василий Иванович, а где вы сейчас работаете?

— В Комитете государственной безопасности.

— А кем?

— В распоряжении нахожусь.

— Это как понимать? На работу каждый день ходите или нет?

— Спасибо за беспокойство, всего доброго...

ИЗ АРХИВА

Председатель КГБ Степан Сухоренко и его первый заместитель Василий Дементей были освобождены от занимаемых должностей летом минувшего года. Об истинной причине их ухода можно лишь догадываться.

Кстати, пару месяцев назад новый шеф КГБ **Юрий Жадобин** заявил журналистам, что в самое ближайшее время Степан Сухоренко получит новую работу.

Однако назначение пока так и не состоялось...

Марина КОКТЫШ.

Незабыўная Ніна Іванаўна

Ніл Сымонавіч Гілевіч падараваў кнігу, на якой зрабіў надпіс: *"Маім мілым верным сябрам Радзіму Гаўрылавічу і Галіне Рыгораўне на ўспамін пра Ніну Іванаўну. З павагай і любоўю. Ніл Гілевіч 19.1.08"*.

Гэта ўжо сёмая кніжка з яго цыклу "Памяці Ніны"...

А ў свой час другі пісьменнік — Васіль Быкаў на тытульным лісце сваёй кнігі "Праўдай адзінай" зрабіў дароўны надпіс той цудоўнай жанчыне: "Мілай Ніне Іванаўне Гілевіч, добраму анёлу беларускасці, са шчырасцю і павагай. В.Быкаў. 4.V.85".

Для Ніла Гілевіча яго жонка Ніна Іванаўна сапраўды была светлым добрым анёлам ва ўсіх жыццёвых праявах. Яе адыход у іншы свет быў для Ніла Сымонавіча такім страшэнным ударам, ад якога ён дагэтуль не можа адысці. Незабыўная Ніна Іванаўна і цяпер увесь час у яго жыцці, дае парады, дапамагае пераадолець цяжкасці, асвятляе розум і душу...

Яшчэ пры Яе жыцці Ніл Гілевіч здаў у друк лірычны раман "...І плямы на табе няма" (2003), прысвечаны Жанчыне, якую кахаў і глыбока паважаў. У маленькай прадмове ён так і напісаў: "Жанчыне, з якою іду поруч — праз нягоды і радасці жыцця — ужо амаль паўстагоддзя. Прысвячаю з пачуццём любові і ўдзячнасці. Калі б не яна, я не зрабіў бы і палавіны таго, што зрабіў — і ў літаратуры, і ў навуцы, і ў грамадскай чыннасці".

Вось усяго некалькі радкоў з той кніжкі:

"Любая, родная, мілая!
Зноў я адчуў, што жыву.
Яснішча далеч імглівая.
Свет разганяе журбу.
Холад далоняў не выстудзіў.
Сівер не выдзьмуў цяпла.
Д'ябал у Бога не высудзіў
Тое, што ты мне дала".

Якая жанчына не жадала б пачуць, а, дакладней, заслужыць такое прызнанне?

Калі гэтая кніжка па выхадзе з друку трапіла да мяне, дык на ёй быў ужо сумны, горкі надпіс: "...на ўспамін пра Ніну Іванаўну, якая любіла Вас". Гэты лірычны раман паэта стаў падмуркам магутнага, неразбуральнага помніка, які пачаў будаваць Ніл Сымонавіч свайму добраму анёлу...

Прыблізна праз год ён апублікаваў вельмі шчымлівую кніжку "На флейце самоты" (2004), другі сшытак якой прысвечаны "Памяці Ніны. 2003—2004". Гэта лірычныя мініяцюры ў жанры класічнага японскага верша "танка". Чытаць іх без хвалявання немагчыма. У іх паўстае вобраз вабнай, разумнай, клапатлівай, аддданай Бацькаўшчыне і беларушчыне руплівіцы, незаменнай, вечна любай:

Да астатку дзён
Па самы апошні ўздых,
На гэтай зямлі
Ты — светач душы маёй.
І там будзеш ім, і там...

Ніна Іванаўна з дзяцінства была захоплена родным словам. Пазней, ужо студэнткай, аспіранткай, а затым выдатным спецыялістам-мовазнаўцам, кандыдатам філалагічных навук і дацэнтам БДУ, замілаванне словам свайго народа толькі ўзрасло. Яна апантана служыла яму і пакінула вялікую спадчыну ў выглядзе шматлікіх рукапісаў лекцый, дзённікаў, сшыткаў, запісаў. Ніл Гілевіч, сам цудоўны знаўца роднага слова і фальклору, выдатны рэдактар, з асаблівым пачуццём адказнасці і замілавання ўзяўся за той багаты скарб.

У выніку ў 2005 годзе ўжо выйшаў "Дыялектны слоўнік" (аўтар — Ніна Гілевіч, рэдактар-складальнік — Ніл Гілевіч). У ім падзагаловак: "Лексіка. Фразеалагізмы. Прыказкі, прымаўкі, прыгаворкі. Параўнанні". Тут столькі цудоўных каларытных слоў, багацьцяў дыялектнай лексікі розных мясцін! Чытаць яго — адчуваць асалоду ад чысціні, мілагучнасці і вобразнасці роднай мовы.

Затым была апублікавана кніжка "Таямніцы роднага слова" (2006) з падзагалоўкам "З назіранняў над мовай і стылем твораў беларускай мастацкай літаратуры", у якой Ніна Іванаўна аналізуе асаблівасці мастацкага пісьма вядомых майстроў слова, блізкіх і цікавых ёй самабытнасцю мовы і высокім мастацкім узроўнем твораў. Мне радасна было прачытаць глыбокі па змесце артыкул "Да пытання пра жанрава-стылёвую адметнасць алегарычных абразкоў Максіма Гарэцкага "Скарбы жыцця". Як адзначыў Ніл Гілевіч у дароўным надпісе, "...калі б не горкі лёс, Н. І, напэўна б, напісала пра творчасць М.І.Гарэцкага цэлую кнігу такога кшталту, як змешчаны тут эскіз, — яна вельмі яго любіла і цаніла, і — разумела...



Рэдактар — Ніл Гілевіч. 29.І.2006".

Ніл Сымонавіч падрыхтаваў і выдаў адну за адной яшчэ дзве кніжкі Ніны Іванаўны: "Слова — роднае, жывое, свабоднае" (2007) і "Гісторыя народа — у яго мове" (2007). Першая кніга мае падзагаловак "Узоры жывой народнай мовы ў вуснах беларускай вёскі 1960—1970-х гадоў". Тут сабраны залацінкі народных гаворак, якія Ніна Іванаўна запісала сама і яе студэнты ў час дыялекталагічных практык у розных раёнах Беларусі. Чытаючы кніжку (а калі пачнеш — не адарвешся), яскрава адчуваеш усю разнастайнасць жыцця беларусаў і ў часы безвыходнага гора, і ў моманты радасці, іх боль, дабрыню і спачуванне, філасофскія думкі і канкрэтныя гістарычныя падзеі, традыцыі маралі і этыкі продкаў і сучаснікаў. І скрозь — пачуццё дабразычлівага гумару і мяккай іроніі.

Другая кніга прысвечана сацыяльна-эканамічнай лексіцы ў беларускай мове XV—XVII стагоддзяў, без ведання якой немагчыма спасцігнуць гісторыю Беларусі.

Завяршае цыкл сёмая кніга самога Ніла Гілевіча, якую ён назваў быкаўскім выразам — "Добры анёл беларускасці" (2007) з падзагалоўкам "Штрыхі да партрэта Ніны Іванаўны Гілевіч". Як жывая, паўстае Ніна Іванаўна ў першых раздзелах кніжкі, калі маладая гарэзлівая студэнтка так міла жартавала, так весела і хораша смяялася... У кнізе яскрава выступаюць характэрныя рысы гэтай незвычайнай асобы: ласкавая жаноцкасць і чысціня душы, сціпласць і годнасць, розум і самастойнасць, воля і свабода мыслення, дабрыня і душэўная шчодрасць, здольнасць разумець другіх і спачуваць, клопат пра сям'ю і сяброў, пачуццё гумару, а галоўнае — любоў да Радзімы, да слова народнага, да беларушчыны.

Гэтая кніга — шчырая споведзь пра блізкага чалавека, асабістая і разам з тым аб'ектыўная, аб чым сведчаць выказванні калег, сяброў і вучняў Ніны Іванаўны.

...Успамінаюцца некаторыя падзеі, напрыклад, паездкі на маіх "Жыгулях" з Гілевічамі і маёй Галяй у Крынічнае да Янкі Брыля, на яго 80-годдзе. Ужо недалёка да яго сядзібы трапілі ў лес, здалёк убачылі жанчыну, якая шукала грыбы, і вырашылі спытаць дарогу. Аказалася, што гэта Ніна Міхайлаўна — жонка Івана Антонавіча. Сваёй гасціннасцю, дабразычлівасцю, розумам, вялікім гумарам абедзве Ніны — жонкі двух народных пісьменнікаў — былі падобныя. Колькі тады было радасці, смеху, добрых слоў, цікавых успамінаў! На жаль, Ніна Брылёва не надоўга перажыла Ніну Гілевіч...

Калі мы ехалі з Нінай Іванаўнай наведаць Ніла Сымонавіча ў санаторый Гарадзішча, дзе ён праходзіў рэабілітацыю пасля інфаркту, і калі сядзелі побач на юбілеі Ніла Гілевіча ў Чырвоным касцёле, як яна хвалявалася за свайго мужа. Колькі добрых слоў пачуў я тады ад яе пра яго, колькі шчырага болю было ў яе згадках пра несправядлівыя словы, надрукаваныя аб ім некалі блізкімі асобамі!

Ніна для Ніла Гілевіча, як і Леаніла для Максіма Гарэцкага — святыя. Нездарма ён згадвае ў кнізе той эпізод, калі Гарэцкі менавіта так сказаў сваёй дачцэ пра яе маці.

"Гори, гори, моя звезда..." — бессмяротнымі словамі раманса завяршае сямікніжжа Ніл Сымонавіч, паставіўшы на самую вяршыню ўшанаванне памяці сваёй адзінай любай Жанчыны. Нязгасная зорка Ніны Іванаўны будзе свяціць вечна!

Радзім ГАРЭЦКІ,
акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук Рэспублікі Беларусь.

РАРЫТЭТ

На аўкцыёне ў Нью-Йорку прадалі найстарэйшую ўзнагароду БССР

Ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга БССР праіснаваў з 1924-га па 1933 год. Узнагарода была і ў той час рэдкай — з 1924-га па 1928 год ордэн атрымалі ўсяго толькі 15 чалавек.

У Нью-Йорку прайшоў чарговы нумізматычны тыдзень, на якім нумізматычныя аўкцыённыя дамы і фірмы выставілі на продаж свае матэрыялы і калекцыі з перыяду антычнасці да нашых дзён. Як зазначае расійская "Независимая газета", на гэткіх тыднях за апошнія гады ўсё больш прапаноў савецкіх медалёў, ордэнаў і знакаў.

Напрыклад, дом Dmitry Markov Coins&Medals націск у гэтым годзе зрабіў на рускую і савецкую тэматыку — і не прагадаў. Яго продажы склалі 9,2 млн долараў супраць 2 млн на студзеньскіх таргах у мінулым годзе.

Спецыялісты кажуць, што калекцыя ўзнагарод былых савецкіх рэспублік Dmitry Markov Coins&Medals выдзялялася унікальнымі экспанатамі. Лідэрамі таргоў сталі ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга БССР і ордэн Леніна першага тыпу з ордэнскай кніжкай. Гэтыя ўзнагароды пайшлі за 150.000 долараў кожная, тады як азербайджанскі ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга і медаль "За карыснае" Аляксандра III — за 45.000 і 47.500 долараў адпаведна.

Пастанова пра ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга БССР была прынята 10 кастрычніка 1925 года.

Ордэн уяўляў сабой сярэбраны трохкутны шчыт, пакрыты чырвонай эмаллю. У цэнтры шчыта — шасцярня з зоркай і літарамі "СССР" пасярэдзіне. Цікавым для калекцыянераў ёсць тое, што надпісы на ордэне выкананы на трох мовах — беларускай, польскай і ідыш. Нагадаем, некаторы час у БССР гэтыя, а таксама руская мовы былі дзяржаўнымі.

У 1933 годзе пастановай ЦВК СССР узнагароджанне ордэнамі саюзных рэспублік спынілася ў сувязі з уводам ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга СССР. Такім чынам, узнагарода праіснавала дзевяць гадоў, ёю былі ўзнагароджаны ўсяго 15 чалавек. Чыя ўзнагарода трапіла на амерыканскі аўкцыён — невядома.

БЫЛО...

Таямнічы «Зеро» наводзіў страх на пілотаў



На аповед пра таямнічага, амаль невядомага для савецкіх пілотаў самалёта-знішчальніка мяне настроіла сустрэча з былым бартавым стралком бамбардзіроўшчыка Ту-2 Аляксандрам Шчагловым з-пад Магілёва, з якім мы разам лячыліся ў шпіталі для ўдзельнікаў і інвалідаў Айчыннай вайны ў Бараўлянах. Ён сам, пачуўшы мой успамін, звязаны з дзеяннямі савецкай авіяцыі ў час вайны, загаварыў:

— Я не паспеў трапіць па ўзросце на фронт супраць немцаў, а ў вайне з Японіяй удзельнічаў. І хачу згадаць адну неспадзяваную сустрэчу з японскімі знішчальнікамі, якая ледзь не стала апошняй для мяне і ўсяго экіпажа нашага Ту-2.

Узляцелі мы 20 жніўня 1945 года раніцой — 24 машыны. Павінны былі перабазіравацца на бліжэйшы да фронту новы аэрадром, да яго было паўтары гадзіны лёту. Неба па маршруце было без аблокаў, вышыню трымалі тры тысячы метраў. На сустрэчу з японскімі знішчальнікамі ў глыбокім тыле ніхто з нас не разлічваў, а свае павінны былі сустрэць на падлёце да новага месца. І раптам ад нашага пілота чую: "Стралок, справа па курсе шэсць невядомых знішчальнікаў, будзь уважлівым". Я спярша падумаў, што свае, але бачу, як папарна яны развярнуліся і сталі набліжацца. І я ўбачыў на іх бартах і крылах чырвоныя кругі — апазнавальныя знакі самалётаў Японіі! Даю доўгую чаргу са свайго буйнакалібернага па адным самалёце, ён адвярнуўся, але ў атаку пайшоў другі. Тут і наш другі, пад бортам, стралок павёў агонь, яго адкрылі іншыя Ту-2. Шасцёрка адваліла. З гармат і кулямётаў японцы ўсё ж пашкодзілі некалькі нашых машын, у чым мы пераканаліся, калі даляцелі да аэрадрома. Але тады, у паветры, у мяне мільганула думка: як японскія знішчальнікі здолелі так глыбока, кіламетраў на 600, заляцець у наш тыл і вярнуцца назад? Тайна адкрылася па прыбыцці на новае месца. Нам патлумачылі, што абстралялі нас знішчальнікі "Зеро", з імі ў небе трэба быць вельмі асцярожнымі.

Упершыню гэтыя аднаматорныя самалёты праявілі свае неспадзяваныя лётныя вартасці 7 снежня 1941 года, калі, стартаваўшы з палубаў японскіх авіяносцаў і праляцеўшы над Ціхім акіянам 650 кіламетраў, атакавалі амерыканскую ваенна-марскую базу "Перл Харбар" на Гавайскіх астравах. За некалькі хвілін бомбамі і тарпедамі яны знішчылі ў гавані 8 лінкораў, 6 крэйсераў, 1 эсмінец, на аэрадромах — 272 самалёты. Было забіта і паранена 3400 маракоў. База на доўгі час выйшла са строю, а амерыканскі флот на Ціхім акіяне страціў тры чвэрці сваіх караблёў. Японцы пры тым налёце страцілі ўсяго 12 самалётаў са 146 наляцеўшых.

Амерыканцаў вельмі здзівіла тое, што налёт зрабілі невядомыя дагэтуль знішчальнікі, якія здолелі пасля атакі вярнуцца на свае авіяносцы, пакрыўшы ўвогуле 1400 кіламетраў без дазапраўкі! Тады ні адзін самалёт-знішчальнік у свеце — ні нямецкі, ні савецкі, ні амерыканскі — не здольны быў на такое, усе яны мелі дальнасць у межах 650—700 кіламетраў. Ад палоннага японскага пілота, які апусціўся на парашуце пасля той атакі, амерыканцы даведаліся, што самалёты ворага называюцца па-іхняму "нуль", па-англійску гэта гучыць як "зеро".

Японцы, рыхтуючыся да вайны з ЗША, былі перакананы, што такія "Зеро", што мелі дальнасць палёту 1900 км (а з падвеснымі бакамі — 3000 км), з дзвюма 20-міліметровымі гарматамі і двума буйнакаліберными кулямётамі, а хуткасць 560 км у гадзіну, забяспечаць ім поўнае панаванне ў паветры з авіяцыі ЗША. І сапраўды, амерыканскія пілоты былі проста ў шоку — "Зеро" на працягу палутара гадоў у паветраных баях выходзілі пераможцамі з амерыканскімі знішчальнікамі Р-40, якія былі на тону цяжэйшымі за японскія самалёты, вага якіх складала ўсяго 2700 кг, таму яны былі надзвычай манеўровымі, здольнымі на самыя крутыя віражы, з'явілася ў пілотаў ЗША нават "зеробоязнь". Толькі ў 1943 годзе, калі ЗША далі арміі новы знішчальнік "Мустанг", з хуткасцю 700 км у гадзіну і моцным узбраеннем, быў пакладзены канец перавагам "Зеро". У сутычках з савецкімі знішчальнікамі Як-3 і Ла-5 ён таксама саступаў у хуткасці і ўхіляўся ад бою — гэта быў ужо жнівень 1945 года. Канец вайне.

Мой сусед па палаце ўспомніў таксама, што з трафейнымі "Зеро" на адным з аэрадромаў ён і пілоты азнаёміліся падрабязна. Японцы ўжо не хавалі сваіх сакрэтаў. Мы даведаліся, што гэты самалёт узляцеў у неба яшчэ на пачатку 1940 года, але японцы трымалі яго ў сакрэце, нікому не прадавалі і не паказвалі. Нас здзівілі прасторная кабіна пілота пад куленепрабівальным каўпаком з кругавым аглядам, запас снарадаў на кожную гармату — 125 штук, малагабарытная радыёстанцыя, магутны рухавік. І тое, што бензабакі ў "Зеро" былі размешчаны нават у крылах з надзейнай аховай ад пападання куль.

Не выключана, што з тых дасканалых у тэхнічным плане "Зеро" савецкія авіяканструктары нешта перанялі пры распрацоўцы сваіх самалётаў.

Міхась ТЫЧЫНА.

г.Слуцк.

ГАЗЕТА — ЧЫТАЧЫ

Падарыце «Народную волю» тым, хто яе чакае

Ёсць нямала людзей, якія з задавальненнем хацелі б чытаць "Народную волю", але з-за фінансавых цяжкасцяў не маюць магчымасці зрабіць **перадаплату** альбо не ведаюць, як яе аформіць. Сярод такіх людзей — вашы знаёмыя, сябры, суседзі, саслужыўцы. Дапамажыце ім! Менавіта з гэтай нагоды мы сёння і друкуем узоры абаненцкай карткі і плацежнага квітка.

Хочаце ў якасці падарунка зрабіць **перадаплату** не за месяц, а за два, тры — калі ласка! Другі квартал — праз 10 дзён, не спазніцеся!

У чарговы раз нагадваем: для таго, каб зрабіць **перадаплату**, Вам трэба завітаць у любы філіял "Беларусбанка" альбо ў любое паштовае аддзяленне і запоўніць бланк, узор якога мы друкуем і на гэты раз. Мінчане могуць аператыўна зрабіць **перадаплату** таксама праз рэдакцыйны офіс (вул.Энгельса, 34а) альбо пазваніць па тэлефонах: **328-63-93** ці **328-68-71**. Пасля званка да Вас прыйдуць нашы валанцёры са свежымі нумарамі газеты і дапамогуць аформіць перадаплату за любы тэрмін.

Нягледзячы на экстрэмальныя ўмовы выдання газеты, тарыфы па перадаплаце ранейшыя: на месяц — **9500** рублёў для індывідуальных чытачоў і **15.000** рублёў для арганізацый, прадпрыемстваў, устаноў, фірм. Заўважым: паколькі кошт газеты пры рэалізацыі ў розніцу з новага года павысіўся, то выгадна зрабіць перадаплату за ўсё паўгоддзе альбо за пэўны перыяд: месяц, два, тры...

Банкаўскія рэквізіты "Народнай волі" такія:

УП "Народная воля": р/р 3012006535014, ААТ "Пріорбанк", ЦБП 113, код 749, УНН 100961759.

Вымушаны і на гэты раз звярнуць увагу на тое, што перасылаць у рэдакцыю трэба не толькі копію плацежнага дакумента, але і запоўненую АБАНЕНЦКУЮ КАРТКУ, узор якой друкуем і ў сённяшнім нумары.

Зноў жа: запаўняйце выразна, пажадана друкаванымі літарамі. Разумеем: для тых, хто рабіць гэта будзе ўпершыню, не вельмі прыемная рэч. Але што зробіш: каб своечасова атрымліваць газету, мы вымушаны звяртацца з такой просьбай.

Вы — з «Народнай воляй», «Народная воля» — з Вамі!

0402280179
ИЗВЕЩЕНИЕ

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка
Счет получателя 3012006535014 Лицевой счет код 749
УНН* 100961759
(фамилия, имя, отчество, адрес)

Вид платежа			Дата	Сумма
Предоплата за январь, февраль, март, апрель, май, июнь 2008 г. (ненужное зачеркнуть)				
Плательщик			Пеня	
			Всего	

Кассир

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка
Счет получателя 3012006535014 Лицевой счет код 749
УНН* 100961759
(фамилия, имя, отчество, адрес)

Вид платежа			Дата	Сумма
Предоплата за январь, февраль, март, апрель, май, июнь 2008 г. (ненужное зачеркнуть)				
Плательщик			Пеня	
			Всего	

КВИТАНЦИЯ
Кассир М.П.

* Заполняется только при осуществлении операций по уплате налогов.

Абонентская карточка

на номера газеты «Народная воля»
за январь, февраль, март, апрель, май, июнь 2008 г.
(ненужное зачеркнуть)

Заполняется обязательно ***печатными буквами*** *и* ***обязательно*** *отправляется в редакцию с* ***копией платежного документа***

фамилия
имя **отч.**
индекс почтового отделения
область
район
название населенного пункта
город, городской поселок, поселок, деревня (нужное — подчеркнуть)
улица
пр-т
переулок *(нужное— подчеркнуть)*
дом *а,б,в,г* **корп.** **кв.**

(Примечание: в случае получения газеты через абонентский ящик обязательно укажите индекс и адрес почтового отделения)

СЛЫШАЛИ?

Рак груди будут выявлять в кабинете стоматолога

Американские ученые разработали тест, позволяющий диагностировать рак и доброкачественные опухоли груди по анализу слюны. По мнению исследователей, наилучшим местом проведения теста станет кабинет стоматолога, сообщают информагентства.

Новый метод был успешно испытан на 30 пациентах. Он основан на определении в слюне 49 белков-маркеров и является неинвазивным и быстрым способом диагностики. Исследователи пытаются выявить в слюне маркеры и других онкологических заболеваний, что позволит расширить показания к применению теста.

Сейчас для диагностики рака груди применяются маммография, ультразвуковое исследование и биопсия тканей. Методика выявления рака груди по анализу слюны, предложенная учеными из Техасского университета, может быть использована для проведения скрининга.

Адрас рэдакцыі:
220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: тэл./факс (017) 3286871.
Тэл./факс рэкламнага аддзела: 3286904, 3286906
E-mail : nv@promedia.by
http://www.nv-online.info

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф СЯРЭДЗІЧ

У сувязі з адсутнасцю магчымасці рэдакцыя матэрыялы не рэцэнзуе і не вяртае, права ўступлення ў перапіску пакідае за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №246 ад 10 кастрычніка 1996 г. (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.). Надрукавана ў ТАА "Типография Михайлова - С", 214020, г.Смаленск, вул. Шаўчэнкі, 86. Па заказе ТАА "Типография Михайлова", 214000, г.Смаленск, вул. Кастрычніцкай рэвалюцыі, д.38, кв.54. Падпісаны ў друк 18.03.2008 у 16.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж: 10 026 экз. Заказ №